
ДЗЕНЬ
ЗА ДНЁМ

# ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

Прыкметы надвор'я,
а таксама народны
каляндар-месяцаслоў



МІНСК
«ЮНАЦТВА»
2000

УДК 882.6-8+398.9(-826)
ББК 84Бел7
Д 43

Мастак В. Александровіч

Сабраў і апрацаваў А. Русецкі

Это книга народной мудрости. В ней помещены поговорки о каждой поре года, приметы погоды, а также народный календарь-месяцеслов, идет речь о каждом дне года: какой народный праздник приходится на этот день и какие обряды надо исполнять, что предсказывает погода в этот день и т. д.

16 — 2000
ISBN 985-05-0323-8

© Русецкі А., укладанне, апрацоўка. 2000
© Александровіч В., афармленне. 2000

# 1. У НАРОДЗЕ КАЖУЦЬ



**«Імкніся назіраць
народныя прыкметы...»**

**А. С. Пушкін**

# ПРА ЗІМУ

— Ой, чаго, зімачка,
Ой, чаго, лютая,
Раненька настала?
— Ой, я не раненька,
А ўжо позненька,
Зімачка, настала.
Ужо лісточак апаў
Ды й зямліцу ўваслаў —
То мая пара прыйшла.
А рэчачкі сталі
Ды й пазамярзалі —
То пара й другая.

*З народнай творчасці*

Ад першага снегу да саннага шляху шэсць тыдняў пройдзе.

Беражы нос у вялікі мароз.

Гром зімою — да моцнага ветру.

За колькі дзён да Каляд выпадзе іней, за столькі дзён да Іванава дня (21 мая) надвор'е будзе спрыяльным для веснавой сяўбы.

Зіма без снегу — не быць хлебу.

Зіма — бяда, але і без зімы нельга.

Зіма цёплая — сіроцкая.

Зіма ўцякае цёмнымі начамі.

Зіма без трох падзімкаў не жыве.

Зіма — свякруха, лета — матачка.

Зіма з вялікім ротам, усё паесць.

Зіма на лета робіць, а лета на зіму.

Зіма лета будзіць.

Зіма на зыход, вясна на парог.

Зіма, як казна, сваё возьме.

Зіма сняжком усё прыкрыла, абрусам белым увесь свет адзела.

Зіма снежная — лета дажджлівае.

Зімой ідзе справа не к яйцу, а к каўбасе.

Зімовая дарога — дапамога.

Зімой мяцеліцы — летам непагадзь.

Зімовы дзянёк, што камарыны насок.

Зімою сонца свеціць, ды не грэе.

Каб не было снегу, то і не было б следу.

Калі зімой лес моцна шуміць, значыць, адліга будзе.

Калі зімой мяцеліцы кружацца, лета будзе непагодлівае.

Калі зімой цёпла, летам холадна будзе.

Калі не будзе зімою бела, то не будзе ўлетку зелена.

Калі першы восеньскі снег з буранам, значыць, зімы яшчэ не будзе.

Калі пеўні пяюць з вечара, будзе цёплае надвор'е.

Калі ўначы быў іней — днём снег не выпадзе.

Калі ў навагоднія дні іней — значыць, у наступным годзе будзе многа грыбоў.

Каму лядок, а кавалю мядок.

Колькі дзён праляжыць восеньскі снег, столькі разоў зімою снег сыдзе і зноў выпадзе.

Кот на печку — сцюжа на двор.

Мала снегу — мала хлеба.

Маланка зімою — да пургі.

Мароз вялікі стаяць не дазваляе.

Мароз, не хапай за нос.

Мароз сем баб павёз.

На дварэ лёд, а для кавалёў — мёд.

На адным палазку зіма едзе.

На дварэ мароз, а пад носам адліга.

На дварэ мароз, а ў кішэні грошыкі таюць.

Няма маразоў, дык гэта яшчэ не значыць, што іх і зусім не будзе.

Не той снег, што мяце, а той, што зверху ідзе.

Неба белазорнае — зіма заплача позна.

Па зіме кладзецца лета.



Пакуль ваўкі не з'явяцца, зімы не будзе.

Першы снег выпадае ноччу.

Пеўні пяюць марозным днём — будзе адліга.

Прыходзяць паласавацца ў сад зайцы — зіма працяглай будзе.

Сняжок падпаў і слядок запаў.

Снегу навее — хлеба прыбудзе, вясна разальецца — сена набярэцца.

Снег белы, ды не ўкусіш.

Снег на зямлі, як гной для ўраджаю.

Сонца зімой марозіць, а летам грэе.

У мароз заснуць лёгка, а прачнуцца цяжка.

У холад кожны молад.

Усё зімою згодзіцца, што ўлетку ўродзіцца.

Якая зіма, такое і лета.

Як падзьме зімой паўночны вецер, а воблакаў няма — мароз будзе.

Як мароз ды холад, дык і стары молад.

Як зіма без марозу, так вясна без шкоды не абойдзецца.

Як ні мыйся, бялей за снег не будзеш.

Ясныя дні перад Калядамі на добры ўраджай.

# ПРА СНЕЖАНЬ

Год завяршае,
Зіму пачынае —
Снежань.
Снегу многа,
Звініць, як лядзяш,
Дарога.

*А. Русецкі*

Звону ў снежні многа — весялейшая дарога.

Калі снежань сухі, то і лета з вясной сухімі будуць; калі цёплы і сыры — будзе працяглая зіма і позняя халодная вясна.

Калі снежань радуе вялікімі гурбамі, летам будзе добры ўраджай травы.

Калі ў снежні снег мяккі і цяжкі — лета будзе мокрым, а калі сухі, як порах, то і лета сухім будзе.

Калі ў снежні снег шчыльна кладзецца да плоту, чакай дрэннага лета, а калі не — чакай добрага ўраджаю.

Мароз трашчыць — моцны холад кліча.

На Новы год ясна, будзе ў гумне цесна.

На Новы год прыбудзе дня на заечы скок.

На печы і ў снежні лета чырвонае.

Пройдзе снежань з пахмурным небам — чакай ураджаю, а з ясным — галоднага году.

Раз у дзесяць гадоў снежань цёплы бывае, нават снег зганяе.

Снегавіца-зіма не носіць цяпла.

Снежань — час замярзання рэк.

Снежань сцюдзёны — на ўсю зіму зямлю замаросіць.

Снежань халодны і снежны абяцае багатае жніво.

Снежань вока снегам радуе, але марозам вушы рве.

Снежань — цёмная пара года.

Сухі, марозны снежань абяцае сухую зіму і лета.

Туманны круг вакол снежаньскага месяца — да марозу.

У снежні вялікі іней, гурбы снегу і глыбока прамерзлая зямля — да ўраджаю.

У снежні начны вецер — замарознік, рэкастаў.

У снежні на халоднай печы не сагрэешся.

Які першы дзень снежня здарыцца, такой і зімазіміца будзе.

Ага-ага, люлькі,
Пайшоў кот у дулькі.
Памарозіў лапкі,
Узлез на палаткі.
Сталі лапкі грэцца,
Недзе кату дзецца.
Узлез бы на палаткі,
Дык баіцца бабкі.
Палез бы ён вышай,
Ды баіцца мышай.
Там мышы дурэлі,
Кату хвост аб'елі.

*З дзіцячага фальклору*

## ПРА СТУДЗЕНЬ

Беражы нос у студзеньскі мароз.

Дрэвы ў інеі — неба будзе сіняе.

Калі ў ноч на калядную куццю (6 студзеня) многа зорак на небе, добры ўраджай чарніц будзе, а калі зоркі рэдкія, то і ягады будуць рэдка.

Калі на куццю сцяжынкі чорныя, ураджай на грэчку будзе.



Калі ваўкі выюць каля жылля, мароз будзе.

Калі на Каляды (7 студзеня) дзень цёплы — летам пчолы будуць добра раіцца.

Калі на Каляды пагодна, чакай ураджайнага года.

Калі ў студзені з неба чуецца шум, чакай мяцеліцы.

Калі ў студзені дажджы, то дабра не жджы.

Калядкі — добрыя святкі: пад'еў куцці і на палаткі.

Калядкі — добрыя святкі, але мароз пракляты.

Калядкі — добрыя святкі: бліны ды аладкі.

На Каляды ногі сталу путаюць, каб летам скаціна не бегала.

На Каляды іней — ураджай на хлеб, неба ў зорках — ураджай на гарох будзе.

На Каляды — кілбаса, на Вялікадня — сыр, а ўсё чалавек сыт.

Студзень імглісты — мокры год, студзень халодны — позняя вясна і дажджлівае лета.

Студзень-сечань: сячэ зіму напалам.

Студзень — году пачатак, а зіме — палавіна.

Студзень — зямлю студзіць.

Студзеньскі мароз — сорак пудоў на воз.

У Вадохрышча (19 студзеня) снег — да ўраджаю хлеба. На Вадохрышча цёпла — у засеках густа і цёмна.

У моцны холад і птушка ў палёце замерзнуць можа.

У студзені і гаршчок у печы замярзае.

Што мужыку ў мароз дзеецца: бяжыць ды грэецца.

Якое надвор'е пасля Каляд, такое ж і пасля Пятра (12 ліпеня) будзе.

## ПРА ЛЮТЫ

Чым ты багаты, люты?
— Вяселлямі ў хатах,
Моцнымі маразамі,
Крывымі дарогамі.
А што нам прадкажаш?



— Будзе многа снегу — дам вады
вясною.
Будуць снегапады—ціхую вясну дам.
А што нясеш дзецям?
— Снежнае прыволле,
Лыжнае раздолле
Ды канец зімы.

*А. Русецкі*

Бакагрэй пытае люты, ці добра абуты.

Віхуры і мяцелі ў лютым наляцелі.

Грамніцы (15 лютага) — зімы палавіцы.

Грамніцы — скідай рукавіцы.

Грамніца — хлеба палавіца.

Калі на Яўхіма (2 лютага) у поўдзень сонечна — будзе ранняя вясна; калі завіруха — на ўсю Масленіцу снег.

Калі ў лютым вячаровыя зоркі хутка перагараюць, будзе адліга.

Калі ў лютым неба чыстае, у засеках будзе чыста, пуста.

Калі ў першы дзень лютага здараецца добрае надвор'е, то і вясна ранняй будзе (асабліва, калі 2 лютага сонца да поўдня затрымаецца).

Калі ў лютым снегіры склююць на кустах усе ягады, можна чакаць ранняю вясну.

Калі на Стрэчанне (15 лютага) певень пад страхою нап'ецца, то на Юр'я (6 мая) вол травы наесца.

Калі люты сагрэе бакі мядзведзю, вясна халодная будзе.

Калі ў першыя дні лютага неба белаватае, хаця туману і няма, а вячэрняе сонца чырвонае ці барвовае, трэба чакаць няўстойлівага надвор'я, без моцных маразоў, але са снегападамі.

Калі ў лютым месяц ясны, ураджай будзе не багаты.

Люты не дае моцна спаць: трэба плугі ладзіць ды калёсы папраўляць.

Люты жывата не пучыць, затое хадзіць лёгка вучыць.



Люты — злосныя мяцеліцы, крывыя дарогі.

Люты ваду падпусціць, сакавік замарозіць.

Люты багаты снегам, красавік вадою.

Люты — час звярыных вяселляў.

Люты — ілгун: адзін бок грэе, другі — студзіць.

Люты вясну рыхтуе.

Люты раніцай гандлюе, а вечарам гаруе.

Люты — няўстойлівы: то студзенем пацягне, то сакавіком.

Люты — веснавых паводкаў бацька.

Люты наробіць плюты.

Люты месяц-бакагрэй, бок карове абагрэў, і карове, і быку, і сівому старому Марозу Марозавічу.

Люты халодны і сухі — жнівень гарачы.

Лютаўская адліга нічога не каштуе.

Моцныя лютаўскія маразы — да гарачага лета.

На Грамніцы (15 лютага) можна пеўню напіцца.

Пытаецца люты, ці добра абуты.

Раніца ў лютым хутка займаецца — быць холаду.

Светлыя слупы каля сонца ў лютым — да марозу.

Снег у лютым, значыць, у верасні пірог на стале.

Сонейка ў лютым у рукавіцах — да марозу.

У лютым моцны мароз — кароткая зіма.

У лютым капеж — у раннюю вясну вер.

У лютым моцныя маразы часцей за ўсё па начах бываюць.

У лютым моцныя маразы — зіма хутка закончыцца.

У лютым снегапад — да ціхай вясны.

Як на Грамніцы (15 лютага) адліга — з ураджаю будзе фіга.

Як у лютым клікнецца, так восенню адклікнецца.

Які першы дзень лютага, такое і лета будзе.

## ПРА ВЯСНУ

Перад вясною ўсе святыя
Шыкуюцца, рыхтуюцца:
Катораму святу наперад пайсці.
Святыя Саракі наперад пайшлі,
Святы Аляксей сохі чэшаць,
Святы Благавешчанне заворваець,
Святы Вербіч вярбу пасвянцаець,
Чысты чацвер ячмень засяваець,
Святое Вялічка з чырвоным яечкам.
Першы дзень пірагі маюць,
А сярэдні дзень пагуляюць,
У апошні дзень выпраўляюць.
Радаўніца статак запасваець,
Святы Юрай, божы пасол,
Да бога пайшоў
Ды ўзяў ключы залатыя,
Адамкнуў зямлю сырусенькую,
Пусціў расу цяплюсенькую
На белы свет і на ўвесь свет.

*З валачобнай песні*

Абнадзейліва вясна, ды падманліва.

Адна ластаўка вясны не робіць.

Ад ранняй вясны радасці мала, але затое вады многа.

Багата вясна кветкамі, а восень палеткамі.

Бусел прыляцеў — вясна будзе.

Бычкі бушуюць — вясну чуюць.

Боб лепш за ўсё садзіць, калі ўдод пяе.

Вада з гор — рыба з нор.

Вясна красна, хоць і пуста ў засеках.

Вясна вочы крадзе.

Вясна багата кветкамі, а восень пірагамі.

Вясна — маці, а лета — бацька.

Вясна красна, хоць і галодная.

Вясна не мясная, але і восень не малочная.

Вясна красна квятамі, а восень пладамі.

Вясной лісток, а восенню сучок.

Вясной зверху прыпякае, а знізу марозам падціскае.

Вясной дождж парыць, восенню — мочыць.

Вясной гадзіну упусціш, годам не дагоніш.

Вясною і ўдод запяе.

Вясна і восень — на дні надвор'яў восем.

Вясна адным днём красна.

Вясна адмывае рэкі і воды.

Вясновы дзень год корміць.

Вясновы дзень праляжыш — зімой цэлы дзень па пазычках бегаць будзеш.

Вясной бывае тры пахаладанні — «на вярбу», «на жабку», «на зязюльку».

Вясной парыць, парыць, а потым дождж ударыць.

Вясной днём раней засееш, летам на тыдзень раней жніво пачнеш.

Вясну хваляць за дажджы і сонца, а лета за стагі і вазы.

Грак — на праталіну, шпак — на прагаліну.

Грак — на гары і вясна — на двары.

Гром грыміць — вясна сапраўдная.

Добра вясной ловіцца рыба — чакай голаду.

Дзе гультай арэ ды скародзіць, там пустазелле добра родзіць.

Добрая вясна будзе, калі пчолы рана з вулляў вылятаюць.

Добра там дзее, дзе два аруць, а трэці сее.

Дождж вымачыць, сонца высушыць, буйныя кучары вецер расчэша.

Дождж і сонца вясной ткуць дыван квяцісты.

Жаба квакае — сяўбу пара весці.

Жаўрук запеў — пара ў поле выходзіць.

Журавель прыляцеў — цяпло прынёс.

Зязюля закукавала на голым дрэве — чакай замаразкаў.

Зязюля выклікне «ку-ку», тады сей на ўсю руку.

Зямля азімыя корміць, неба дажджом поіць, сонца цяплом грэе, а лета, ведай, ураджай росціць.

Ідзе дождж вясной — ураджай нясе ў засекі.

Каб не было пуста, трэба сеяць густа.

Калі вясной снег шурпаты, чакай ураджаю.

Калі вясной многа павуціны лётае — лета будзе гарачае.

Калі ранняй вясной блісне маланка, а грому няма, лета сухім будзе.

Калі добра ўзарэш, то і ўраджай багаты збярэш.

Калі многа ледзяшоў звісае са страхі, то багаты ўраджай агуркоў будзе.

Калі няма вясною камароў, летам дрэнны ўкос будзе.

Калі вясной многа хрушчоў, можа засуха быць.

Колькі вясной не непагодзіцца, усё роўна яснае надвор'е наступіць.

Калі вясной на стрэхах дамоў доўгія ледзяшы — да працяглай вясны.

Калі асіна задрыжыць лістом, тады і жывёла ў полі наесца.

Калі ўвесну першы матыль карычневы, то ў гэтым годзе будзе многа мёду, а калі белы — то многа малака.

Не лічы кветачкі вясною, а лічы ягадкі восенню.

Паўднёвы вецер вее — старога грэе.

Пасееш за пагоду — больш прыплоду.

Першы вясенні дождж карэньчыкі абмые.

Першы гром вясной, значыць, цяпло не за гарамі.

Прыйшла вясна — ужо часу няма; прыйшло лета — бярыся то за тое, то за гэта; надышла восень — яшчэ работ восем.

Прыйшла вясна — і часу няма.

Позняя вясна не абманіць.

Пяе салавей у голым лесе — неўраджайны год будзе.

Ранняя вясна — шмат вады.

Расцвіў першацвет — на парозе цёплыя пагодныя дзянькі.

Ранняя пара родзіць пшанічку, а позняя — мятлічку.

Рыхтуйся да восені вясною ранняй.

Страчанага дня вясною не купіш.

Сустрэў грака — вясну сустракай.

Сей авёс у гразь — будзеш князь. Сей ячмень, як загудзе сляпень. Сей у добрую пару — збярэш хлеба гару.

Хто вясною скача, той восенню плача.

Хто сее ды вее, той не збяднее.

Хто кармамі запасся — у таго вясна заўсёды позняя, а хто без іх сядзіць — вясну ранняй называе.

Хоць вясна сухая, але восень малочная.

Чакай бяды ад вясенняй вялікай вады.

Чырвоная вясна, ды галодная.

Што пасееш, тое вырасце.

Як не пасееш, то й збіраць не будзе чаго.

## ПРА САКАВІК

Веець, веець
Вясенні вецярок,—
Прыйдзі, мой міленькі,
Дам табе піражок
З мёдам сычаным,
З ласкаю дзявічаю.

*З народнай творчасці*

Аляксей (30 сакавіка) прыйшоў, лядок пакалоў.

Доўгія ледзяшы ў сакавіку — да працяглай вясны, але позняй восені.

Дождж на Еўдакію (14 сакавіка) прадказвае дажджлівае лета.

Жаўрук у сакавіку вясну блаславляе.

Жыта ў сакавіку глядзіць у неба — не з'ясі зімой хлеба.

Затрымаўся снег на стрэхах да Саракоў (22 сакавіка), значыць, вясна позніцца.

Калі ў сакавіку зямля ўбачыць неба, то восенню не будзе хлеба.

На асіне пупышкі вялікія набухлі — да ўраджаю ячменю.

На Казіміра (4 сакавіка) зіма паміpае.

На ранняй ралліцы родзіць жыта ды пшаніца.

Няма ў сакавіку вады, не будзе ў красавіку травы.

Ні ў сакавіку вады, ні ў красавіку травы.

На Саракі (22 сакавіка) пайшла зіма да ракі.

На Саракі ў адзін дзень сорак маразоў.

Прыйдзе сакавік-капельнік — і зіма заплача.

Першы гром пры некранутым яшчэ снезе — лета халодным будзе.

Першы гром, а рыба яшчэ пад лёдам — летам яна добра лавіцца будзе.

Першы гром у посны дзень — рыбы многа будзе.

Рана ў сакавіку затае — доўга не растае.

Сакавік цяплом усіх прывячае.

Сакавік-ветранос, вадацёк, гракоўнік.

Сакавік мокры — хлеб горкі.

Сакавік часам сняжок сее, а часам — сонцам грэе.

Сакавік дрэвам сок пускае.

Сакавіцкі снег — з'ява добразычлівая.

Сухі сакавік, цёплы красавік, мокры май — будзе добры ўраджай.

У сакавіку і спераду, і ззаду — зіма.

У сакавіку зіма не гніе, у красавіку трава не расце.

У сакавіку туманы — на жніве дождж п'яны.

У сакавіку зіма лета палохае, але і сама канае.

У сакавіку сініца песні пецъ пачынае.

Хто сее гарох у марцы (сакавіку), той гатуе ў чарцы, а хто у маі, той у яі.

Ці на падыходзе, ці на адыходзе сакавік усё замарозіць.

Якая другая палавіна сакавіка — такая першая палавіна красавіка.

Як ідзе дождж у сакаўцы, то хлеба будзе ў рукаўцы, а як ідзе дождж у маі, то хлеба будзе і на гультая.

## ПРА КРАСАВІК

У красавіку-красавеньку
Ляціць жаўрук на праталінку,
А шпак на прагалінку,
Сярэдзіннік вясны,
Красавік ваду збірае,

З рэчак лёд здымае
Ды заместа саней
За атосы
Выводзіць калёсы.
У красавіку красным
Гром цяпло нясе,
У красавіку ясным
Суха на страсе.
У красавіку мокра —
Будзе добрай паша,
І ячмень, і жыта,
І авёс для кашы.

*А. Русецкі*

Гром без маланкі ранняй вясной — да халоднага лета.

Да першага грому жаба не квакае.

Да першага грому зямля не ачышчаецца.

Днём горача, а ноччу прахалодна — да добрага надвор'я.

Жаўрук прылятае на праталіну, шпак на прагаліну, жораў з цяплом, ластаўка з лістом.

Жураўлі прыляцелі і полудзень забралі з сабою.

З бярозы цячэ многа соку — лета дажджлівым будзе.

Запыліла ў красавіку вольха — канец снягам.

Калі ласі выходзяць вясной на рунь — добры ўраджай будзе.

Калі красавік красны — будзе жыта ўдачнае.

Калі зязюля закукуе на голае дрэва, будзе голад.

Калі ўдасца апрыль (красавік), будзе жыту прыбыль.

Красавік чорны ў полі, але белы ў лесе.

Красавік: сёння мяцеліца, а заўтра капеліца.

Красавік з маем — да ўсяго года ключ.

Красавік-бацюхна ў поле кліча.

Красавік зіму з летам сплятае.

Красавік-першацвет, месяц шумлівай вады, захавальнік веснавога шуму.

Красавік ваду падбірае, кветкі распускае.

Красавік сушыць — нічога з зямлі не рушыць.

Красавік з вадою — май з травою.

Красавік — месяц вялікай вады, ледалому на рацэ.

Красавік халодны і ветраны — можа ўсё прапасці на палях.

Красавік мокры павагай у людзей карыстаецца.

Красавіцкі снег як лёг, так і збёг.

Красавіцкія дажджы ураджай прыносяць.

Красавіцкі шпак — вясны пасланец.

Красавіцкае цяпло ненадзейлівае.

Красавіцкія ручаі зямлю ад зімовага снегу будзяць.

Мокры красавік — добрая паша будзе.

На Благавешчанне (7 красавіка) і птушка гняздо не ўе.

Ні ў сакавіку вады, ні ў красавіку травы.

Не ламай печ, пакуль красавік на двары.

Ні бойся зімы — бойся адзімкаў у красавіку.

Пакуль на асіне ліст не затрасецца, датуль вол не напасецца.

Першы гром вясной — прыкмета блізкага цяпла.

Першы гром пасля полудня — лета з навальніцамі будзе.

Першы красавіцкі дождж воза золата варты.

Прыйшоў красавік — сагнаў са стрэх вадзяныя кроплі.

Птушкі ў красавіку гнёзды ўюць на паўднёвым баку дрэва — да халоднага лета, на паўночным — да цёплага.

Сінія воблакі ў красавіку — да цяпла і дажджу.

Тры дажджы ў красавіку ды адзін у маі — тысячы дажджоў варты.

У красавіку гром — шкода будзе і жыту, і ячменю.

У красавіку вада на лузе — будзе сена ў стозе.

У красавіку ясныя ночы заканчваюцца замаразкамі.

Хто ў час сее, той не збяднее.

Чым мацней першы ўдар грому — тым лепшы будзе ўраджай.

Якім зернем хто сее, той такі і ўраджай збірае.

Якое Благавешчанне (7 красавіка), такі і Вялікдзень будзе.

## ПРА МАЙ

Юрай, уставай рана,
Адмыкай зямлю,
Выпушчай расу
На цёплае лета,
На буйнае жыта,
На ядраністае,
На каласістае,
Людзям на здароўе.

*З фальклору*

А ў маі, маі
Сонца зямлю грэе.
А ў маі, маі
Цёплы ветрык вее.
Калі ў маі дождждык,
Хлебным будзе год.
А калі засушша,
Падцягне жывот.
Калі ў садзе бела,
Сеяць можна смела.
А цвіце чаромха —
Халадок ідзе.
А ў маі, маі
Многа добрых свят:
Юр'я ды Мікола,
Пахом-бакагрэй,
Сідар-агурэчнік
Ды мокры Макей.
А ў маі песню
Салавей пяе.
Лецейка чырвонае
У госці заве.

*А. Русецкі*

Ай, ай, месяц май, не халодны, дык галодны.

Барыс і Глеб (15 мая) сеюць хлеб.

Бацька з сынам — май з чэрвенем — ходзяць пад вокнамі Хрыста-радзі пабіраюцца.

Будзе дождж у маі — будзе ўраджай на двары.

Будзе дождж ісці — будзе хлеб расці.

Бывае май, што коням сена дай, а сам на печ палязай.

Дождж у пару — усё роўна, што золата.

Дождж у маі — будзе хлеба і ў гультая.

Дуб лісточкі выкінуў — зямля на ўраджай працуе.

Жаўрук зазвінеў — бяры плуг у рукі.

Калі на лёд грыміць, то будзе вясна зімная.

Калі чаромха цвіце, паўсюдна холад жыве.

Калі май халодны, дык год хлебаробны.

Калі май, гані валоў у гай, а сам на печ уцякай.

Май зямлю грэе, але і сіверкам вее.

Май творыць ніву, а чэрвень — сена.

Май на парог вясну прыцягнуў.

Май халодны — не будзеш галодны.

Май дажджлівы — год урадлівы.

Май — і пад кустом рай.

Май — святыдзень, птушыны перасвіст.

Майскі дождж — хлеба на год.

Майская травіца — нібы маладая дзявіца.

Майская трава галоднага корміць.

Мокра ў маі — будуць пышныя караваі.

Мокры май — будзе жыта, нібы гай.

На лёд загрымела, будзе холад.

Наступіў май — і пад кустом рай.

Настаў май ды й прыкмячай.

Не сей пшаніцу раней дубовага ліста, таму што ў маі браты-халады жывуць.

Па маі яшчэ на печы сядзі.

Пачалося кваканне жаб — трэба выходзіць у поле.

Палі май, то будзе жыта, як гай.

Прыйшоў Мікола (22 мая) — высыпаў мошак з пола.

Сей смела, калі ў садзе бела.
У маі дождж — будзе сена і рож (жыта).
У маі мароз — не будзе раёў.
Што май, што чэрвень — абодва паўгалодныя.
Як на Юр'я (26 мая) пагода, то на грэчку няўрода.
Як дождж на Юр'я, будзе хлеб і ў дурня.
Як у маі суха, то падцягвай бруха.

## ПРА ЛЕТА

А лецейка-лета, добрая пара,
Выгнала скаціну ў поле са двара.
А лецейка-лета, кветак карагод —
Будуць вам і пчолы, будзе вам і мёд.
А хто летам-лецейкам у цяньку стаіць,
Той зімою доўгаю будзе слёзы ліць.

*А. Русецкі*

Адкуль летам навальніца — адтуль і добрая пагода.

Барвовыя зоры — да ветру.

Без расы і трава не расце.

Без расы ноччу суха, але туманна ў нізіне — дзень прынясе непагадзь у карзіне.

Бачна ўся вясёлка — значыць, дождж будзе.

Будзе дождж — будуць і грыбы.

Вольха зацвіце — сей грэчку.

Вясну хваляць за дажджы, а лета — за снапы.

Вясёлка пасля дажджу — да добрага надвор'я.

Вясёлка к вечару — да добрага надвор'я.

Гаршкі ў печы лёгка перакіпаюць праз край — да непагоды.

Гром пакуль не загрыміць — мужык не перахрысціцца.

Дзе летам кветак карагод, там і пчолы, там і мёд.

Дождж дурны: не ідзе туды, дзе просяць, а дзе сена косяць.

Дождж не дубіна і я не гліна.

Дождж намачыў, а сонейка высушыць.



Двойчы ў год лету не бываць.

Дрэннае лета, калі сонца няма.

Жнуць парою — жуюць зімою.

Жыта красуе — быдла гізуе.

З вялікай хмары малы дождж бывае.

Зоркі высыпалі ў ноч на Купалу — многа грыбоў будзе.

Зерне ў каласку — не валяйся ў халадку.

І навальніца не для кожнага страшная.

Калі грыбна, дык і хлебна.

Калі малако ў падойніку пеніцца, значыць, дождж будзе.

Калі летам часта з'яўляюцца зарніцы, чакай ураджлівага году.

Калі гром летняй парой грыміць бясконца — град будзе.

Калі ўдалечыні смуга бачна — ясна будзе.

Калі пры ясным надвор'і далекаватыя прадметы не ясныя, як бы ў тумане знаходзяцца, засуха будзе.

Калі рой выйдзе перад Янам — будзе мужык панам.

Калі сыроватка ад смятаны закісае, дождж будзе.

Калі чалавека ў поўдзень да сну хіліць, значыць, дождж будзе.

Калі камарна, то і хлебна.

Калі карова ідзе з пашы і ў роце нясе траву, то будзе дождж.

Калі год сухі, купляй пчолку, а калі мокры — кароўку.

Колас добра не спее, калі сонца не грэе.

Куды вецер, туды і дождж.

Куры цярэбяцца і ў пяску купаюцца, значыць, дождж будзе.

Кветкі мацней пахнуць перад дажджом.

Ластаўкі нізка лятаюць — дождж будзе.

Лета селяніну і маці, і бацька.

Лета на зіму працуе.

Лета з камарамі, зіма з пірагамі.

Лета-навальнічнае, зіма — з мяцеліцамі.

Лета праляжыш, зімой з торбай пабяжыш.

Лета збірае, а зіма паядае.

Лета прыгатуе, а зіма з'есць.

Летам нагой прыцягнеш, зімой губамі падбярэш.

Летам прызапасіш, зімой знойдзеш.

Летам гуляўшы, восенню не збярэш.

Летні дождж — на сена гной, а на карову лой.

Летні дзень зіму корміць.

Летні дзень за зімовы тыдзень.

Лепшае сена тое, што косіцца па расе.

Ліст на дрэве поўны, дык і сеяць поўна (хопіць).

Людзі рады лету, а пчолы квету.

Маланкі на чыстым небе — засуха будзе.

Мноства ягад — да дрэннага ўраджаю жыта.

Моцна парыць — на навальніцу.

Мужыку лета, што святому рай.

На вострую касу багаты сенакос.

На пачатак касьбы не варта касу вастрыць — авечкі ўвесь год бляяць будуць.

Не чакай лета доўгага, маліся за цёплае.

Не поле родзіць, а лета.

Начная раса не высокая — быць навальніцы.

Не бойся гроз (навальніц), бойся слёз.

Не помніць карова зімы, дачакаўшы лета.

Не спрачацца расе з сонцам.

Не дажджом — дык росамі хлеб расце.

Не сей пшаніцы, калі дзеці ідуць у суніцы.

Паспелі чарніцы — і жыта гатова да жніва.

Па лету нагою коп, а ўзімку ў рот хоп.

Пастух рад лету, а пчала — цвету.

Прасвістаў лета гарачае, прасвішчы і зіму халодную.

Прасілі дажджу — град пайшоў.

Пчолы рана вылятаюць — на дождж.

Ранішняя зара харашэй вячэрняй.

Ранішняя раса — і добрая сляза: ёю лес умываецца, з ночкай развітваецца.

Расою жыта летам прамакае.

Раса касу вострыць.

Раса ды туман раніцай жывуць.

Росная купальская раніца — восень грыбная будзе.

Сей ячмень, як загудзіць сляпень.

Сей хлеб — не спі, будзеш жаць — не станеш драмаць.

Сонца заходзіць у хмару — на дождж.

Сей смела, калі ў садзе бела.

Смірнае лета болей ураджайнае.

Суша не высушыць, а моча вымачыць.

Сухое (ціхае) лета болей ураджайнае.

То дождж, то непагода, а ўсё невыгода.

Трайная вясёлка ў час дажджу — увесь тыдзень з дажджамі будзе.

Трэба гарох сеяць пад саху.

Трэба ўлетку назбіраць, каб зімою было што жаваць.

Ураджайнае лета прадказвае халодную зіму.

Улетку кожны кусцік начаваць пусціць.

Улетку вады мерка — гразі жменька; з асенняе жменькі вады — гразі мерка.

Хто летам у цяньку стаіць, той зімой будзе слёзы ліць.

Хавай хлеб на бабовы цвет.

Хто ўлетку балюе, той узімку галадуе.

Хто ўлетку спіць, той узімку не есць.

Хто халадку шукае, той узімку галадае.

Што летам народзіцца, тое зімой прыгодзіцца.

Што ўлетку збярэш, тое ўзімку праеш.

Як не грыміць гром, а ўсё ж перастане.

Якая Тройца, такое і лета будзе.

Як яр цвіце — холадна.

Як сена косяць, дык дажджу не просяць: ён сам ідзе.

Які ні дажджышка, а людзям аддышка.

## ПРА ЧЭРВЕНЬ

Бліснулі маланкі,
Палілі дажджы.
Хутка ў лесе пойдуць
Белыя грыбы.
Можна пагуляці,
Можна адпачыць,
Але справа чэрвеня —
Ураджай расціць.

*А. Русецкі*

Касі, каса, пакуль раса; раса далоў — касец дамоў.

У чэрвені першую ягаду ў рот кладуць, а другую дамоў нясуць.

Чэрвень у гульні не гуляе, а ўраджай росціць.

Чэрвень сухі — не надзейся на белыя грыбы.

Якая чэрвеньская вячэрняя зорка, такі і другі дзень будзе.

## ПРА ЛІПЕНЬ

Ліпень грымучы
І навальнічны.
Ён і пякучы,
Ён і сунічны.
Ён і мядовы
І снапавяз.
Ён і грыбовы —
Радасць для нас.

З ім і Купалле,
І святы Ян,
І Пятрок з Паўлам,
І Даміян.

*А. Русецкі*

Вячэрняя раса ў ліпені — да яснай раніцы.
Духата пасля поўдня — прыкмета навальніцы.
Зязюля да Пятра (22 ліпеня) кукуе.
Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.
Ліпень пахучы, але даручы.
Ліпень з навальніцамі прыходзіць.
Ліпень без дажджоў і навальніц не бывае.
Ліпеньская прыволле — для пчол раздолле.
Святло ў ліпені на ўбытак — гарачыня на прыбытак.
У ліпені першыя снапы на паласе.
У ліпені ліпы ў поўнай красе.
Хто ў ліпені на полі пацее, таго ўзімку і печка пагрэе.
Ягадна ў ліпені на ўсякую красу.

## ПРА ЖНІВЕНЬ

Ой, закацілася сонейка
Ды з гары ў далінку.
Ой, зрабі нам вячэраньку.
Няхай вечар дабрэй будзе:
Нахадзіліся ножанькі,
Ой, нарабіліся ручанькі,
Сярпы не жнуць — нажаліся,
Насвяціліся вочанькі
Аж да цёмнае ночанькі.

*Жніўная песня*

Жнівень сее, жне і косіць — на сталах багацця ўдосталь.
Жнівеньскі дзень год корміць.
Жоўтыя лісты ў канцы лета — да ранняй восені.
З Ільіна дня ночы доўгія, вада халодная.
Красуе Іван ды Мар'я — поўна грыбоў.
Кожная хата ў жніўні багата.
Лета грыбное — восень кароткая.
Навальніца ў жніўні — да доўгай восені.
На Мар'ю (4 жніўня) вялікія росы — будзе лён шэры і косы.

Пайшлі апенькі — лета на зыход.

Павуціна чапляецца да расліны — да цяпла і яснай восені.

У жніўні і верабей піва варыць.

У жніўні лес спяшаецца аддаць свае дары.

У пачатку жніўня баравікі ў лесе растуць вялікія, да канца месяца — меншыя, але іх расце больш.

Што поле ўродзіць, тое жнівень пазвозіць.

## ПРА ВОСЕНЬ

Асенняе сонца, як удаўцова сэрца.

«Бабіна лета» кароткае.

«Бабіна лета» сухое — восень будзе мокрая, а калі ў першы дзень яго надвор'е яснае, восень цёплая будзе.

Восень — на дзень пагод восем.

Восень на рабым кані ездзіць.

Восень — работ восем.

Восень кажа: «Я ўраджу», вясна кажа: «А я пагляджу».

Восень-матка: кісель ды бліны, а вясною гладка і сядзі ды глядзі.

Восень спяшаецца — зіма не чакае.

Восень непагоду нясе.

Восень бывае ясней за лета.

Восенню шэранькая раніца — чакай чырвонага дзянька.

Восенню касі ды на печы сушы.

Восеньскі іней — да яснага дня.

Восеньскае неба — сінява бяздонная.

Калі рабіны многа, то восень будзе сырой, маласнежнай.

Калі гром грыміць восенню, зіма не скора настане.

Калі восенню лісце бярозы пачынае жаўцець з вершаліны, то наступная вясна будзе ранняя, а калі знізу, то позняя.

Красна восень снапамі, а зіма ўмалотам.

Націна пасохла, значыць, бульбу выбіраць пара.

Па восені і ў кошкі ляпёшкі.

У восеньскую непагоду сем пагод на двары — сее, вее, круціць, муціць, рве, зверху лье, знізу мяце.

Увосень і верабей багаты.

Увосень і кураняты курамі стануць.

Увосень за стол просім.

Увосень і грак — багач.

Увосень і верабей піва варыць.

Увосень давай карове, што ёсць, а вясной, што есць.

Як багата рабіны — вада па аглабліны.

Ядроныя арабіны — восенню гразі па аглабліны.

## ПРА ВЕРАСЕНЬ

Месяц верасень —
летаправодзец!
Пажаўцелі лісточкі
на дрэвах,
Прызаціхла птушынае
царства!
Запалалі чырвона
рабіны.
Гусі лета на крылах
панеслі.
Зачасцілі дажджы
па-над краем,
Вецер-сіверка просіцца
ў госці.

*А. Русецкі*

Верасень-летаправодзец: ластавак і гарыхвостак, журавоў і пеначак праводзяць у цёплыя краі.

Верасень — пачатак вясельных гульняў.

Верасень — лістападнік, схіл грыбной пары.

Верасень — адлёт у вырай дзікіх гусей. Гусі ляцяць — зімачку на хвасце цягнуць.

Восень у верасні ідзе і дождж за сабой вядзе.



Верасень — задумлівы месяц: пра таго, хто нарадзіўся ў верасні, разважалі: «У яго вераснёўскія думы».

Вераснёўскі гром абяцае цёплую восень.

Іван Прадцеча (11 верасня) гоніць птушку далеча.

Калі ў верасні лісце на дрэвах трымаецца моцна, чакай позняй зімы.

Калі ў лесе многа рабіны, то восень будзе дажджлівая, а калі мала, то сухая.

Калі ў верасні павуціна на галінках дрэў развешана, значыць, цёплыя дні наступаюць.

Прыйшоў верасень — супакоіў прыроду.

Пранесліся вятры з поўначы — ай ды бацюхна верасень!

Прастаіць верасень сухі — зіма позняя будзе.

Пагаворвалі ў народзе — верасень-равун. Аленеў рык і завыванні першых халодных вятроў зліваюцца ў адно.

Сухі і цёплы верасень — да позняй зімы. Прычым, чым ён сушэй і цяплей, тым зіма пазней.

У верасні сініца восень у госці просіць.

У верасні і ліст на дрэве не трымаецца.

У верасні адна ягада, ды й тая — горкая рабіна.

У верасні зямля адзяваецца ў азімую зелень.

У верасні лес радзей і птушыны голас цішэй.

У верасні селяніна не хата грэе, а цэп на такавішчы.

У селяніна ў верасні поўныя кішэні і засекі.

## ПРА КАСТРЫЧНІК

Ой, восень мая,
Восень сцюдзёная,
Чаго ты раненька захаладала?
Я й не рана,
Я й не позненька,—
Калі мая пара прыйшла,
Лісточак апаў,
Зямельку ўслаў.

Вось мая і пара прыйшла.
Рэчкі сталі, пазамярзалі,
Во мая й другая пара.

*З восеньскай песні*

Ад Пакрова (14 кастрычніка) трэба даваць сена карове.

Вясновы лёд тоўсты, ды слабы, а ў кастрычніку, хоць і тонкі, але ўчэпісты.

Гром у кастрычніку — зіма без снегу, а навальніца — кліча зіму марозную.

Калі 9 кастрычніка дождж са снегам — у студзені могуць тройчы быць адлігі, сонечна і цёпла — чэрвень будзе дажджлівы і халодны.

Калі 13 кастрычніка снег не выпадзе, зіма не скора настане, а калі 14 кастрычніка вецер з усходу падзьме — будзе халодная і марозная зіма.

Калі снег выпадзе да 14 кастрычніка — зіма не хутка настане.

Калі да палавіны кастрычніка з бярозы лісце не ўпала, то снег ляжа позна.

Калі ў сярэдзіне кастрычніка падзьмуць моцныя вятры — зіма халоднай будзе.

Калі ў кастрычніку лістапад прайшоў хутка — то чакай хуткай сцюжы, а зіма будзе суровай, калі ж лісце застаецца зялёным і доўга трымаецца на дрэвах — зіма будзе кароткая, з невялікімі маразамі.

Кастрычнік зямлю балоціць, а лес залоціць.

Кастрычнік — узыход сонца з лянотай.

Кастрычнік — пазімнік, прадшэсце зімы.

Кастрычнік сакавіку брат: сем пагод на дзень.

Кастрычнік — гразнік: ні калёс, ні палазоў не любіць.

Кастрычнік — «лістабой», «хлебнік».

Кастрычнік — месяц кахання. З даўніх часоў на Белай Русі ў гэты час, пасля заканчэння восеньскіх работ, вяселлі гулялі.

Кастрычнік зямлю пакрые дзе лістком, а дзе сняжком.

Кастрычнік на плямістым кані едзе.

Кастрычнік пірагамі цудоўны.

Кастрычнік — месяц хмурны.

Калі гняздо вожыка з краю лесу — будзе цёплая зіма, а калі ў сярэдзіне — халодная.

Калі вавёрка прыпасае арэхі ў вялікай колькасці, то зіма халоднай будзе. Такая ж зіма чакаецца, калі вавёрка да Пакрова (14 кастрычніка) сваю шубу заменіла.

Калі ў першыя дні кастрычніка з вышыні даносіцца звонкі кліч гусіных і жураўліных чародаў, патрэбна чакаць хуткага наступлення доўгай і халоднай зімы.

Не выпадзе снег у першай палове кастрычніка — не будзе яго й да сярэдзіны студзеня.

Непагодны кастрычнік — да ўраджаю, а туманы ў лістападзе — да позняй вясны.

У кастрычніку і хата з дравамі, і мужык з лапцямі.

У кастрычніку дождж дробна сеецца, але доўга цягнецца.

У кастрычніку на адной гадзіне і дождж, і снег.

У кастрычніку з сонцам разлічыся, бліжэй да печы падбярыся.

У кастрычніку ні на калёсах, ні на санях.

У кастрычніку для рыбалова радасць — добра ловіцца шчупак, акунь, судак, ёрш, налім, лешч, пячкур.

У кастрычніку для грыбнікоў радасць апошняя — збіраюць радоўкі, чарнушкі, казлякі, зелянушкі, сыраежкі, валнушкі.

Хто сее пасля Пакрова, не будзе мець чаго даць карове.

## ПРА ЛІСТАПАД

Ставяць калёсы,
Рыхтуюць сані,
Цепляць дамы —
Лістапад.

Гразі замнога,
Непагадзь золкая,
Дрэвы абсыпаліся —
Лістапад.

Дробны дожджык
Сцюдзёна паколвае
Шчокі і рукі —
Лістапад.

Рэкі спыняюцца,
Дзень карацее,
Сцюжаю дыхае —
Лістапад.

Месяц лістапад
Падчысціў дарогі,
Адчыніў вароты
Матухне зіме.

*А. Русецкі*

Ад першага снегу ў лістападзе да саннага шляху калёсы ў ходзе яшчэ пяць тыдняў будуць.

Да Казанскай (11 лістапада) не зіма, пасля Казанскай — не восень.

Калі на Казанскую пойдзе дождж — хутка зіма.

Калёсы дом збіраюць, а сані — разбіраюць.

Камары-таўкунцы ў лістападзе — быць лёгкай зіме.

Лістапад пасля кастрычніка на плямістым кані ездзіць: то снег, то гразь.

Лістапад — вароты зімы.

Лістапад шчодры — сцюжай усіх абдзяліць можа.

Лістапад зіме дзверы адчыняе.

Лістапад чым-чым, а сцюжаю ўсіх багатых абдзяліць можа ды яшчэ і на жабракоў халадоў застанецца.

Лістапад — лёдавы каваль: яго клопаты — зям-

лю закаваць, навесці лёдавыя масты паміж берагамі рэк.

Лістапад зіме дарожку пракладвае. Калі на Міхайлаў дзень (21 лістапада) іней выпаў — зіма снежная будзе.

Лістапад з капрызамі — то плача, то смяецца.

Лістапад-лістакос: вецер і мароз вершаць залаты пакос.

Лістапад — месяц звонкага лёду.

Лістападаўскія ночы да снегу цёмныя.

Лістападаўскі вецер, што не прынёс інею, сведчыць аб набліжэнні пургі. Калі вецер завывае на высокіх месцах, надвор'е не пагоршае.

Месяц у лістападзе ў смузе — да працяглай непагоды.

Першы сняжок у лістападзе — яшчэ не зімовы шлях.

Першы сняжок на пабыўку прыбыў, паляжаў ды й убыў.

Першы снег з мяцеліцаю ў лістападзе — зіма яшчэ не ляжа.

Плачуць па сонцы ў лістападзе ваконцы.

Пракаціліся дні па лістападу ды чарнатропу.

Селянін у лістападзе з калёсамі развітваецца, у сані садзіцца.

У лістападзе цяпло марозу не ўказ.

У лістападзе зіма з восенню змагаецца.

У лістападзе раніца з прыцемкам сярод дня сустракаецца.

У лістападзе восень-жыруха са злосніцай зімой змагаецца.

У лістападзе холадна, ды не камарна.

У лістападзе раніца з вечарам хутка сустракаюцца.

Хто ў лістападе не зябне, той у вадохрышчанскую сцюжу не замерзне.

# 2. НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ, ЦІ ДАЎНО ПАДМЕЧАНА



## ПЕРАД НАДЫХОДАМ ЗІМЫ

Ваверкі ўюць гнёзды нізка над зямлёй — зіма будзе марозная, а калі высока, то з адлігамі.

Ваверкі, мышы-палёўкі збіраюць больш, чым звычайна, запасаў — быць зіме сцюдзёнай.

Вятры дзьмуць, а інею няма — пурга будзе.

Вераб'і ўмацоўваюць свае гнёзды — праз некалькі дзён наступіць пахаладанне.

Вярба рана інеем пакрываецца — будзе працяглая зіма.

Вішня не апала — зіма не настала, а як вішня ападзе, так і зіма прыйдзе.

Высокі лёт асенніх птушыных чарод — да мяккай, адліжнай зімы, а калі птушкі ляцяць нізка — зіма халодная будзе.

Гусь лапу падымае — пачнецца сцюжа, доўга на адной лапе стаіць — мароз будзе, плешчацца ў вадзе — да цяпла, а калі дзюбу пад крыло хавае — зіма ўжо на парозе.

Дзённы снег доўга не трымаецца — першы надзейны снег выпадае ноччу.

Доўга не ліняюць зайцы — чакай працяглага халоднага надвор'я.

Тлушчам пер'е ў гусей, качак і курэй пакрываецца — халоднае надвор'е блізка.

За мяцеліцамі ліхім маразам раздолле: будуць трашчаць па ельнічках, па бярэзнічках ды й па стромкіх беражках.

Імклівы лістапад — суровая зіма наперадзе.

Калі восенню жабы пачынаюць глыбока пад ваду хавацца, то гэта прадказвае ранняе прыбліжэнне асенніх халадоў.

Калі пасля першых прымаразкаў лісце на дрэвах не пажоўкла і не асыпалася — вернецца ўстойлівае цяпло.

Калі сухія галінкі падаюць з дрэў у ціхае надвор'е — будзе снег.

Калі лісце з дуба і бярозы адразу не апала — быць халоднай зіме.

Калі выпадзе снег, а дрэвы яшчэ не скінулі лісце, ён хутка растае.

Калі восенню лісце бярозы пачынае жаўцець з вершаліны, вясна будзе ранняя, а калі знізу, то позняя.

Калі бур'ян расце высокі, будзе многа снегу.

Калі з дуба і бярозы плакучай усё лісце апала — да лёгкага (немарознага) года, а не ўсё — да суровай зімы: халады замучаць.



Калі гусі ляцяць высока, снегу многа будзе, а калі нізка — зіма маласнежнай будзе.

Калі ў лесе шмат арэхаў, але мала грыбоў, то зіма суровай і снежнай будзе.

Калі летам многа палявога асоту, чакай халодную зіму, а калі шчаўя многа — зіма цёплая будзе.

Калі першы снег накрые лісце на дрэвах, патрэбна рыхтавацца да халоднай зімы.

Калі неба да ночы чыстае, а вакол месяца з'явіліся вялікія кругі — будзе мароз; калі ж гэтыя кругі злёгку пачырванеюць — магчымы снегапад з ветрам.

Калі асінавае лісце кладзецца на зямлю гладкім бокам, то зіма халоднай будзе, а калі шурпатым, то цёплай; а калі і так і гэтак — сярэдняя зіма.

Калі восенню зайцы тлустыя, то зіма працяглай і халоднай будзе, а калі яны вясной доўга не ліняюць — халоднае надвор'е яшчэ пратрымаецца.

Калі восенню мурашкі бегаюць па вяршалінках травы, то зіма будзе ранняя, а снег глыбокі, а калі пад травой — то зіма будзе доўгай.

Краты і мышы цягнуць з восені ў норы шмат саломы — чакаецца зіма снежная і халодная.

Куры пачынаюць ліняць рана восенню — хуткая, але цёплая зіма будзе.

Лісце да замаразкаў апала — быць зіме цёплай.

Моцныя паўночна-усходнія вятры — к дажджу ці снегу. Пасля галалёду чакай дажджу.

Пакуль лісце з вішні не апала, колькі б снегу не нападала, адліга яго ўсё роўна згоніць.

Пахмурнае, халоднае надвор'е праясняецца к ночы — чакай замаразкаў.

Пры неўраджаі на шышкі елкі і хвоі зіма лютай не бывае.

Пчолы руплiва лясток воскам заляпляюць — зіма можа быць суровай і халоднай.

Позны лістапад — будзе зіма суровая і працяглая.

Позны адлёт жураваў у вырай сведчыць, што вясною снег не доўга затрымаецца на полі.

Праз тры тыдні пасля адлёту жураваў у вырай абавязкова пачнуцца першыя начныя замаразкі. Калі гусі і жуpавы не спяшаюцца ў вырай, сцюжа наступіць не скора, а зіма мяккай будзе.

Ранішняя зорка хутка гасне — на холад, а калі чырванее — да снегападу.

Снег асенні карысны для жыта, калі на зямлю сырую кладзецца.

Суровай зіме быць, калі птушкі дружна ў вырай адляцелі.

Сырое лета і цёплая восень — перад доўгай зімой.

Снегіры весела пяюць, вераб'і дружна зачыры-

калі, вароны часта з дрэва на дрэва чародамі пералятаюць — да адлігі.

Туман сцелецца па зямлі — чакай пацяплення.

У жніўні-верасні журавы на поўдзень адлятаюць — рана зіма наступіць.

У верасні гром — да доўгай восені; кастрычніцкі гром — да маласнежнай зімы.

Чырвонымі ягадамі рабіна красуецца — прыкмета марознай, снежнай зімы.

* * *

Барвова-чырвоная зімняя вячэрняя зорка — да ветру, снегу і мяцеліцы.

Верабей у поўдзень «песню пяе» ў паўднёвы бок — да цяпла, у паўночны — да холаду.

Дрэвы трашчаць — да працяглых маразоў.

Дым з коміна сцелецца па зямлі — чакайце снегападу.

Зімой справа ідзе да снегападу, калі ў сонечны дзень вавёрак у лесе не бачна, цецерукі і курапаткі хаваюцца ў снезе ці ў лес з адкрытых месцаў зляцяюць.

Зімой месяц свеціць ярка, знаходзіцца ў крузе ці ў «крыжы» — назаўтра чакай яснага, марознага дня.



Зайцы часта дарогу перабягаюць — да перамены надвор'я.

Іней на дрэвах — да марозу, туман — да пацяплення.

Калі вароны і галкі на снег садзяцца, гусі і качкі ў снезе купаюцца і крыламі лапочуць — будзе адліга, а калі лётаюць і крычаць — неўзабаве снегапад пачнецца.

Калі агонь чырвоны і дровы ў печы гараць з трэскам, у печы моцная цяга — да марозу, а калі шыпяць, дымяць, не загараюцца, попел хутка гасне — да пацяплення.

Калі пакаёвыя ка́лы зімой выдзяляюць ваду, хутка будзе пацяпленне.

Калі ноччу іней, днём снегу не будзе.

Калі дзень ясны і к вечару няма ветру, а неба пакрываецца туманным золакам — маразы доўга пратрымаюцца.

Калі сонца не ў хмару садзілася, месяц ноччу ярка свеціць, зоркі мільгаюць, а дым слупамі падымаецца — да моцнага марозу.

Калі лес зашумеў, бярозы як бы ў тумане, а коні на снег кладуцца — чакай пацяплення.

Калі пасля снегападу не праясніцца — назаўтра зноў можа быць снегапад.

Калі вакол месяца ўтварыўся цьмяны круг, то заўтра можа быць моцны мароз.

Калі вокны пачынаюць пацець пры падвойных рамах — мароз будзе ўзмацняцца.

Калі куры рана ў куратнік збіраюцца — маразы наступаюць, і чым вышэй на кросны садзяцца, тым мацней мароз будзе.

Калі дым з коміна падымаецца вертыкальна, хай і ў непагадзь, добрае надвор'е ўсталюецца, а калі сцелецца па зямлі — снегапады і мяцеліцы пачнуцца.

Калі зайцы трымаюцца бліжэй да вёскі, а ваўкі выюць каля жылля чалавека, з раніцы моцна пішчаць сініцы, значыць, мароз узмоцніцца.

Калі моцны мароз на Вадохрышча (19 студзеня) — на хлеб не спадзявайся, а калі адліга ў гэты дзень — ураджай будзе.

К снегу дым клубіцца шыза, барадой паўзучы кнізу.



Кошка падлогу дзярэ кіпцюрамі — да мяцеліцы.

Месяц ноччу як бы пачырванеў — заўтра чакай ветру, цяпла і снегу. Пры поўні і пры захадзе месяца — зменіцца надвор'е: мокрае — сухім, цёплае — марозным, хмурнае — ясным.

Марожаныя ягады каліны ў лесе на снег з дрэваў звальваюцца — да цяпла.

Падзьмуў паўночны вецер, а хмар няма — будзе мароз.

Перад снегападам ночы цёмныя.

Пушысты іней — да сухога надвор'я.

Скора світае зімой — чакай неўзабаве снегу.

Снегапад хутка пачнецца і мяцеліца прыйдзе, калі вераб'і сядзяць насупіўшыся ці сталі хавацца пад стрэхі, сарокі пад стрэхі лезуць, шчупакі ператалі браць на жэрліцу, на рэчцы вада з-пад лёду выступіла.

Сонца ўзыходзіць слупом — да марозу, а калі чырвонае — на мяцеліцу.

Сонца ў туманным крузе і нізка, хутка плывуць чорныя хмары — да зацяжнога снегападу.

Сінія вячэрнія хмары зімой — да перамены надвор'я.

У печы слабая цяга, аканіцы рыпяць, шкло на вокнах запацела — пацяпленне наступіць.

У мароз хмары хутка бягуць да паўднёвага заходу — да пацяплення.

Па шкле падымаюцца снежныя «расліны» — маразы працягнуцца, а калі яны пахіліліся — пацяпленне будзе.

Чырвонае сонца заходзіць у хмару — дзень будзе ясны і марозны.

Чакай пацяплення, калі пры марозе лес зашумеў.

Чысты захад, яркі месяц, вячэрняя барвова-чырвоная зорка — да моцных маразоў.

Шкло ў вокнах запацела — пацяпленне будзе.

# ДА ВЯСНЫ І ЛЕТА

Адкуль вецер на Вялікдзень — адтуль і ўсё лета будзе.

Бычкі бушуюць — вясну чуюць.

Вясной лётае многа павуціння — да гарачага лета, а ў час «бабінага лета» — восень яснай будзе.

Вясна халодная — лета з грымотамі і маланкамі.

Гракі адразу на гнёзды ляцяць — вясна цёплай будзе.

Глыбока прамерзне зямля, а з палонак на рацэ вада пральецца, лёд на пераборах (перакатах) ракі гарой ці грудамі ўстане, доўгія і тоўстыя ледзяшы са стрэх — быць цёпламу лету.

Дзікія гусі гагочуць — вясна наступіла, а варона, колькі не каркай, вясны не дазавецца.

З бярозы цячэ багата соку — лета дажджлівае будзе.



Заяц вясной доўга не ліняе — да халоднага лета, працяглай і халаднаватай восені.

Калі лета сухое і гарачае — зіма будзе марознай, але маласнежнай.

Калі вясной птушкі садзяцца на вокны — чакаецца моцная сцюжа.

Калі вясной снег растае з паўночнага боку муравейніка, то лета цёплае і доўгае будзе, а калі з паўднёвага, то халоднае.

Калі авёс, які паспеў, зноў пазелянее, чакай дрэннай восені.

Калі з вастралістага клёна вясной ідзе багата соку — чакай дажджлівага лета.

Калі журавы на поўнач лятуць — да цёплай вясны, на поўдзень — да халоднай.

Калі восенню рана заснежыць, значыць, вясна ранняя будзе.

Калі вясною першы гром прагрыміць раніцай, лета будзе з сярэдзінкі на палавінку (умеранае).

Калі бяроза перш клёна зазелянее, чакай сухога лета, а калі клён апярэдзіць бярозу — лета дажджлівым будзе.

Калі бусел нечакана птушаня з гнязда выпусціць — чакай галоднага года, а калі яйцо ўпусціць — восень будзе ўраджайнай.

Калі вольха распусціцца раней бярозы, чакай мокрага года.

Калі бяроза раней вольхі распусціцца, а ясень раней дуба, то лета будзе сухое і сонечнае, а калі наадварот, то на працягу лета будуць дажджы і пахаладанні.

Калі ў пачатку лета назіраецца масавы лёт маладых павучкоў на павуцінках, то лета гэта будзе працяглае.

Калі гракі пасля вяртання з выраю адразу ж на гнёзды месцяцца, вясна дружнай будзе.

Калі качкі з выраю тлустымі прыляцелі — вясна будзе доўгай і халоднай.

Калі зязюля кувае штодзённа, замаразкі больш не вернуцца, будзе цёплае надвор'е.

Калі першы вясенні гром пачуецца з паўночнага боку — лета халодным можа быць, а калі з паўднёвага, дык лета цёплым будзе; калі гром чуецца на захадзе — лета мокрым будзе.

Калі жаваранкі і буслы з поўдня рана вяртаюцца — на ільняных палетках ураджай багаты будзе.

Калі зацвітае падбел, значыць, цяпло блізка.

Калі па вясне ў лесе шмат вавёрак — неўраджайны год будзе.

Калі птушкі з поўдня вяртаюцца чародамі — вясна дружнай будзе.

Позна зацвіла рабіна — да цёплай і працяглай восені.

Пульхны іней са снегам прыгнуў вясной галінкі дрэў — да багатага ўраджаю хлебнай нівы.

Ранні вылет пчол з вулляў — да ранняй і цёплай вясны.

Снег падае вялікімі камякамі — да ўраджайнага лета.

Снег па вясне спачатку сходзіць з паўночнага боку мурашніка — лета будзе цёплае і працяглае; з паўднёвага — халоднае ды кароткае.

У чаромхі шмат кветак — чакай лета мокрага.

Цёплая зіма — халоднае лета, снежная зіма — лета дажджлівае. Зімой шмат інею — летам шмат расы, а калі зіма сухая і халодная — лета будзе сухім і гарачым.

Як асіна затрасецца (распусціць лісты), тады і воўк вады нап'ецца.

Якое надвор'е ў дні красавання садоў, такім і ў жніво будзе.

## ДА ДОБРАГА НАДВОР'Я

Духата — прыкмета навальніцы.

Дым ад кастра па зямлі сцелецца — да добрага надвор'я.

Да яснага надвор'я вуголле ў кастры хутка попелам пакрываецца, кажаны актыўна ўвечары лятаюць, зяблік звонка вечарам пяе.

Да ночы з'яўляецца буйная раса ці туман — быць добраму надвор'ю.

Зорка залацістая або ружовая — да ўстойлівага, яснага надвор'я.

Калі ноч стаіць ціхая, а раніцай, праз гадзінудругую пасля ўсходу сонца падымаецца вецер і мацнее к полудню, але к вечару зноў сціхае — усталюецца яснае сухое надвор'е.

Калі вечарам і ноччу выпадае буйная раса, якая адразу ж высыхае раніцай, будзе ўстойлівае, яснае надвор'е.

Калі вецер вые на высокіх месцах, то надвор'е не пагоршыцца.

Калі сонца ўзышло і свеціць ярка — надвор'е к поўдню пераменіцца.

Калі хмарна і слабы вецер — замаразкаў не будзе.

Калі туман хутка разыходзіцца — замаразкаў не будзе. Калі позняй восенню снег ляжа на сырую зямлю, то рана вясной з'явяцца пралескі.

Калі з вечара па небе ходзяць вялікія кучавыя хмары, то на другі дзень будзе добрае надвор'е.

Калі раніцай трава сухая або кропелькі расы выцягнутымі завушніцамі вісяць на кончыках лісцяці травы — да ночы чакай дажджу.

Калі ружавеюць хмары ў час захаду сонца, назаўтра моцны вецер будзе.

Калі к вечару ў лесе цяплей, чым у полі,— назаўтра будзе цёплае, яснае надвор'е.

Калі раніцай туман ад зямлі і вады падымаецца ўверх і паступова рассейваецца, днём гарачае надвор'е будзе.

Калі сонца заходзіць за светла-ружовы небасхіл — у першай палове наступнага дня будзе добрае надвор'е.

Калі ранішні вецер паступова ўзмацняецца, а к вечару слабее — захаваецца яснае надвор'е.

Калі вецер становіцца рэзкім, будзе паляпшэнне надвор'я.

Калі ў нізінах з'яўляецца туман, то ападкі яшчэ могуць быць значнымі, але не суцэльнымі.

Калі дождж ідзе пры сонцы, то ён хутка перастане.

Калі на небе шмат зорак, надвор'е праясніцца. Тое ж самае будзе, калі пасля дажджу нечакана пахаладае.

Калі вецер рухаецца за сонцам, чакай добрага надвор'я.

Калі ў нізінах збіраецца туман, які знікае пры ўсходзе сонца, трэба чакаць яснага надвор'я.

Кучавыя хмары ходзяць нізка — да дрэннага надвор'я, высока — да краснага дзянька.

Летняй раніцай маленькі дожджык — днём добрае надвор'е.

Моцны вецер у час дажджу прадказвае добрае надвор'е.

Неба захмарылася, але кветкі адуванчыкаў адкрытыя — дажджу не будзе.

Праясненне надвор'я прадказваюць:

— воблакі, што рухаюцца з поўначы на поўдзень;

— ярка-чырвонае сонца на захадзе;

— высокія кучавыя хмары, што з'яўляюцца пасля полудня;

— кулікі, якія бясконца лётаюць над полем;

— меладычна-пявучая івалга;

— пеўні, якія пяюць у пахмурнае надвор'е.

— пажаўценне скуры ў жаб;

— дружны вылет раніцай пчол з вулляў;

— матылі, што кружацца над кветкамі, але не садзяцца на іх;

— жукі-гнаевікі, якія нізка лётаюць вечарам;

— слупы з камароў і мошак у вячэрні час;

— божыя кароўкі, якія хутка злятаюць з рукі;

— мухі, якія звонка гудуць з самай раніцы;

— вароны, якія «гуляюць на ляту»;

— п'яўкі, якія добра ловяцца перад заходам сонца;

— цыкады, якія звонка пяюць вечарам;

— матылі-крапіўнікі, якія кружацца ў імглістым дажджы;

— мураў'і, якія хутка перамяшчаюцца, мітусяцца пры адкрытых ходах у мурашніку;

— конікі, якія дружна скачуць і стракочуць у вячэрні час;

— палявы ўюнок, кветкі якога раскрыліся ў пахмурны дзень;

— касцянка, калі яе лісты закруціліся ўніз;

— папарадь арліная, калі яе лісты загнуліся ўніз;

— раскрытыя кветкі фіялкі;

— наготкі, суквецці якіх распусціліся раніцай;

— канюшына лугавая, у якой лісце распрамлена;

— галінкі елкі і ядлоўцу, што паднімаюцца ўверх;

— кветкі заячай капусты, калі яны закрыліся на ноч;

— кветкі белых вадзяных лілей, калі яны былі адкрытымі з 7 да 17 гадзін;

— кветкі сон-травы, калі матылі на іх падоўгу не затрымліваюцца;

— з'яўленне вялікай колькасці павукоў, якія паўсюдна развесілі свае сеці.

Пасля дажджу вясёлка імгненна знікае — да яснага надвор'я. Добрае надвор'е будзе, калі ў час дажджу вясёлка доўга стаіць, не адрываецца ад зямлі.

Плаўная вясёлка ці вясёлка з поўначы на поўдзень абяцаюць дождж, а крутая — добрае надвор'е.

Раніца ясная, затым з'яўляюцца кучавыя хмары, якія к вечару рассейваюцца і знікаюць,— прыкмета добрага надвор'я.

Раніцай ці вечарам высокая зорка мае барвова-чырвоную афарбоўку — хутка будзе моцны вецер.

У вясёлцы многа чырвонага колеру — моцны вецер будзе, а калі яна з'явілася ў другой палове дня — наступіць праясненне.

Устойлівае і яснае надвор'е будзе, калі атмасферны ціск на працягу некалькіх дзён застаецца нязменным або павышаецца.

Шуміць, хвалюецца дубровачка да добрага надвор'я.

## ДА ДРЭННАГА НАДВОР'Я...

Барвова-чырвоная зорка — да ветру, а калі барвовае сонца садзіцца ў ваду — да добрага надвор'я.

Белыя лілеі прыкрылі бутоны — праз дзень-два дождж будзе.



Тое ж, калі гэта кветка не раскрылася ні днём, ні вечарам.

Будзе дождж або непагода, калі кучавыя воблакі пачынаюць рассейвацца.

Будзе непагода:

— калі ранішняя зорка чырвоная ці барвова-чырвоная;

— сонца ўсходзіць з-за хмар ці з-за «рваных» воблакаў;

— пасля світання туман не знікае, а павольна падымаецца і ператвараецца ў нізкія слаістыя воблакі.

Вада ў рацэ пеніцца, лес без ветру шуміць, шкло ў вокнах пацее, соль макрэе — усё гэта сведчыць пра набліжэнне дажджу.

Воблакі плывуць з поўначы на поўдзень — да сонечнага надвор'я, а калі наадварот, то чакай непагоды.

Воблакі плывуць нізка над зямлёй ці рухаюцца з поўдня на поўнач, чакай халадоў.

Вячэрняя вясёлка прадказвае добрае надвор'е, а ранішняя або з наветранага боку — дажджлівае.

Высокая вясёлка — да добрага надвор'я, плаўная і нізкая — да дрэннага.

Вецер часта мяняе свой напрамак, сціхае, а потым звальваецца ўраганнымі парывамі — чакай дрэннага надвор'я.

Віхурныя парывы ветру бываюць перад моцным громам.

Дождж, як госць, калі раніцай прыйшоў — доўга не затрымаецца, а калі з'явіцца па полудню — начаваць не застанецца.

Дождж, які пачынаецца буйнымі кроплямі, перастане хутчэй, чым той, які пачынаецца дробнымі.

З'яўленне воблакаў у выглядзе баранчыкаў ці высокіх кучавых воблакаў, якія к вечару зніжаюцца, прадказвае наступленне непагоды.

З раніцы на захадзе хмара стаіць — будзе дождж.

Іней або раса на траве — перад дажджом.

Іржышча, ламаючыся, трашчыць — дождж кліча.

Калі зоркі, асабліва к раніцы, узмацняюць міганне, надвор'е пагоршыцца.

Калі ў полі далёка разносіцца рэха — будзе дождж.

Калі наготкі раніцай раскрыюць свае венчыкі, то чакаецца яснае надвор'е, калі па полудню, то чакаецца дождж, навальніца.

Калі некалькі дзён запар дзьме вецер з поўдня ці паўднёвага захаду, дождж будзе.

Калі ў час дажджу ў лужынах з'яўляюцца бурбалкі і доўга не лопаюцца, непагода зацягнецца.

Калі ціха і сонца вельмі пячэ, чакай навальніцы ці граду.

Калі тэмпература паветра не мяняецца на працягу дня — быць непагодзе.

Калі пасля дажджу адгалосак ад рэха глухі, то непагода будзе працягвацца.

Калі ад кропель дажджу на вадзе з'яўляюцца бурбалкі — да працяглай непагоды.

Калі пасля дажджу становіцца цёпла, ад зямлі ідзе пара, а дробны дожджык пры сонцы яшчэ працягвае ісці, будзе непагода.

Калі пасля добрага дажджу вада ў рацэ не ахаладзілася, а нават пацяплела,— хутка зноў пойдзе дождж.

Калі ў летні час вечарам становіцца цяплей, чым днём, і ветрык, які ўзмацніўся, не сціхае, чакай перамены яснага надвор'я на непагоду.

Калі галінкі елак і асін апускаюцца, лускавінкі шышак прыціскаюцца адна да другой — чакай пагаршэння надвор'я.

Калі пры пахмурным надвор'і к вечару праясняецца і сціхае вецер — чакай замаразкаў.

Калі ноччу няма расы, чакай перамены яснага надвор'я на непагоду.

Калі пры захадзе сонца хмары зацягваюць неба з поўначы — быць ветру; калі неба ярка-аранжавага ці чырвонага колеру — да моцнага ветру.

Калі адуванчык скідае свой шарык — гэта прыкмета таго, што будзе дождж.

Калі вецер — тады і холадна.

Калючкі чартапалоху прынялі гарызантальнае становішча — будзе ўстойлівае ветранае надвор'е, а калі вертыкальнае — надвор'е будзе пахмурным.

Кветкі фіялкі закрыліся і паніклі — да блізкай непагоды.

Куды вецер — туды і дождж.

Кучавыя воблакі плывуць з захаду — да пагоршання надвор'я, ходзяць нізка — да непагоды, высока — да пагодных дзён.

Лісты бяссмертніка раскручаны ці загінаюцца ўверх — надвор'е хутка пагоршыцца.

Лісты дрэў паказваюць свой зваротны бок, а ў садзе моцна пахнуць жоўтая акацыя і язмін, парэчкі і жымалосць, ляўкоі і петунія — чакай дрэннага надвор'я.

Летам моцны вецер — да дажджу.

Маланка на захадзе — дождж следам.

Млечны шлях добра бачны — да яснага надвор'я, бляклы — да дажджу.

Моцна гудуць тэлефонныя правады — да пагаршэння надвор'я.

Моцны вецер — будзе моцны дождж.

Месяц пачырванеў — будзе моцны дождж.

Месяц пачырванеў — ідзе ў госці вецер-свавольнік.

Месяц чырванее, і чым больш, тым хутчэй будзе дождж.

Моцны віхор — перад праліўным дажджом.

Надвор'е пагоршыцца, калі пры адсутнасці ветру дым з комінаў і кастроў сцелецца па зямлі, а вуголлі ў кастры ярка тлеюць.

Надвор'е пагоршыцца, калі днём і к вечару добра бачны яркія праменні, якія стрэламі разыходзяцца з-пад воблакаў, што закрываюць сонца.

Начны вецер к раніцы дождж прыганяе.

Няма расы да полудня — чакай дажджу ў госці.

Няма начной расы ці яна слабая і хутка высыхае — быць навальніцы.

На небе з'яўляюцца прасветы паміж воблакамі,

перыстыя воблакі, што з'явіліся, знікаюць к вечару. Але калі ціск узмацняецца і неба пры гэтым хутка святлее, а вецер сціхае, то паляпшэнне надвор'я будзе непрацяглым.

Надвор'е пагоршыцца, калі туман знікае да ўсходу сонца, стаіць над лесам, а раніцай падымаецца ўверх.

Нізкія, пахмурныя, суцэльныя воблакі — непагода ўсталюецца на доўгі час.

Неба зорнае, чыстае — чакай марознай раніцы, а калі вакол ранішняга сонца ёсць некалькі кругоў — будуць маразы з мяцеліцамі.

Нікнуць ветраніца, шчаўе, канюшына лугавая склала свае лісточкі, змыкаюцца ліловыя грамафончыкі іпамеі, кветкі мальвы згарнуліся, знізу лістоў лебяды і хрэну ўтвараецца макрата, дзядоўнік раскрыў свае калючкі, днём не колецца чартапалох — чакай пагаршэння надвор'я.

На пагаршэнне надвор'я паказваюць:

— паўночны вецер;

— пачырванелае неба раніцай;

— пацямненне неба на захадзе сонца;

— пасвятлелае неба, з'яўленне перыстых воблакаў;

— зеленаватае адценне вячэрняга неба;

— узмацненне ветру к вечару;

— мутны і невыразны месяц;

— пацяпленне, што наступіла пасля дажджу;

— неаднолькавы напрамак руху ветру і воблакаў;

— дамашнія жывёліны, якія хаваюцца ў будынкі;

— сабака, які згарнуўся абаранкам;

— кошка, якая скрабе кіпцюрамі сцяну;

— хвасты ў быкоў, закручаныя кольцамі;

— свінні, якія часта чэшуцца;

— птушкі, якія насупіліся;

— птушкі, якія вечарам кормяцца даўжэй, чым звычайна;

— птушкі, якія доўга кружацца, нізка лётаюць і моцна крычаць;

— глушцы, якія перастаюць такаваць;

— «скрыпенне» зяблікаў;

— знікненне стрыжоў;

— вячэрнія песні пеўняў;

— пчолы, якія лятаюць доўга і далёка і вяртаюцца дамоў позна вечарам;

— прылёт у хату начных матылькоў;

— жукі-гнаявікі, якія капаюцца ў кучах;

— прылёт на агонь кастра вялікай колькасці мошак;

— мухі, якія ціха сядзяць на сцяне;

— павукі-цянётнікі, якія хаваюцца ў шчылінах;

— паляванне павукоў-цянётнікаў у самы гарачы час;

— свінні, якія хаваюцца ва ўкрыцце;

— змяншэнне надою малака ў кароў;

— нізкі палёт ластавак;

— начны пранізлівы крык сыча;

— вужы, якія грэюцца пад сонцам на дарогах;

— пчолы, якія абляпілі акацыю;

— мноства матылькоў, якія вечарам сядзяць на кветках сон-травы;

— чароды стракоз;

— маўчанне цвыркуноў;

— авадні, якія моцна кусаюцца;

— восы, якія абляпілі бружмель;

— сухая трава раніцай;

— звон хвоі і стогн дуба (калі прыслухацца);

— кроплі дажджу, якія спадаюць з лістоў асіны, вярбы, чаромхі;

— палявы ўюнок, у якога кветкі закрыліся;

— закрытыя ярка-чырвоныя суквецці наготкаў;

— касцянка, калі яе лісты раскруціліся і загінаюцца ўверх;

— сена, што было сухім і адсырэла;

— дрэма лугавая і бружмель, аблепленыя мошкамі;

— падбел, які закрыў свае кветкі ў першай палове дня;

— «парашуцікі» адуванчыка ў сухое гарачае надвор'е разносяцца лёгкім подыхам ветру, а перад дажджом іх не адарве і моцны вецер;

Перад градабоем чуваць, як уверсе гудзе.

Перад начной навальніцай стаіць макраватая цеплыня.

Перад непагодай у студнях, крыніцах, невялікіх сажалках прыбывае вада.

Праясняецца к ночы пахмурны дзень — можна чакаць замаразкаў.

Пры захадзе сонца перыстыя воблакі — да перамены надвор'я.

Расліны закрываюць кветкі — імкнуцца зберагчы пылок ад вады.

Расы ноччу няма — яснае надвор'е зменіцца непагодай.

Ружы і шыпшына не раскрылі раніцай сваіх бутонаў — чакай непагоды.

Радужны туманны вобад вакол месяца прадказвае пагоршанне надвор'я.

Рэзка надвор'е пагоршыцца, калі вецер к ночы мацнее.

Сонца чырвонае і хмары к вечару пачырванелі — чакай пагаршэння надвор'я.

Сонца жаўцее і хутка коціцца к захаду — ноччу дождж пральецца.

Сонца свеціць днём як бы праз занавеску — чакай дажджу.

Сонца перад захадам у хмарах прападае — да непагоды.

Сонца ў хмарах купаецца — дождж́ык збіраецца.

У вясёлцы больш чырвонага колеру — к ветру.

У пахмурны дзень добра праглядаецца небасхіл, добра чутны галасы і гукі — назаўтра дождж пачнецца, а то і навальніца будзе.

Уюнок закрывае свой венчык, а кветкі маргарыткі нахіліліся да зямлі — дождж будзе.

Фіялетавыя воблакі — да дажджу і цяпла.

Чым павольней зніжаецца ціск, тым устойлівей будзе непагода.

Чым зяляней вясёлка, тым мацней дождж. Пры гэтым непагода працягнецца, калі ў вясёлцы становіцца больш сіняга колеру.

Чырванаваты месяц — к вялікаму ветру.

Чаму сонца нашкодзіць, таму дождж паможа.

Што дожджык перамочыць, тое сонца прасушыць.

Яркая вясёлка — да непагоды. Таксама да непагоды і адначасовае ззянне дзвюх ці нават трох яркіх вясёлак.

Яркія зоркі — да пагожага дня, а блеклыя — да дажджу і снегу.

* * *

Вераб'і ў непагоду пачалі шчабятаць, чакай хуткага паляпшэння надвор'я.

Галкі ў чародкі злятаюцца і крычаць — да яснага надвор'я.

Галубы разваркаваліся, буслы высока кружацца, ластаўкі высока лятаюць, вераб'і лятаюць невялічкімі групкамі, цецерукі падоўгу маўкліва сядзяць на вершалінах дрэў, шэрыя вароны звонка крычаць, галкі, якія сабраліся ў чароды, к вечару пачалі гарланіць — кожная з гэтых прыкмет сведчыць аб наступленні яснага надвор'я.

Галубы разваркаваліся — усталюецца добрая пагода.

Гракі гуляюць — надвор'е ясным будзе.

З'явіліся стракозы ў вялікай колькасці — ячмень ураджайным будзе.

Калі пчолы роем кружацца і гудуць на чаромсе ці рабіне, якія красуюць,— назаўтра будзе ясны дзень.

Калі пры набліжэнні навальнічных воблакаў пчолы не хаваюцца ў вуллі, дажджу не будзе.

Калі раніцай пчолы не ляцяць у поле браць пылóк і нектар, а сядзяць у вуллях і гудуць, — чакай дажджу.

Калі жабы скачуць па беразе і квакаюць, то можа быць дождж. Жабы вурчаць — на дождж; вечарам моцна і доўга квакаюць — на добрае надвор'е, маўчаць перад халадамі.

Калі ў час дажджу павукі пачалі плесці павуціну, вось-вось дождж перастане.

Калі жураvы ляцяць высока, не спяшаючыся і «размаўляюць» — будзе стаяць добрая восень.

Калі слімакі рана зачыняюць свае ракавіны, будзе ранняя зіма.

Калі ў вожыкавай нары закрыты паўднёвы ўваход, значыць, бура ці моцны вецер будуць з поўдня, а, калі паўночны — з поўначы.

Калі каня вылятае з балота і кружыцца над полем, будзе паляпшэнне надвор'я.

Калі салавей усю ноч пяе, чакай сонечнага дня.

Калі ластаўкі і стрыжы лётаюць высока, будзе добрае надвор'е.

Калі ў непагоду весела зачырыкалі вераб'і ці запеў жаўранак — яснае надвор'е не за гарамі.

Калі жукі ў пагожы дзень к вечару у лёт кінуліся, добрае надвор'е захаваецца.

Кошка хаваецца ў печ — да холаду.

Кошка садзіцца на падаконнік і глядзіць у акно — да цяпла.

Кошка ліжа лапу — на добрае надвор'е.

Кошка ляжыць і моцна спіць пасярэдзіне хаты — пацяпленне будзе.

Кошка ўважліва шэрстку і хвост вылізвае, сцяну дзярэ, цягнецца да вады і п'е больш звычайнага — да непагоды, а калі на спіне качаецца ці выцягваецца на падлозе пасярод кватэры — паляпшэння надвор'я не будзе.

Краты выходзяць на паверхню, а жабы хаваюцца ў норах — да цяпла.

Лятаюць у небе высока арланы — ясны дзень недалёка.

Многа пяюць жаваранкі — яснае надвор'е захаваецца.

Павук-крыжавік пры захадзе сонца сядзіць у цэнтры павуціны — наперадзе сухое надвор'е.

Пералётныя птушкі ляцяць чародамі — да дружнай вясны.

Пеўні да раніцы песню ладзяць ці раніцай доўга пяюць — цяпло будзе.

Птушкі ў дождж запелі — добрае надвор'е завуць.

Размарыўся сабака, на сон пацягнула — цяпло блізка.

Хоць і неба ў воблаках і гром чутны, але пчолы не хаваюцца і займаюцца зборам мёду — дажджу не будзе.

Цецерукі на вяршалінах дрэў расселіся — да яснага надвор'я.

Чайкі садзяцца на ваду — чакай добрае надвор'е.

Ка́ні вечарам крычаць — добрае надвор'е зазываюць.

Шпакі доўга не адлятаюць у вырай, значыць, восень сухая будзе.

* * *

Белая сітаўка прыляцела — ледаход скора пачнецца.

Будзе надвор'е дрэнным, калі ластаўкі і стрыжы лётаюць нізка над зямлёй, а куры разгульваюць пад нудным дажджом.

Варона насупілася — да дажджу. Каркае, седзячы насупраць ветру,— таксама будзе дождж. Лётае высока — да непагоды.

Вераб'і сядзяць нахмурыўшыся — хутка дождж будзе.

Вераб'і пералятаюць чародкамі з месца на месца — чакаецца моцны вецер, а пухам і пер'ем гнёзды ўцяпляюць — пахаладанне можа наступіць.

Вецер з захаду — клёву канец. І калі ў ясны дзень рыба кляваць перастала — будзе доўга стаяць дрэннае надвор'е.

Гракі ўюцца высока чародамі і спускаюцца імкліва на зямлю — да дажджу. Дождж таксама можа быць, калі гракі больш ходзяць па траве, чым па пахаці.

Галкі перабіраюць пер'е — да непагоды.

Жукі-гнаевікі варушацца ў гнойных кучах і не ўздымаюцца ў паветра — чакай непагоды, а калі яны ўздымаюцца ў паветра — будзе паляпшэнне надвор'я.

І птушка чуе, што холад будзе.

Імклівыя павучкі па ціхенькіх месцах разбягаюцца і не выходзяць са сваёй павуціны, нават калі яе зачэпіш — непагода прыбліжаецца.

Качка лапоча крыламі і доўга чысціцца — к дажджу, а калі галаву пад крыло хавае — чакай пахаладання.

Калі ў лютым у пчаліных вуллях чуецца гудзенне — гэта значыць, што мруць пчолы.

Калі гракі прыляцелі рана, але за рамонт сваіх «кватэр» не ўзяліся, садзяцца на іх і зноў узлятаюць — халады яшчэ пратрымаюцца. А калі прыляцелі і дружна цягаюць суччa, праз дзень-два будзе цёпла.

Калі свінні вішчаць, значыць, непагода будзе.

Калі мядзведзі восенню ўмацоўваюць свае бярлогі на высокіх месцах, то вясной у нізінах многа вады будзе.

Калі земляныя чарвякі выпаўзаюць напаверх, ракі выходзяць на бераг і ў жаб становіцца шэрай скура — быць непагодзе.

Калі чайкі садзяцца на ваду — будзе добрая пагода, «прагульваюцца» па беразе — да дажджу; калі лётаюць нізка над вадой — к ветру;

Калі куры кудахчуць і натапырваюцца, то наступіць непагода.

Калі скаціна збіраецца ў гурт, а вечарам прагна скубе траву — будзе дождж.

Калі малако закісае скора пасля ўдою — да навальніцы.

Калі ра́кі на бераг выходзяць, а п'яўкі падымаюц-

ца ўверх і нават вылазяць з вады — да непагоды.

Калі восенню ўваход ў кратовую нару размешчаны на поўнач, то зіма будзе цёплая; калі на поўдзень — халодная; калі на ўсход — сухая; калі на захад — сырая.

Калі певень стаіць на адной назе — чакай марозу.

Калі дажджавыя чарвякі выпаўзаюць з зямлі, то яснае, сонечнае надвор'е зменяць дажджы з навальніцамі.

Калі вераб'і-канапляніκі купаюцца ў пыле ці пад стрэхі пахаваліся, навальніца прыбліжаецца.

Калі ластаўкі то высока ў неба падымаюцца, то ўніз кідаюцца, навальніца будзе.

Калі ў пагожы дзень дзяцел пачынае моцна дзяўбсці дрэва, хутка дождждык закапае.

Калі пчолы сабраліся ў вуллі і гудуць, праз 6—8 гадзін абавязкова пачнецца дождж.

Калі ў сонечны дзень пчолы ў вулей збіраюцца, можа навальніца пачацца.

Калі мурашкі перасяляюцца на высокае месца — быць лету дажджліваму.

Калі жураўы ляцяць высока, не спяшаюцца і курлыкаюць, будзе добрая восень; калі нізка, хутка і моўчкі — чакай непагоды.

Калі мышы свае гнёзды ладзяць на стагах сена — восень чакаецца мокрай і халоднай, калі пад стагамі і нават у зямлі, чакай вясну сухую.

Калі восенню скаціна ў статак збіраецца, пойдзе дождж.

Калі краты пачалі капаць вялікія земляныя кучы, хутка пойдзе дождж.

Калі не чутна конікаў, чакай дажджу.

Калі п'яўкі знаходзяцца ў пастаянным руху — навальніца будзе.

Калі жабы скачуць па беразе і нудна квакаюць — чакай дажджу; калі іх зусім не чутна,— могуць быць працяглыя халады.

Калі ў летнюю пару мухі кусаюцца, будзе дождж.

Каровы к вечару равуць — непагода блізка.

Кошка мыецца — добрае надвор'е чакаецца, а калі скруцілася ў цёплым месцы абаранкам і спіць, прыкрыўшы мордачку лапай, непагода будзе.

Камары роем — да добрай пагоды; авадні звонка гудуць, камары і другія мошкі, якія ў звычайны час моцна кусаюцца, схаваліся,— да дажджу.

Не мяўкае кошка ў непагоду.

Надвор'е пагоршыцца, калі ад хлявоў, дзе стаіць скаціна, ад гнілога балота, ад зарослай сажалкі ідзе рэзкі пах.

Паўлін крычыць да дажджу.

Пеўні вечарам запелі — да перамены надвор'я, а сярод ночы крычаць — туман будзе.

Певень ноччу запяе — да непагоды.

Перад дажджом рак у іл закапваецца, яшчаркі ў норах хаваюцца.

Павукі плятуць шмат павуціння — будзе сухое і халоднае надвор'е.

Перад навальніцай працягла крычыць каршун, дробныя птушкі хаваюцца ў гнёзды, а галкі мітусяцца і крычаць.

Перад дажджом і блізкай навальніцай уклейкі выплываюць на паверхню вады. Уюн перад непагодай падымаецца на паверхню вады і, захопліваючы ротам паветра, характэрна пішчыць, часцей ловіцца на вуду.

Птушкі ў гульні кінуліся, пераклікаюцца — быць дажджу.

Павуцінне сцелецца па раслінах — да цяпла.

Прадказваюць пагаршэнне надвор'я мухі і павукі — першыя лётаюць мала, шукаюць месца для сховаў, збіраюцца ў цёмным месцы; другія амаль не пакідаюць сярэдзіну павуціны, хаваюцца, сядзяць нерухома.

Рыба ўсплёсквае вячэрняй парой — да добрага надвор'я; а калі ўюны выплываюць на паверхню — непагода будзе.

Сабака многа есць і многа п'е — да дажджу, ляжыць пад ганкам і хвост абаранкам — да холаду.

Сабака есць траву — да дажджу.



Сава крычыць — да холаду.

Сарокі пад страху лезуць — да бурану.

Скаціна мала п'е вады, днём спіць — да дажджу.

Сярэбраным званочкам заліваецца зяблік — да яснага надвор'я. А рыпіць: «Піць-піць!» — да дажджу.

Сом, уюн і галец, якія, звычайна, спакойна ляжаць на дне вадаёма, падымаюцца на паверхню і плешчуцца — перад навальніцай. Перад навальніцай многія рыбы выскокваюць з вады і ловяць мошак.

Ткуць павукі свае ўзоры ў паўднёвым напрамку — будзе пацяпленне, у паўночным — чакай пахаладання.

У лютым пасечнікі аглядаюць вуллі з пчоламі. Гудуць пчолы ледзь чутна — пераносяць зіму лёгка; неспакойнае гудзенне ўказвае на дрэнны стан пчаліных сем'яў.

У які бок спіной скаціна прыляжа, адтуль і вецер хутка падзьме.

У другой палове дня певень запеў — заўтра дождж будзе.

У небе яшчэ няма хмар, а матылі-крапіўнікі не ўзлятаюць — праз некалькі гадзін дождж пачнецца.

У верасні вужакі выходзяць на бераг, а гадзюкі ў лес паўзуць і там хаваюцца ў зямлю.

Цвыркун цвыркае — на халоднае надвор'е, маўчыць — на дождж.

Чаромха зацвіла, запеў салавей — чакай двухтыднёвага пахаладання.

* * *

Адно зярнятка — пуд прыносіць.

Адкуль навальніца — адтуль і добрая пагода.

Асіна ў багатым цвеце — ураджай на авёс.

Ваўнянкі — прадвеснікі груздоў.

Восеньскія апенькі — прадвеснікі снегу.

Вучыся грыбы збіраць змоладу, тады не памрэш з голаду.

Вушы чэшуцца — да дажджу.

Грыбная прыкмета — першы туман лета.

Грыб і лес баяцца не нажа, а пажару.

Год хлебаробны выкажацца зімой халоднай.

Грак-зімоўшчык — да цёплай зімы.

Гарачы — на малады месяц нарадзіўся.

Добра свеціць месяц, калі на небе сонца няма.

Дуб у кажуху летам, а зімою расхрыстаны.

Доўгае павуцінне ляціць — да яснай восені і няскорага снегу.

Думай з вечара, а рабі з рання.

Жуpавель у студні рыпіць — да перамены надвор'я.

Жывецца, як даецца.

Жыта можна сеяць, калі з'явяцца камары.

З вады — абед худы.

Зялёны мох на валунах больш расце з паўночнага боку.

Зверху ясна — знізу гразна.

Зацвіла рабіна, значыць, па ababkі (падбярозавікі) збірацца можна.

Залаты пылок пасыпаўся з хвоі — грыбнік у надзеі, што з'явяцца казлякі.

Звон у вушах летам — да непагоды, зімой — да снегу.

Здароў'е ды пагода напярэдадні не сказваюцца.

Зорку праспаць — граша не дастаць.

Зорка і мужыка золатам абсыпле.

Каб не было пуста, трэба сеяць густа.

Калі сыраежкі з'явіліся раней белых грыбоў, «ураджаю» ў лесе грыбніку не сабраць.

Калі воблакі ў небе выцягваюцца, то надвор'е будзе ветранае.

Калі многа мошак летам, грыбны год будзе.

Калі мята цвіце позна, будзе мёду шмат.

Калі ліпень сухім выдаўся, не чакай белых грыбоў.

Калі ваўнянкі з'явіліся раней рыжыкаў, год негрыбны будзе.

Калі месяц у хмару белы рог уткнуў — будзе добрае жыта ды й мука і сіта.

Калі суніца чырванее, не сей проса — не паспее.

Калі жыта красуе, а дождж ідзе — колас пустым будзе.

Калі суніца красна, не сей аўса.

Калі першы снег мокры і шчыльны — да мокрага лета, а сухі і лёгкі — да сухога.

Калі ў полі гук ясна, выразна раздаецца, чакай дажджу.

Каласавікі збярэш пасля таго, як жыта зацвіце.

Калі ў ячменя лісты пачынаюць у трубачку скручвацца, а вусы даўжэюць, то такі ячмень ураджайны.

Калі рабіна красуе позна — восень будзе доўгай, цёплай і грыбной.

Кусаюцца пчолы — на дождж.

Капусту трэба садзіць, калі каля месяца няма круга і калі неба трохі хмарнае: тады яе не будзе тачыць тля.

Каса любіць сала.

Калі год мёдны, ён і хлебны.

Лежабоку сонца не ў пару ўзыходзіць.

Лепшы клёў рыбы супадае з цвіценнем чаромхі.

Мёд і грэчка — брат і сястра.

Месячная ноч — як непагодны дзень.

Многа шышак на елках — да ўраджаю жыта, аўса, пшаніцы, на хвоях — на ўраджай ячменю.

Мноства ягад летам прадказвае халодную зіму.

Мноства ружаў прадказвае зіму з мяцеліцамі.

Шчодрая раса — на ўраджай агуркоў.

Моцна парыць — на навальніцу.

Нечаканы рост грыбоў прадказвае дождж.

На ствалах хвой і елак смала часцей выступае з паўднёвага боку.

На ствалах бяроз чорных пятнаў больш з паўночнага боку.

На дрэвах, асабліва каля карэння, моху больш з паўночнага боку.

Не сунь носа ў чужое проса.

На маладым месяцы рыба добра клюе.

Надвор'е краснае, ды думкі чорныя.

Не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць сягоння.

Нікому свайго розуму не ўставіш.

Позныя грыбы — позны снег.

Півоня распусцілася — можна садзіць агуркі, гарбузы, бабы.

Пчаляр ды доктар і ў лесе не памруць.

Пярун б'е па высокаму дрэву.

Ранні снег — да ранняй вясны.

Растуць у лесе чырвоныя мухаморы — значыць, будуць яшчэ расці і добрыя грыбы.

Ранішняя зорка прыгажэй за вячэрнюю.

Ранішні іней сыпле жэмчугам.

Рыбы многа — хлеба мала.

Рыбак дажджу не баіцца.

Сяўба на малады месяц — да ўраджаю.

Сіверка (паўночны вецер) летам падзьме — чакай дажджу.

Саланіну пра запас рыхтуюць да новага месяца.

Сама птушка ў рукі не ўскочыць.

Сонейка нас не чакае.

Снег доўга не выпадае — да неўраджайнага года.

Сказаць лёгка, ды зрабіць цяжка.

Спіна баліць — добрае надвор'е будзе.

Спех — людзям смех.

Снегу надзьме — хлеба прыбудзе, а вада разальецца — сена набярэцца.

Сеяць можна да той пары, пакуль цвіце чаромха.

Сей ячмень, як каліна ў кругу.

Сей ячмень, як загудзе сляпень.

Той не грыбнік, хто ў лесе з другімі грыбнікамі пераклікаецца.

Умеў памыліцца, умей і паправіцца.

У адзінокіх дрэў сукі цягнуцца на поўдзень.

У лесе паспяшыш — людзей насмяшыш.

У поўню парэз ці рана не скора зажываюць.

У поўню сеяць — чэрві з'ядуць.

У першай палове мая заўсёды магчыма вяртанне халадоў з замаразкамі на глебе.

У поўню не паказвай месяцу пустога кашалька — ён і надалей пустым будзе.

Хто ветру служыць, таму дымам плацяць.

Хто сее грэчку, той кашу есць.

Хто сее, той збірае.

Хто не сее, той жаць не мае чаго.

Чырвоным сонейка ўзыходзіць, але якім зойдзе?

Чорных трэшчын на кары дрэў больш з паўночнага боку.

Чым гусцей усыпаны ягадамі гронкі агрэсту і смародзіны, тым горшы ўраджай яравых будзе.

Часу дома не выбераш, надвор'е не заўсёды ўгадаеш.

Часнок — цыбульчын браток.

Шалупінне ў цыбулі тонкае — зіма мяккая, а калі тоўстае і грубае — зіма суровая будзе.

Што пасееш, тое і вырасце.

Ягады і фрукты раней чырванеюць з паўднёвага боку.

Як сеецца, так і веецца.

Ясны дзень з вялікай расой — добры ўраджай агуркоў будзе.

Як робіш, так і маеш.

Яму аб'едзь, а п'янага абыдзі.

# 3. ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ



## СТУДЗЕНЬ

*1 студзеня* — Першы дзень Новага каляндарнага года. Новы год — адно з самых любімых святаў у народзе: ставяць навагоднюю ёлку, упрыгожваюць яе, рыхтуюць падарункі, чакаюць у госці Дзеда Мароза і Снягурачку.

Дзень памяці Ільі Мурамца. Патрэбна было пакланіцца дому бацькоўскаму, зямлі роднай.

Народжанаму ў гэты дзень давяралі людзі суд весці.

Хадзіце, людцы, сонейка сустракаць, мароз праганяць. Студзень сячэ ды марозіць, а селянін з лесу дровы возіць. Дровы на студзеньскія маразы гараць з трэскам. Туманы перад Новым годам — на ўраджай; зоркавая ноч — на багатае летняе поле. Яснае надвор'е ў гэты дзень абяцае добры ўраджай ільну, а калі ў гэты дзень іней, то летам саломы будзе больш, чым зерня.

На Новы год моцны мароз і малы сняжок — на ўраджай хлеба, а калі цёпла і снегу няма — неўраджай можа быць. Сыплюцца снежныя крупы — увесь тыдзень можа быць марозным. Калі ў гэты дзень туманны круг вакол сонца, хмары ідуць супраць ветру і певень цягне хвост па зямлі, то прыйдуць снегапады і мяцеліцы. Аднак калі ноччу іней, то днём снегу не будзе.

І яшчэ адна навагодняя прыкмета: на галінках дрэў многа снегу — летам ні грыбоў, ні ягад не знойдзеце.

*2 студзеня* — Дзень Ігнація Баганосца. У даўнія

гады яго ікону абносілі вакол вёскі, малебен служылі.

Яблыневы дзень. Патрэбна стрэсці з яблынь іней і снег, каб быў ураджай. На марозе і Ігнат-старац з падскокам ідзе. Дом весці — не лейцамі трэсці.

*3 студзеня* — Дзень Пятра-паўкорма. Палова зімніх запасаў ужо з'едзена.

Мужык-свавольнік працуе і ў свята, каб невядомая сіла з зерня сокі не выцягнула.

Да гэтага дня снегу надзьме — хлеба прыбудзе; вада разальецца — летам сена набяруць. Калі гэты дзень сухі, марозны і вада ў рэках вельмі ўбывае — чакай сухога і гарачага лета.

Студзень трашчыць — лёд на рацэ ў просінь фарбуе.

*4 студзеня* — Настасся ўзоры шые. Настасся-узорашвейка — ахоўніца цяжарных. Думалі ў гэты дзень аб родзе-племені сваім, славілі маці. Кашу рыхтавалі, кармілі тых жанчын, якія павінны былі неўзабаве раджаць — каб прадухіліць ад выкідышу і каб нарадзілася здаровае дзіця.

*5 студзеня* — Зберагание дамашняй жывёлы і птушак. Адганялі духаў нячыстых ад людзей і жывёлы. Пяклі пячэнне абрадавае: авечачак, козачак, каровак — масляных галовак, птушак. Гаварылі над імі замовы, заклінанні.

*6 студзеня* — Пярэдадзень Каляд. Мяркуюць, што «каляды» — значыць «ко ладу», г. зн. «да ладу», і прымаюць гэта слова за назву асобнага язычніцкага бажаства.

Свят-вечар. Яго праводзяць не еўшы да першай зоркі. Вечарам, напярэдадні Каляд, па старому звычаю, праваслаўныя не парушалі паста: па царкоўнаму статуту ў гэты вечар дазвалялася «сачыва» — ячменны ўзвар з мёдам, аладкі мядовыя, пірагі скаромныя ды яшчэ 9 скаромных страў (верашчака, аўсяны кісель, квас з грыбамі і селядцом, блінцы аўсяныя і г. д.). Гэта апошні дзень шасцітыднёвага Піліпаўскага (не строгага) пасту.

Куцця — гэта каша з пшанічных ці ячменных

круп. Для варкі куцці ва ўсе прызначаныя дні ўжываецца адзін і той жа гаршчок, прычым крупы сыплюць у яго ў строга пэўнай колькасці (гэта неабходна для калядных варожбаў). Куццю гатуюць з раніцы. У час варкі яе не толькі не каштуюць, але нават і не перамешваюць. Вечарам, перад захадам сонца, звараная куцця ставіцца ў сена на покуці. Абразы святых упрыгожваюцца жытнімі ці ячменнымі каласамі. На стале ляжыць сена, паверх яго — чысты абрус. Некаторыя гаспадары для большай урачыстасці замест лямпы запальвалі на куццю свечкі свайго вырабу. Абрадам куцці кіруе старэйшы член сям'і — дзед, бацька. Перш чым пачаць есці куццю, гаспадар звяртаецца да акна, якое бывае ў асноўным замёрзлым, заве мароза на куццю, каб ён летам не марозіў ячмень: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці! Цяпер твая пара, хадзі, марозька. А летам не хадзі, пад калодай сядзі, бо конюхі баронамі задзяруць, а пастухі пужкамі засякуць. Хадзі, марозька, куцця смачная, з канапелькамі!» Калі на другі дзень мароз аслабее, гавораць: «Мароз паеў куцці і паласкавеў». А калі зробіцца мацнейшым, гавораць: «Разгневаўся марозе...»

Гаспадыня на куццю звала мароз, каб не марозіў расаду, гарбузы, моркву, падсохлы вяршок куцці знімала, давала курам, «каб добра яйкі неслі».

З куццёй звязана многа прыкмет, звычаяў, варожбаў. Вось адна з іх: Дзяўчаты з-пад абруса выцягвалі некалькі травінак і на іх гадалі, які лён уродзіцца — чыя травінка будзе даўжэйшая, у той лён будзе лепшы; выцягвалі са снапа колас і глядзелі, каб ён быў поўным, тады і наступны год павінен быць ураджайным. Была і такая варажба: Калі куцця «вылазіла» з гаршка, ці гаршчок аказваўся надтрэснутым, ці каша была белая і дробная, лічылі, што бяда будзе. Калі ж гаршчок быў поўны і куцця была пышная, лічылі, што будзе ўдача і шчасце. Яшчэ: хлопцы ўначы абносяць барану вакол вёскі, каб ніводная дзяўчына ў чужую вёску замуж не выйшла.

Пачыналіся зімнія святкі, з 7 па 14 студзеня —

святыя вечары. Моцныя халады ў гэтыя дні прадказваюць добры ўраджай. Млечны Шлях на небе — да добрай пагоды. Калі ў гэтую ноч многа зорак, летам будзе многа грыбоў і чарніц; калі зоркі рэдкія, то багатага збору пладоў не будзе. Калі пасля полудня снег — будуць раіцца пчолы. Калі ў «куццёвую» ноч неба зорнае — будзе багаты прыплод жывёлы, добры ўраджай гароху. За колькі дзён да куцці выпадзе іней, за столькі дзён да Іванава дня (21 мая) надвор'е будзе спрыяць пачатку веснавой сяўбы. І яшчэ звычай, які не цяжка аднавіць і ў нашы дні,— ставіць на акно запаленую свечку. Сэнс у тым, што ў кожным доме гатовы былі даць начлег гнаным у гэту ноч на зары гісторыі Хрыстовай з усіх месц цяжарнай Марыі і Іосіфу. Гасподзь нарадзіўся для выратавання ўсіх!

*7 студзеня* — Каляда. У народзе ёсць павер'е, што ў самую поўнач на Каляду нябесныя вароты расчыняюцца і з вышыні на зямлю сыходзіць сам Бог-сын. Калядаванне. «Пайшла Каляда па снезе і лёдзе, рассыпалася Каляда па народзе».

Пайшла Каляда калядуючы,
За ёю дзеўкі ды жабруючы.
Адна просіць, другая носіць,
Пакінь прасіць, цяжка насіць.
Перайшла сяльцо — дастала яйцо,
Перайшла другое — згубіла і тое,
Перайшла трэцяе — загінула сама.
Вось і Каляда.

*З народнай творчасці*

Прыходзяць вечарынкі, моладзь шчадруе, займаецца гаданнямі. Кожнаму хочацца зазірнуць у будучыню. Дзяўчаты, напрыклад, любілі такое гаданне: у хаце сыпалі на дошку зерне, побач клалі кавалачкі гліны, налівалі ў талерачку вады, побач ставілі люстэрка. Упускалі ў хату пеўня і назіралі за ім. Калі ён кляваў зерне, значыць, дзяўчыне быў суджаны багаты жаніх; калі падыходзіў да гліны —

спадарожніцай магла бяда быць; калі певень піў ваду — муж мог аказацца п'яніцам, а калі падыходзіў да люстэрка — яшчэ горш: муж мог аказацца і гулякам. Ці такія варожбы:

Перад сном кладуць пад падушку рэшткі ежы і запрашаюць прыйсці жаніха на вячэру. Мужчына, які прысніцца, і будзе жаніхом.

Носяць дровы ў хату, а пасля падлічваюць, ці цотная (цот), ці няцотная (лішка) колькасць пален прынесена. Цот прадракае жаніха-хлопца, а лішка — удаўца.

Калі на Каляду цёпла — вясна будзе халодная. Калі дарога чорная — ураджай на грэчку будзе. На Каляду сонца гуляе. На Каляду іней — да ўраджаю на хлеб, снег — на ўраджай арэхаў. Снег глыбокі — год добры. Мяцеліца — будзе шмат мёду, зорная ноч — ураджай гароху будзе. Калі ў гэты дзень снежны буран — у час жніва можа быць макрата і гразь, але пчолы будуць добра раіцца. Калі ж ідзе дождж ці мокры снег, сенакос дажджлівы будзе. Капеж са стрэх на Каляду — восень гнілая будзе, бульба можа вымакнуць. Якое надвор'е пасля Каляды, такое ж будзе і пасля Пятрова дня (12 ліпеня). Ад Каляды да Вадохрышча паляваннем займацца нельга — грэх. З паляўнічым няшчасце можа здарыцца. У час каляднай вячэры спяшаюцца з ядой, каб летам хутчэй выконваць палявыя работы. Цёмныя святкі — малочныя каровы, светлыя — носкія куры. На Каляду пяклі пірог з журавінамі. І такое людское павер'е: каб багатым быў ураджай грэчкі, у калядны дзень патрэбна было адзець святочную сарочку і не знімаць яе ўсе святы — да самага Вадохрышча.

Пачатак зімовых вяселляў.

*8 студзеня* — Бабіны — калядны дзень гасцявання ў бабуль. Святкуецца Сабор Прасвятой Багародзіцы, гэта значыць, памяць самой Марыі. Таксама дзень памяці святога цара і прарока Давіда. Царква славіць Давіда не за перамогу яго над Галіяфам, а за перамогу над сабой: Давід і саграшыў і пакаяўся

ўражліва. Ен аўтар вядомых пакаянных песень-псалмаў. У славянскіх народаў нашай краіны склалася такая прымаўка: «Да-давідаўску грашым, ды не па-давідаўску каемся».

Свята павівальных бабак і парадзіх.

Калі гэты дзень ясны будзе, то будзе добры ўраджай проса, а калі пахмурны, то неўраджай на яго будзе.

*9 студзеня* — Працягваліся маладзёжныя вечарыны. Сцяпан марозныя калы чэша. Дзень найма парабкаў: «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

*10 студзеня* — Дамачадцаў дзень.

Баю-баю, люлюшкі!
Прыляцелі гулюшкі,
Садзіліся ў люлюшкі.
Яны сталі гаркуваць,
Малютачку калыхаць.
Ля коціка варката,
На малютку сон-драмата.
Ты спі, ляжы, малютка!
Прыйдзі, коцік, начаваць,
Малютачку калыхаць.
Ішоў коцік па лаўкі,
Нёс малютку баранкі,
Ішоў коцік з замор'я,
Нёс малютку здароў'я.

*З дзіцячага фальклору*

*11 студзеня* — Гэты дзень прысвячаецца памяці нованароджаных. Нячыстая сіла становіцца больш жорсткай. Падпальвалі колікі, каб згарэлі да попелу хворы і перапалохі. Агароджвалі хаты і двары ад наведвання нячыстай сілы, ставілі вуглём ці мелам над дзвярамі і вокнамі знак крыжа. У хлебныя засекі ставілі драўляныя крыжы з лучыны.

*12 студзеня* — Анісся-жывотніца. Паразуха — рэзалі свіней, рыхтавалі трыбухі з кашай і мясам. Імяніны Аркадзя і Бенядзікта.

*13 студзеня* — Маланння. Шчодры вечар. Багатая куцця. Гаданні. Дзяўчаты загадвалі на жаніхоў, як у такім гаданні: «Дзяўчаты бяруць першы спечаны блін, вымятаюць хату, смецце кладуць на засланку і нясуць на сметнік. Там становяцца на засланку са смеццем, ядуць блін і ў гэты час прыслухоўваюцца, дзе брэшуць сабакі: з якога боку брэшуць, адтуль і жаніхі прыедуць». Ці яшчэ: Льюць растопленае волава ці воск ў халодную ваду і па фігуры, якая ўтварылася з іх, мяркуюць пра жаніха. У гэтай варажбе галоўнае — фантазія: дастаткова найменшага падабенства злітка з якім-небудзь прадметам са штодзённага жыцця, каб зрабіць па ім заключэнне. Так, шабля прадказвае жаніха-салдата, кола — грошы і г. д. Пры гаданнях выкарыстоўваліся загаворы (прыварожкі, прысушкі, любжы, адсушкі, астуды). Вось адзін з іх, прыварожны: «Пайду я, раба божая, пад акіян-мора, стану каля краю мора. Бачу я — стаіць дуб, ад веку пасаджаны, ад веку пароджаны. Абгараджу яго жалезным тынам, жалезнымі варотамі. Пад тым тынам жалезным, варотамі ляжыць злая самаверніца, рассылае чырвоных дзевак на шаўковыя лугі, каб нылі аба мне іх жылкі-паджылкі, гарачае сэрца, амінь».

Пяклі грачаны блінок не на ўсякі раток.

Дзень прыбывае на курыны крок. Калі ў гэтую ноч вецер дзьме з поўдня — лета будзе гарачым.

*14 студзеня* — Васіль Вялікі. Лічыўся апекуном свінаводства, захавальнікам садоў ад чарвякоў. Таму ў гэты дзень зноў абтрасалі яблыні ад снегу. Васілёў вечар. «Шчодрая» куцця. Да яе прымеркаваны розныя абрады і звычаі, якія ў розных месцах праходзілі па-рознаму. Гэты вечар — шчодры і багаты; кожнаму хацелася радавацца ў Новым годзе. Гаспадыні да гэтага вечара рыхтавалі многа смачнай ежы, у некаторых месцах — абавязкова свіныя галовы. «Свінку ды парсючка выдай да Васільева вечарка». Таксама варылі парасячыя ножкі, каб ногі ў людзей не балелі.

Гаданні ў самым разгары. Вось адно з іх: Бяруцца

тры пасудзіны, пад адну кладзецца хлеб, пад другую — шчотка, а пад трэцюю — пярсцёнак. Адной з прысутных дзяўчат (нявесце) завязваюць вочы: яна павінна падысці да адной з пасудзін і ўзяць з яе пакладзеную туды рэч. Калі выпадзе пасудзіна, пад якой знаходзіцца пярсцёнак, то ёй давядзецца выйсці замуж за малайца, калі возьме пасудзіну з хлебам — выйдзе за багатага і, нарэшце, у апошнім выпадку ў жаніхі нявеста будзе чакаць удаўца. У сялян такое гаданне было: У поўнач яны выходзілі на гумно, у хлеў, лажыліся на сена і слухалі: да ўраджайнага года чуўся шум, да неўраджайнага — ціха было.

Калі ў гэты дзень туман — ураджай чакаўся. Васілёва ноч зоркавая — лета ягаднае. Мяцеліца ў Васілёў вечар — неўраджай арэхаў.

*15 студзеня* — Сільвестр. На Сільвестра — курынае свята. Петушынае пяро вее радасць на сяло. Чысцяць куратнікі, рамантуюць насесты, абкурваюць сцены.

*16 студзеня* — Дзень прарока Малахія. Звалі знахароў, каб вылячыць хворых. Абглядалі кароў, таму што ў гэты дзень, паводле падання, ведзьмы, якія вяртаюцца з гуляння, задойваюць кароў да смерці, хочуць напаіць невядомую сілу.

*17 студзеня* — Феакцістаў дзень. Вясковая думка раіла: «На Феакціста зашываць у ладанку чартапалох-траву і насіць на шыі ля крыжыка для зберажэння ад страты. Хто хоча быць цэлым у дарозе, той павінен запасціся гэтым травяным зеллем».

Снег глыбокі — хлеб добры. Неба з поўным месяцам — да бурнай паводкі. У гэты дзень гоняць чорта з вёскі.

*18 студзеня* — Вадзяная Каляда. Піскуха — завяршальны дзень Каляд, Шчодрага тыдня. Трэцяя, або галодная ваданосная куцця, вадзянка. Апанас — апякун жывёлы.

*19 студзеня* — Вадохрышча. 18 студзеня, напярэдадні, трэцяя, вадохрышчанская куцця. Галодная — гэты дзень беларус посціць.

У дзень Вадохрышча ўсе прытрымліваюцца стро-


Святкі

гага посту да таго часу, пакуль не прынясуць з царквы свянцонай вады і пакуль кожны член сям'і не вып'е яе крыху. Частка гэтай вады звычайна наліваецца ў бутэльку і захоўваецца цэлы год. Ёй акрапляюць саху і валоў, калі першы раз выязджаюць у поле араць, а таксама кароў і авечак пры першым выгане іх у поле. Другі, вадохрышчанскі сачэўнік. Галоўны дзень святочных гаданняў. У гэты дзень збіралі вадохрышчанскі снег для адбельвання ільняных абрусаў, а таксама ад розных хвароб, над вадой з гэтага снегу чыняць замовы. Богаяўлянне. Іярдань.

З вадохрышчаскімі святамі звязана шмат павер'яў, якія адносяцца да лёсу чалавека. Вось адно з іх: «Калі хто-небудзь быў ахрышчаны ў гэты дзень, таму наканавана быць шчаслівым на ўсё жыццё».

Дзявочыя агледзіны. У гэты дзень дзяўчаты адзяваюць сваю лепшую вопратку. Беляцца і румяняцца, прыхарошваюцца.

На Вялікай і Белай Русі народ адзначаў тры маразы: хрышчэнскія (вадохрышчанскія і вадасвецція), афанасьеўскія (каля 31 студзеня); срэценскія (15 лютага). Калі хрышчэнскія маразы бяруць верх над каляднымі і срэценскімі, то ўвесь год ураджайным будзе.

Казалі: на Вадохрышча адліга — да ўраджаю. Мяцеліца ў гэты дзень — і паехалі мяцеліцы да канца зімы. Яснае і халоднае надвор'е — да засушлівага лета, пахмурнае і снежнае — на добры ўраджай. Дзень цёплы — хлеб будзе цёмны (густы), аднак на капусце многа чарвякоў будзе. Снег падае камякамі і зоркі моцна блішчаць — да ўраджаю, яснай і доўгай восені. Зоркавая ноч перад Вадохрышчам — добры ўраджай ягад будзе. Калі неба ўсюды пахмурнае, то ўсякаму хлебу кожны будзе рады; калі толькі на адным усходнім баку, то будзе добры ўраджай жыта, на заходнім — аўса, на паўднёвым — проса, на паўночным — грэчкі. Калі палонка на рацэ да краёў вадой запоўнілася — чакай вялікай веснавой паводкі.

*20 студзеня* — Іван-бражнік усе святы павёў за

сабой. Запівалі зло, каб слёз не было. Перазім'е аб вясне вестачку дае.

Сонца ўступае ў сузор'е Вадаліва. Па гараскопу Вадаліў — знак задыяка тых, хто нарадзіўся ў перыяд ад гэтага дня да 19 лютага. Ваш сімвал — паветра, планета — Сатурн, талісман — ключ, камень — аметыст.



*21 студзеня* — Дзень Георгія, Емяльяна, Рыгора. У народзе гэты дзень празвалі «Па абед Каляда», яшчэ «Адпусціцель». Гаварылі што да абеду Каляда, а пасля Адпусціцель. Провады Каляд: нібы канчаткова развіталіся з калstriaднымі святамі. Да абеду не працавалі, а пасля поўдня ўжо браліся за адкладзеныя справы. Калядныя святы закончыліся, на нейкі час у каляндарнай абраднасці надыходзіў зацішак.

У гэты дзень назіраюць за ветрам: калі на Емяльяна задзьме з Кіева (з поўдня) — быць «лету грознаму», навальнічнаму.

У праваслаўнай царкве ў гэты дзень адзначаецца памяць свяшчэннамучаніка Ісідара Прасвітара і з ім сямідзесяці двух мучанікаў, у Юр'еве Ліфляндскім замучаных. Свяшчэннік Ісідар служыў у Нікольскім храме старажытнага, заснаванага яшчэ Яраславам Мудрым, рускага горада Юр'ева на рацэ Омжы. У той час горад знаходзіўся пад уладай лівонскіх рыцараў-мечаносцаў, захапіўшых яго ў XIII ст. і назваўшых Дэрптам (цяпер Тарту). Згодна дагавору з вялікім князем Маскоўскім Іаанам III, рыцары павінны былі ахоўваць жыццё праваслаўных і не перашкаджаць ім у выкананні царкоўных абрадаў. Але фанатычныя рыцары-каталікі пажадалі пера-

весці ў сваю веру праваслаўных. Тыя ж выбралі смерць, але не адмовіліся ад веры бацькоў. Свяшчэннік Ісідар і яго прыхаджане былі схоплены ў час хрэснага ходу ў дзень Хрышчэння Гасподняга і ўтоплены ў рацэ.

*22 студзеня* — Дзень Філіпа, Вінцэнта. Праваслаўнай царквой адзначаецца як дзень памяці Філіпа Святіцеля, мітрапаліта Маскоўскага Святы Філіп, у міру Феадор, нарадзіўся ў сям'і баярына Сцяпана Колычава. Вялікі князь Маскоўскі, Васіль III наблізіў да двара маладога Феадора, якога, аднак, не зусім вабіла прыдворнае жыццё. У 1537 г. ён патаемна пакінуў Маскву і некаторы час хаваўся ў вёсцы Кіжы, каля Анежскага возера. Потым пад імем Філіп жыў у Салавецкім манастыры, дзе быў падстрыжаны ў манахі. Неўзабаве пра яго ўспомніў цар Іван Грозны, які з дзяцінства любіў Феадора. Цар спадзяваўся, што ў асобе Свяціцеля ён знойдзе вернага спадзвіжніка, духоўніка і дарадчыка, які дапаможа ўціхамірыць Баярскую думу. У жніўні 1566 года Філіп узначаліў Рускую Царкву. Восенню 1567 года цар жорстка расправіўся з удзельнікамі баярскай змовы, праліўшы шмат крыві. Свяціцель Філіп выступіў супраць пакарання смерцю, наклікаўшы на сябе гнеў Грознага. Ён быў арыштаваны і 23 снежня 1569 года быў закатаваны Малютай Скуратавым.

*23 студзеня* — Дзень Рыгора, Макара, Паўла. У гэты дзень бывае моцны вецер. Калі выпадзе шэрань — год будзе мокры. Іней на стагах — да мокрага лета. Дрэвы ў інеі — неба будзе сіняе. Выходзяць у гэты дзень паглядзець на стагі сена і хлебныя сцірты і калі ўбачаць на іх іней, значыць, будзе шэрае, мокрае лета.

*24 студзеня* — Дзень Міхаіла, Фядоса, Францішка. Калі ў гэты дзень цёпла — вясна будзе ранняя. Як правіла, дзень гэты не бывае асабліва марозным, і, «аберагаючы» яго, Фядос-вясняк папярэджвае: кволая зіма — жывучая, цёплыя дні студзеня нядобрым адзываюцца, бойся студзеньскай вясны.

*25 студзеня* — Таццянін дзень. Бабін кут. Па на-

роднаму слову: «На Таццяну прагляне сонейка рана — да ранняга прылёту птушак». Калі ў гэты дзень снег ідзе, лета дажджлівым будзе.

*26 студзеня* — Ярома на печцы, а кошка ў пячурцы. Калі кошка на печы клубком скруцілася — мароз ударыць, калі сцяну дзярэ — непагода ля варот. Першае «ці-ці-фі» вялікай сініцы прадказвае раннюю вясну.

*27 студзеня* — На Прохара ажыццяўлялі абрад жывёлы, веялі і чысцілі хлеб.

*28 студзеня* — Як вецер, год сыры будзе. Пётр і Павел — дзень прыбавіў. Ноч зоркавая — да ўраджаю ільну, а вецер прадказвае мокры год.

*29 студзеня* — Пётра-паўкармоў. «Пётра-паўкорма — выйшла палова зімняга корму». Палова запасаў зерня і сена зрасходавана, а яшчэ трэба пражыць палавіну зімы.

*30 студзеня* — Антоній-перазімнік, бывае і цёплае надвор'е. Перазімнік абнадзеіць, абагрэе, а потым абмане — усё марозам стане.

*31 студзеня* — Афанасій-ламанос.— Мае цягу да марозу. Афанасьеўскія маразы. «Прыйшоў Афанасій-ламанос — беражы шчокі і нос». Самыя моцныя маразы. Калі ў гэты дзень мяцеліцы ці бураны — да позняй восені гэта. У поўдзень сонца — вясна будзе ранняя.

## ЛЮТЫ

*1 лютага* — Дзень Макара Вялікага, праведніка Фёдара Наўгародскага. Макараў дзень. Макар-ясны, Макар-вяснаўказчык. Калі надвор'е яснае — чакай раннюю вясну, калі са стрэх капае — вер у вясну раннюю. Якое надвор'е першага лютаўскага дня, такі і ўвесь люты будзе. І яшчэ. Калі першага лютага на небе многа зорак, то зіма яшчэ доўга працягнецца.

*2 лютага* — Яфім. У поўдзень сонца — да ранняй вясны. Другі дзень лютага вясну паказвае: сонечна — на чырвоную вясну, пахмурна — чакай позніх мяцеліц. А калі мяцеліца на Яфіма — уся Масленіца (8—13 сакавіка) будзе мяцельнай.

*3 лютага* — Агнія. Ясная зорка — на мароз. Памяць Максіма Грэка.

*4 лютага* — Цімафей-паўзімнік. Пачатак лютаўскіх мяцеліц — едзеваспані марозная.

*5 лютага* — Генадзь. Сабор кастрамскіх святых.

*6 лютага* — Аксіння-паўзімніца, паўхлебніца. «Палавінны тэрмін ад старога хлеба да новага». Пералом зімы. Пачынаўся ў сялян цяжкі час — час зыходу запасаў, небяспека голаду: у большасці выпадкаў сялянам не хапала хлеба да вясны. Народ так выказваўся: «Паўзімніца напалавіну, але не роўна дзеліць зіму; да вясны селяніну цяжэй». Веснаўказчык: надвор'е яснае — вясна красная. Які гэты дзень, такая і вясна.

*7 лютага* — Рыгор-багаслоў Канстанцінопальскі.

*9 лютага* — Дзень Іаана Златауста.

*10 лютага* — Яфрэм-ветрадуй. Калі вецер, то лета будзе мокрае і халоднае.

*11 лютага* — Ігнат. Пачатак маслянага тыдня.

*12 лютага* — Іпаліт прыносіць вялікія снежныя камякі і пацяпленне.

*13 лютага* — Апанас, Мікіта.

*14 лютага* — Трыфан-перазімнік. «На Трыфана зорна — вясна будзе позна». «Зорак многа — к вясне доўгая дарога». Перадсвяткі Стрэчання.

*15 лютага* — Стрэчанне. На Белай Русі свята вядома пад назвай Грамніц. Ёсць такі звычай: у гэты дзень у царкву для асвяшчэння носяць свечкі, якія называюцца грамнічнымі. Грамніцы — дзень сустрэчы зімы з летам. Пелі песню: «А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне, зіма з летам стрэлася, стрэлася...».

На Стрэчанне зіма на мароз ідзе, а сонца на лета. Вясна з зімой сустрэліся, а кафтан з кажухом. На Стрэчанне снег праз дарогу нясе — вясна будзе позняя і халодная, а калі ў гэты дзень цёпла — вясна ранняя і цёплая. «На Стрэчанне сняжок — вясной дожджык». Прагляне сонца скрозь хмары — на цяпло, а не прагляне — чакай моцных марозаў.

«На Стрэчанне зіма з летам сустрэлася і


Стрэчанне

з дарогі не зварочвае, а лета яе ў зубы б'е: зубы трашчаць, дзеці, збіраючы іх, пішчаць» (гэта значыць, ледзяшы са стрэх павіслі). «Раніцай на Стрэчанне выпадзе снег — трэба чакаць ранняга ўраджаю; у поўдзень — сярэдняга; да вечара — позняга». Аб стрэчанскіх прыкметах памяталі, рыхтуючыся да вясны: адліга ўстанавілася — вясна цёплая; халады завернуць — халодная будзе; капеж на Стрэчанне прадказваў ураджай пшаніцы. Вецер у гэты дзень здзімаў з дрэваў усякую нечысць і абяцаў добры ўраджай фруктаў. Калі Стрэчанне ціхае і яснае, можна чакаць добрага ўраджаю ільну. Каб дазнацца, які ў новым годзе будзе па цане корм — дарагі ці не,— кідалі палку: калі снег замяце яе, корм будзе дрэнны і дарагі. І яшчэ. У гэты дзень пачыналі адкормліваць племянных птушак, карміць іх аўсом, сцвярджаючы: «Кармі ў Стрэчанне курэй аўсом — вясной і летам будзеш з яйцом».

*16 лютага* — Ганна-прарочніца. Вяршыліся абрады шанавання дамавіка (своеасаблівы захавальнік хаты — дзед, гаспадар, хатнік, дваровы і г. д.), захоўваючы хату ад усякіх непрыемнасцей).

*17 лютага* — Мікола-сцюдзёны. Рэдка калі на Белай Русі не было сцюдзёных марозаў. Воўчае свята, макавы захад. Усяленская бацькоўская субота.

*18 лютага* — Агата. («Хлеб святой Агаты не пусціць бяды да хаты»). Заступніца ад пажару. Пачатак Вялікага посту.

*19 лютага* — Вуколы-цялятнікі. Пачатак веснавога ацёлу кароў.

*20 лютага* — Парфен і Лука напамінаюць аб неабходнасці памінання продкаў.



*21 лютага* — Захар-сярпоўнік, дастаюць сярпы. Не тады ж сярпы вастрыць, як на жніво ісці.

*22 лютага* — Нічыпар, Інакенцій.

*23 лютага* — Прохар! Ой! Як сцюдзёна! Але... да цяпла паварот. Мароз бывае часцей толькі ноччу.

*24 лютага* — «Улас — рог збівай з зімы!» Казалі, што каля Уласа павінна быць сем марозаў: тры да Уласа, адзін на Уласа і тры пасля яго. «Каровіна і конскае свята». У Уласа барада ў масле. «Святы Улас, дай здароўечка цяляці!» У гэты дзень акрапляюць свянцонай вадой хлеў, коней, кароў, адганяючы ад іх нячыстую сілу. Ласі скідаюць рогі.

*25 лютага* — Аляксей. Выстаўлялі на мароз зерне, што прызначалася для высеву, гаварылі, што пацягнутае марозам насенне дае лепшы ўраджай. Тады ж на мароз выстаўлялі пражу — «Пазарніш пражу пасля Уласа, будзеш з грашыма на масленіцу».

*26 лютага* — Дзень Зоі. Фацiння — заступніца ад ліхаманак, трасцы.

*28 лютага* — Анісім-аўчарнік. Аклікаюць зоркі, каб авечкі ягніліся. Зімабор.

*29 лютага* — Касьянаў дзень. Існуе такое паданне наконт гэтага свята: Ішлі па зямлі святы Касьян і Мікола-цудатворац. І на Касьяну была «адзежа ўся залатая ды з бліскучых каменняў». І ўбачылі яны, што моцна загразла кабыла — вось-вось задыхнецца. Мікола і кажа Касьяну: «Пойдзем выцягнем кабылу, бедалагі. У яго ўсё багацце, што гэта кабыла! Але Касьян не захацеў мазацца ў гразь, і Мікола адзін аказаў бедняку дапамогу, вымазаўшыся у гразь. І прыйшлі яны да Бога. І спытаў Бог Міколу, дзе ён так вымазаўся у гразь, напэўна, п'яны быў? Расказаў Мікола аб тым, што адбылося. І сказаў тады Бог: «... за тое, што ты (Мікола — А. Р.) дабро зрабіў чалавеку, я табе вызначаю два святы ў адным годзе: адно вясной, а другое зімой! А Касьяну выказаў: «А табе за тое, што ты і сам нічога не рабіў і Міколу старому не дапамог, я назначаю свята адзін раз праз тры гады на чацвёрты, высакосны, год!»

У народзе дзень Касьяна лічыўся днём злой сілы. Паводле Даля, Касьян зайздросны, злапамятны, скупы, нялітасцівы. «Касьян на што ні гляне — усё вяне», «Касьян на народ — народу цяжка». «Касьян на траву — трава сохне». «Касьян на скаціну — скаціна дохне». «Касьян на скаціну гляне — скаціна валіцца». «Касьян на дрэва погляд кіне — дрэва сохне».

У дзень, на які прыйшоўся Касьян, усе тры гады ніякіх работ не пачынаюць, лічаць нешчаслівым днём. Згодна павер'ю, у ведаме Касьяна знаходзіцца вецер, і ён выпускае яго на зямлю і насылае мор на людзей і скаціну. Гаварылі: «Касьян лютуй, не лютуй, а на вясну бровы не хмур».

## САКАВІК

*1 сакавіка* — Першы дзень вясны. Бог урадлівасці Ярыла ўздзяе зіму на вілу. Каляндарны дзень нараджэння вясны снежнай. У гэты дзень маці пасылалі дзяцей расчысціць масткі, дарожкі да студні, калі ноччу быў снег. Цяжарныя жанчыны выходзілі на ўзгоркі, глядзелі на ўзыходзячае сонца. Спадзяваліся, што першасакавіцкае сонца дасць сілы ненароджанаму дзіцяці... 

*2 сакавіка* — Дзень вялікамучаніка Фёдара, праведніцы Марыямны. Першы раз у годзе бачны кучавыя воблакі. Шэрая варона пачынае ладзіць сваё гняздо. Сяляне саху і барану на двор выцягвалі.

Калі шарпак на сонцы чарнеў, загніваў, але ўсё ж заставаўся моцным, то Ярыла яго пераворваў, перабараноўваў.

*3 сакавіка* — Ярыла загадваў птушцы аўсянцы пець: «Пакінь сані! Пакінь сані!» Паважалі птушку аўсянку — прадвесніцай хуткага цяпла была яна. Пяклі ў гэты дзень аўсянічку — піражкі з аўсянай мукі. Ранняя вясна — многа вады. Вылет матылькоў-крапіўнікаў.

*4 сакавіка* — Дзень апосталаў Архіпа і Філімона. Пяклі хлеб круглы, на вышытым ручніку ўверх падымалі, потым паміж сабой дзялілі, птушак абдорвалі.

*5 сакавіка* — Агафон, Агафон, зіма на зыходзе — спяшайся на санках накатацца ўдосталь. Раненька сакавік вяснянку (песню) зацягвае — на няўстойлівае цяпло. На палях з'яўляюцца раннія праталіны: «Харытонава жонка пад тынам ішла, семсот рублёў знайшла. Сталі лістаць. Вецер падзьмуў — усе грошы раскідаў».

Дзень катыш. У гэты дзень нельга было глядзець на зоркі, якія падалі ці каціліся з неба, бо можна было з жыцця скаціцца, як зорка з неба.

У гэты дзень сяляне пяклі какуркі — піражкі. І яшчэ: трэба было злаўчыцца і ўзяць у каваля агню з горна. Каваль не даваў, каб работа на ўбытак не ішла. Той, хто прынёс агонь у поле, як бы замацоўваў саюз зямлі, сахі і бараны, адганяў агнём ад нівы напасці.

*6 сакавіка* — Дзень гэты паважалі старыя людзі, называлі Цімафей-веснавей. Цімафей — вястун цёплых дзён. «Веснавей, веснавей, на сяло цяпла навей». Цяплом прывячае — цяпло вее, старых грэе. Цімафей-веснавей — ужо цяпло ля дзвярэй. І старыя з печы, з лавак падымаліся — на прызбу перабіраліся. Дзьме з поўдня вясенні вецер перамен. Вясенняе цяпло вее — старых грэе.

На Цімафея цёпла, але вясну красную яшчэ не чакаюць. Спяваюць сініцы.

*7 сакавіка* — Дзень святога Афанасія. Самы ранні прылёт гракоў, прылятаюць першыя шпакі. Грак на дрэве — вясна на двары. Ранняя песня палявога жаўранка. Жаўрук падымаецца ў неба і пяе — на цяпло.

Везлі на поле гной, пакуль шарпак быў моцны. Як сонейка прыпякло, то і гусей, і кароў гаспадыні па ранняй вясне з хлявоў выганялі. Потым насцілалі пахучай саломы, заганялі жывёлу ў вычышчаныя стойлы. Пара сеяць насенне на расаду.

*8 сакавіка* — Дзень прападобнага Аляксандра. Пара сарокам ад хат у лес выбірацца, а цецерукам выступаць з запеўкамі.

«Масляная, я да цябе іду, згубіла спадніцу — ніяк не знайду. Ехалі купцы — спадніцу знайшлі, я прасіла-галасіла — яны не аддаюць». Збірай, дзяўчына, куфры, складвай уборы. Калі на масленіцу вяселле не згулялі, сядзі, дзяўчына, да позняй вясны, да вясенніх карагодаў.

*9 сакавіка* — Іванаў і Дзмітрыеў дзень. Птушкі пяюць, гнёзды ладзяць. Сэрца мацней б'ецца, калі бачыш, як птушкі з выраю вяртаюцца. Вераб'і пішчаць — месцы для гнёздаў дзеляць. Галубы буркуюць парамі. На рэках клёў — добры ўлоў.

Жанчыны бялізну ў гэты дзень не мыюць. Згодна павер'ю, чысціня і дух гаючы ад вымытай у гэты дзень бялізны зыходзяць.

*10 сакавіка* — Тарасаў дзень (святога Тараса Канстанцінопальскага). Днём не спі, а то кумаха нападзе. Хоць па сцяне хадзі, а спаць пагадзі. Памінанне нябожчыкаў.

*11 сакавіка* — Севасцьян, Кастусь. Сярэдні тэрмін з'яўлення праталін на паўднёвых схілах. Самы позні тэрмін капяжу пры марозе. Але... Дыхне халадком — астыне і дом.

*12 сакавіка* — Пракоп-перазімнік санную дарогу рушыць. «Пракоп-дарогаразбуральнік дарогу вясне пракладзе. Завязнуў у гурбе: «Ну, што, загнаў Пракоп і цябе ў гурбу!»

У вады нос вострьі — прабівае ўсюды. Калі вясной снег сыдзе да сонечнага цяпла, пшаніца будзе добрай. Сакавік можа і пальчык адмарозіць. Пупышкі набрыняюць — вясну адчуваюць. Калі бяроза апярэдзіць лістом вольху — мокрае і халоднае лета будзе, а калі наадварот, чакай летняй засухі.

*13 сакавіка* — Васіль-капельнік. Капелькі, крапельнік, крапель — са стрэх капае. «Ледзяная накаваленька, што звон».

*14 сакавіка* — Аўдоцця (Аўдакея, Яўдока) — Падмачы-парог, зрэдку Аўдоцця-плюшчыха. Пер-

шая сустрэча вясны. Мяккія снягі плюшчыць шарпак, стагі пакрываюцца інеем. Сяляне казалі: «На небе ўжо даўно вясна, а на зямлі яе дачакацца не можам».

На Аўдоццю цёплы вецер — лета будзе мокрае. Калі вецер з поўначы — лета будзе халоднае. Калі курачка на Аўдоццю нап'ецца, то авечка на Юр'я (6 мая) наесца. На Аўдоццю холадна — жывёлу яшчэ карміць лішніх два тыдні. На Аўдоццю мароз — сакавік марозным будзе. На Аўдоццю снег — на ўраджай. Цёплы вецер — лета мокрае будзе. Сіверка — халодным лета будзе. Дождж на Аўдоццю — да мокрага лета; сонца і цяпло — да гарачага, сухога лета. Сонечная, светлая Аўдоцця — трэба чакаць добрай сенажаці. Калі на Аўдоццю дождж — будзе добры ўраджай жыта. Калі на Аўдоццю туман — добры ўраджай бабовых будзе. «На Аўдоццю пагодна — усё лета будзе прыгожае». «Якая Аўдоцця — такое і лета». Моцны мароз у гэты дзень — грэчку ў час красавання можа прымаразак прыхапіць. Калі на Аўдоццю мяцеліца — восенню голад і неўраджай можа быць.

Дзень асаблівы, яго жанчыны паважалі. Сняжыцу — талую вадзіцу — трэба было ў дом прынесці. Адціралі хваравітасць з хворых, мылі дзяцей, каб дужымі былі. Крапілі сцены, каб тыя дыхалі, мылі сталы, падлогу, кветкі палівалі, давалі зерне курам, каб добра несліся.

Жанчыны ўставалі рана і пяклі абрадавае пячэнне — «жаваранначкі». Калі цеста раскатвалі, пелі звонкую песню-вяснянку. А перад песняй цеста замаўлялі: «Па беламу, па чыстаму, па ядамолу, ад зямлі атрыманаму, па зазнобістаму, зоркамі кручанаму, каціся, бел-круты, бел-залаты».

Раскатаны піражок клалі на патэльню, падразалі крылы, уцягвалі дзюбу, журавінкі замест вачэй устаўлялі і пры гэтым зазывалі: «Кулікі-жаваранкі, ляціце ў аданкі!» Раскатваючы цеста, загадвалі на дзяцей, на саміх сябе. Выпечанае пячэнне раздавалася дзецям, каб ваду пілі, як птушкі, каб хва-

робы не ведалі, каб раслі, як трава па вясне. Дзеці адпраўляліся на ўзгоркі вясну гукаць.

Потым выказвалі згоду каля парога. Парог адгарожвае вясковую жанчыну ад людскіх абгавораў, ад чужога вока, ад сямі бедаў. Пад парогам клалі «закляцце». На парозе стаяць нельга, інакш застаіш дабрабыт, які ідзе ў хату. Праз парог нічога не перадаюць — гэта рыса, якая раз'ядноўвае людзей. Над парогам прымацоўвалі серп, каб невядомая сіла нечакана ў хату не ўвайшла. Злую сілу — камучніцу — ад парога адгаворвалі: «Каціся катаннем, доля худая, разлучніца, камучніца. Каціся, не цягніся, ля парога не круціся, за ганак не чапляйся, на варотах не вісні».

У поўдзень жанчына, якая хацела кахання і дзіцяці, павінна была ўзысці на прыгорак, упасці на заснежаную зямлю і паскардзіцца на свае беды. Затым надзець на «галаву» прыгорка сонца з марывам — вянок з кветак і траў.

*15 сакавіка* — Арсень, Фядот. На Фядота снегавы занос — доўга травы не будзе.

Благаславі, Божа мілы, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну аклікаці.
Зімою ў вазочку, вясною ў чаўночку,
У цёплым леце ў карэце.

Благаславі, Божа, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну загукаці.
Дай, Божа, на жытачка род,
Людзям на здароўе.

Вясна, вясна, вясна-красна!
Што нам прынясла?
— З каробак жыта вытрасла,
З кошыкаў гарошак,
З драбеяў канапелек.

*З народнай творчасці*

*16 сакавіка* — Зянон, Ізабэла.

*17 сакавіка* — Герасім-грачэўнік гракоў прыгнаў. Кажуць: убачыў грака — вясну сустракай. «Грак на гары — вясна на двары».


ГЕРАСІМ — ГРАЧЭЎНІК

Грак вестку аб вясне нясе. У гракавых крыках сэнс вялікі. Заўважана: калі шумна грачаць і ляцяць да сваіх гнёздаў, то вясна будзе дружная.

Грак-работнік. Таму і той, хто нарадзіўся ў гэты дзень,— клапатлівы гаспадар. Маўклівы будзе, не паддаецца турботам. Прыхільнасць у яго асаблівая да чалавека, які жыве побач. Калі чалавек гэты хоча дазнацца пра сваё будучае, хай ідзе паглядзець, як будуюць свае гнёзды гракі. І на тым, ці ўстаіць выбранае гняздо на ветры, на дажджы, пазнаецца, якой будзе будучыня. Калі моцны вецер гняздо на зямлю скіне, быць і ў годзе тваім бядзе немінучай.

У гэты дзень трэба збіраць галінкі ад грачынага гнязда. Хай яны бязлістыя, сухія і непрыглядныя, але яны ў доме вашым святла прыбавяць, цяпло ў сябе тояць немалое. Яны падымаюць любую галаву, якая ад горычы схілілася. І змахнуць слёзы з твайго твару. Толькі патрэбна ўнесці іх у свой дом, паставіць на віду ў пасудзе недарагой. У дарагой, каштоўнай вазе галінкі сілу сваю губляюць.

Герасім-грачэўнік сустракае птушак на родных прасторах. Трэба выйсці раніцай, сустрэць зернем свой дзень. І птушкі да цябе шчодрымі будуць. Тваё поле не абляцяць, не дадуць парасткам засохнуць, хлебнай ніве неўрадлівай стаць. Пер’е грачынае, на пахаці паднятае, насі пры сабе. Не прыстане да цябе ніякае зло, ніякі ўрок не будзе ўладарыць над табой.

*18 сакавіка* — Конан-агароднік на агарод паклікаў. З’яўленне праталін. Пара рыхтаваць парнікі, насенне агародніх культур, насіць гной на грады. Дзень Давыда, Іраіды.

*19 сакавіка* — Аркадзь. Абходзілі студні кругамі, каб горкімі сцёкамі не поўніліся, каб падземную добрую вадзіцу падпускалі, што ад ўсякіх хвароб прыгодная — і чыстая, і салодкая.

*20 сакавіка* — На Емяльяна са стрэх хоць і капае, а за нос мароз цапае. Рамантавалі страху і печ.

*21 сакавіка* — На Лазара кроны ліп і бяроз наводзяць румянец, красуецца ў нізінах вярба, зелянее ярчэй кара асіны.

Апанас.

Пачатак астранамічнай вясны. Сонца ўступае ў сузор'е Авена. Авен — знак задыяка для тых, хто нарадзіўся ў перыяд ад гэтага дня да 20 красавіка. Ваш сімвал — агонь, планета — Марс, талісман — молат, камень — брыльянт, горны крышталь або бурштын — камень удачы.



22 сакавіка — Саракі. «Сорак мучанікаў — сорак ранішнікаў». Сорак саракоў птушак прылятае. Дзень зраўняўся з ноччу. Сакавіцкая раўнадзенства звонам прыроду ад сну абуджае. Дзень з ноччу сілай мераецца.

Другая сустрэча вясны. Калі ў гэты дзень сонца ў кругах — будзе багаты ўраджай. Зноў пякуць абрадавых «жаўраначкаў», дзеці клічуць з узгоркаў вясну. Гэты дзень — імяніны жаўранка.

Пачынаюцца ранішнія замаразкі, іх сорак будзе, але адзін мякчэй другога. Прылятае з-за мора кулік. Лічаць на шчасце праталіны. Калі да Сарака налічыць, то па вясне гора не знаць. А сорока сваё гняздо будуе — сорак галінак у яго кладзе. На Сарака ўбачыў шпака — вясна ля ганка. Грэчку сеюць праз сорак дзён пасля Сарака.

Калі ад Грамніц да Сарака трымаецца добрае, сухое надвор'е, то летам чакаецца засуха.

23 сакавіка — Дзень Кандрата, Галіны. Можа быць непагода, бо Кандрат ганяе сакавік па сцежках і берагах.

24 сакавіка — На Марка разыгралася зорка ранішняя, зязюлька свой голас падае. Пачала зязюля на голы лес кукаваць — дасыта хлеба цэлы год не есці. Штодзённа, пасля гэтага дня, зязюля кукуе —

надвор'е ўсталюецца цёплае, моцных замаразкаў не будзе.

Як вылецела зязюля
З шчырага бору на поле:
— Во цяпер я тута палятаю,
З крынічкі вадзічкі нап'юся,
Я й тута кукаваць навучуся.

*З народнай творчасці*

*25 сакавіка* — Феафан. Калі на Феафана туман — быць ураджаю на лён, авёс, каноплі. Раскідваюць па ячмені канаплянага і льнянога семя, птушак зазываюць.

*26 сакавіка* — На Цярэнція мядзведзь пацягваецца ў бярлозе. Касагоры ўзмоклі, зямля чакае не дачакаецца, калі снег у нізіны сыдзе. Дзень Нічыпара, Ларысы.

*27 сакавіка* — Дзень Расціслава, Лідзіі. Выводзілі жывёлу на двор, чысцілі. Загаворвалі яе ад усякіх урокаў, ад неспакою.

*28 сакавіка* — На Аляксандра ваўчыца ваўчанят прыводзіць. Сабака завывае. Трэба падушку перавярнуць на другі бок, каб сон добры быў.

*29 сакавіка* — Юльян. Калёсы падрыхтоўвалі да вялікай вады. Ішлі да каваля, абмяркоўвалі, якую справу калі пачынаць.

*30 сакавіка* — Аляксей. У гэты дзень кажуць: «Аляксей, з гор ручаі пралей». На Аляксея і шчупак хвастом лёд разаб'е. «Аляксей сеці садзіць, лодкі смоліць». На Аляксея пакінь сані, збірай у шлях калёсы. «Якія ручаі на Аляксея (вялікія ці малыя), такая і паводка». «На цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова — на верас, а бортнік (пчаляр) — на хвою.»

*31 сакавіка* — «У сакавіка і спераду, і ззаду — зіма». У апошні дзень месяца трэба закрыць вароты на прываротны кол, каб зіма не вярнулася нечакана. Дзень Трафіма.

# КРАСАВІК

*1 красавіка* — Дар'я вясновая. «Дар'я — забрудзі палонку» (на рэчках пад сонцам вытайвае гной, куды ўсю зіму ганялі жывёлу на вадапой).

*2 красавіка* — На Святлану зацвітае шэрая вольха. З раніцы выносілі з хат на вуліцу ільняныя палотны, развешвалі на платах, варотах ды брамах.

*3 красавіка* — Сані хавалі пад павець.

*4 красавіка* — Васіль-сонечнік, Васіль-капельнік — са стрэх капеж. Прылятаюць кулікі, чайкі. «Прыляцеў кулік з-за мора, прынёс вясну з няволі».

*5 красавіка* — Зяблік, які прыляцеў з першым цяплом, прашчабятаў «піць-піць».

*6 красавіка* — Калі на Сцяпана ноч цёплая, то вясна будзе дружная.

*7 красавіка* — Благавешчанне. Жаночае свята. Забарона жаночай работы. «Птушка гнёзды не ўе, дзяўчына касы не пляце». Зімабор, вясна зіму перамагла. Трэцяя сустрэча вясны. На санях або тыдзень не даедзеш да Благавешчання або тыдзень пераедзеш.

Дастаюць вуллі з імшаніка. Калі ранні вылет пчол — будзе мёд, але і... дрэнны ўраджай.

Калі на Благавешчанне снег на стрэхах, ляжаць яму да Юр'я (16 мая). На Благавешчанне навальніца — да цёплага лета. А калі неба бясхмарнае — быць лету навальнічнаму. Калі Благавешчанне мокрае — лета будзе грыбное. Калі ноч 7 красавіка цёплая, то і вясна будзе дружная. Прылятаюць буслы. Быў такі звычай — выпускаць на Благавешчанне птушак з клетак на волю.

*8 красавіка* — Гаўрыіл — зачарпні бот, прамачы падноскі. Адтайвае глеба. На Гаўрыіла выварочвай аглоблі з саней — больш не спатрэбяцца.

*9 красавіка* — Матрона-настаўніца. Шчупак хвастом лёд разбівае. Каля парога брод, на вуліцы — пераправа. Прылятаюць пліскі, кнігаўкі, жураўлі.

*10 красавіка* — Матрона-паўрэпніца. Гаспадыні адбіралі для пасеву насенне рэпы. Матрона-шарпа-

ковіца: у гэтыя дні замярзае ад ранішніх марозаў адталы днём снег, так што можна хадзіць па шарпаку.

*11 красавіка* — Дзень Піліпа.

*12 красавіка* — Іаанка. Пяклі «маленькія лесвіцы» — абрадавае пячэнне, каб нябесныя бездані да зямлі былі добрыя, каб зялёныя расточкі ўверх падымаліся.

Сярэдні тэрмін пачатку цягі вальдшнэпаў.

*13 красавіка* — Дзень Веніяміна. Радуюцца жаўранкі. Жаўрук зазвінеў — бяры плуг у рукі. Вогнішча. Вагнішчанка — тая, якая народжана ў гэты дзень, разводзіла ў полі агонь, праз які праносілі хворых, а таксама плугі і бароны.

*14 красавіка* — Мар'я-запалі снягі, загуляй яры. Мар'я — паводку пачынае. Пара вясновых паводак.

Вялікая паводка — да ўраджаю! Калі вада ідзе і ночы ясныя — да пагоды ў час жніва.

Мар'я — пустая капуста (да гэтага часу, звычайна, канчаўся яе запас).

На Мар'ю дамавік прачынаецца — яго пачухаць трэба.

*15 красавіка* — Ціт-ледалом. Пачынаецца ледаход. Варона каркала: Палікарпаў дзень накаркала. Адмыкалі такі і свірны, смецце вымяталі. Правяралі зерне, што для сяўбы пакінута было.

*16 красавіка* — Мікіта-вадапол, па нізінных месцах разліваецца веснавая вада. Вадзянік прачынаецца ад зімовага сну.

Сяляне неслі даніну вадзяніку, каб дзяцей не чапаў і рыбу ў прочкі не гнаў. Калі на Мікіту лёд не прайшоў, веснавы клёў рыбы будзе дрэнным.

*17 красавіка* — Дзень Восіпа.

*18 красавіка* — Фядул-ветранік — цяпла надзьмуў. «Фядул — цепляком падзьмуў». А калі надвор'е было дрэннае, казалі: «Фядул — губы надзьмуў».

На Фядула раскрывалі вокны, закліналі бераг-

чы хату ад невядомай сілы, пускаць добрыя вятры, а нуду, перапалохі ўсякія — прэч гнаць.

*19 красавіка* — Мяфодзій лічыць, хто ў гэты дзень нарадзіўся, той зямлі згадзіўся.

*20 красавіка* — Дзень Агнешкі. Моцны мароз і сонца — да добрага хлеба і ўраджаю грэчкі. Людзі верылі, што ў гэты дзень русалкі па беразе ходзяць, вочы размыкаюць. Просяць у людзей адзенне — закрыць голае цела.



Сонца ўступае ў сузор'е Цяльца. Хто нарадзіўся ад гэтага дня да 21 мая — гэта ваш знак задыяка. Сімвал — зямля, планета — Венера, талісман — сава, камень — ізумруд ці больш сціплы хрызапраз.

*21 красавіка* — Радзівон-ледалом. Зашумела рака, хутка панесліся ільдзіны. Хадзілі на раку глядзець, як лёд нясецца. Кідалі ў ваду мінулагоднія травы. На Радзівона даўжыня дня прыбавілася на дзве з паловай гадзіны.

*22 красавіка* — Дзень Вадзіма. Крыніцы абыходзілі. Шанавалі зімнюю вадзіцу.

*23 красавіка* — Руфа. Кажуць: Руфа дарогу рушыць. Калі ў гэты дзень сонца ў туманным вобадзе — хлебны год будзе.

*24 красавіка* — Васіль Парыйскі зямлю парыць. Вясна зямлі пары паддае. Кажуць: «Васіль, выверні аглоблі» (г. зн. канчаткова хавай сані і рыхтуй калёсы). Мядзведзь выходзіць з бярлогі. Медуніца зацвітае. Народнае павер'е такое: не хадзі ў той лес, дзе мядзведзь і заяц ёсць. Стары касмач косці размінае, а заяц можа дарогу перабегчы. Дрэнна чалавеку тады становіцца.

*25 красавіка* — Дзень Яраслава. Вылятаюць чмялі.

*26 красавіка* — Дзень Артамона. Чмялі зашумелі.

*27 красавіка* — Дзень Антонія. Лісагон і свята варон.

*28 красавіка* — Дзень Пуда — даставай пчол з-пад спуда.

*29 красавіка* — Арына — уварві берагі (толькі схлынула паводка, берагі рэк размыты). У млынароў свае турботы: ці не разнесла запруду? Платы ладзілі, спускалі да ракі. Калі маленькія яры «зайграюць» і зноў замерзнуць, чакай перашкоды на ўраджай.

*30 красавіка* — Засіма-пчаляр. Расстаўляюць вуллі на пасеках. Пчала ўжо лётае туды, дзе фіялка красуе. Пелі ёй, каб злётала за мора і прынесла ключыкі залатыя ад лета, замаўлялі: «Як маці сырая зямля не йграе і не шуміць ні з гарамі, не з даламі, ні з лугамі, так пасекі пчол — з усёй сваёй сілай ні ў лясы, ні ў дубровы, ні ў чыстае поле, ні ў іншыя пасекі да мяне, пастара, не збягаюць і не ўцякаюць з гэтага часу і да веку і да сканчэння жыцця майго».

## МАЙ

«Вясна-красна,
адкуль прыйшла,
адкуль прыйшла,
што прынясла?»
— Прынясла я
цёплае лецейка:
малым дзеткам —
па яечку,
старым бабкам —
па кіёчку,
красным дзеўкам —
па вяночку,
маладзіцам —
па сярпочку.


Засіма
Пчаль-
нік

Старыя бабкі —
чапцы шыці,
красны дзеўкі —
вянкі віці,
маладзіцы —
жыта жаці,
Красны дзеўкі —
на вулічку,
маладзіцы —
за люлечку,
красны дзеўкі —
гулі, гулі,
маладзіцы — люлі, люлі.

*З народнай творчасці*

*1 мая* — Пачатак красавання вярбы ўказвае на пачатак сяўбы радыскі, морквы і кропу. Сеялі моркву і буракі на Кузьму. З паяўленнем першых расткоў раскладалі агонь, каб азімыя крапчэйшымі былі.

*2 мая* — Трыфан Канстанцінопальскі.

*3 мая* — Мёртвыя гаруюць па зямлі. Могілкі ўбіралі.

*4 мая* — Кандрат-глінавяз. Ганчары гліну мацалі: «Добрая ці не?» Посуд «тварылі», хлебнае зерне ў гліну замешвалі, каб вада ў такім посудзе не застойвалася, каб смачная ежа не закісала.

*5 мая* — Кажуць, што ў гэты дзень ведзьмы рассцілаюць белае палатно на росную траву і водзяць карагоды. Калі дзяўчына хацела прываражыць хлопца, то павінна была непрыкметна стаць у круг з ведзьмамі, адарваць ад белага палатна стужку і даць каханаму твар выцерці.

*6 мая* — Юрый (Георгій, Ягорый) вясенні свінапас. Апякун жывёлы, палявых работ. «Юрый з-пад спуду зялёну траву выганяе». «Калі прыйдзе Юрый, не ўбачыш у жыце, дзе куры». «Цёплы Юрый — лета пачынае, а Ілья (2 жніўня) яго канчае. «Юр'я з кармамі, а Мікола (22 мая) з камарамі». «Юрый з вадой, а Мікола з травой». «Юрый з летам, а Мікола з кормам». «На Юр'я мароз — будзе грэчка добрая».

«Юрый (вясенні) пачынае палявыя работы, а Юрый (асенні) іх заканчвае». «На Юр'я дождж — да ўраджаю жыта».

Прылятаюць ластаўкі «заворваюць» раллю, ніву.

Дзень выгану жывёлы ў поле. Пры гэтым гаспадары акрапляюць яе свянцонай юр'еўскай вадой, каб яна была здарова ўсё лета. А таксама хвасталі жывёлу свянцонай (у Вербную нядзелю) вярбой, як бы аддавалі яе пад стражу і апякунства святому Юрыю. Сяляне верылі, што Юрый сам, нябачны для людзей, выязджае ў поле на сваім белым кані і пасе жывёлу, аберагаючы яе ад звяроў, над якімі ўладу мае. Замаўлялі: «Госпаду Богу намалюся і святому Ягор'ю (Юрыю — А. Р.) пакланюся, запасаю скаціну рознай шэрсці і ўсякай масці і ссылаю сабак у імхі, у балота, у голыя лозы, на ўсе чатыры бакі, і замыкаю зубы і губы залатымі замкамі, сярэбранымі ключамі, у начны час абгараджуся ў цёмным лесе зоркамі, у чыстым полі месяцам...»
Пастухі давалі абяцанне — жывёлу пасці добра, берагчы ад усякага звера і клапаціцца аб статку. «Пад Юр'я вясенняга не працуюць, каб воўк авечак не паеў».

Юр'ева раса гаючай лічылася. «Будзь здароў, як Юр'ева раса». Дзяцей выводзілі босымі з двара на Юр'еву расу і заклiналі ад сямі хвароб.

*7 мая* — Замаўлялі зямлю і ваду: «Вадзіца, красная красавіца! Хто такой вадзіцай памыецца, збавіцца ад 12 напасцяў...» Клопат і мароку адводзілі ад родных: «Загавару я ўроцы і прароцы, стрэчныя і папярэчныя, зайздрослівыя і радасныя, жаночыя, і дзявочыя, і хлапцоўскія, зняверанае вока і ўсякае вока, і ўсякага часу, і ўсякай гадзіны. Ідзіце вы, уроцы, на імхі, на балоты, на гнілыя калоды: там вам гулянне, красаванне, дашчаныя вароты, пуховыя пярыны — а рабу Грышку на добрае здароўе. Ты, вадзіца-царыца, абмывала крутыя беражкі і жоўтыя пяскі, шэрае карэнне,— абмый раба Грышку. Табе на сінім моры слава, ва імя айца і сына і святога духа. Амін».

*8 мая* — Сямён-ранапашац. Прылёт пявучых птушак цэлымі чародамі. Ключнік. Абыходзілі летнія святліцы з крапівой — выганялі нячыстую сілу. Мылі падлогу.

Першыя навальніцы. Кукуе зязюля. «Зязюля вымавіць «ку-ку», тады і сей на ўсю руку».

*9 мая* — Дзень Сцяпана. Капалі грады ля хаты, замаўлялі, каб ранняя гародніна сілу набірала.

*10 мая* — Дзень Сямёна, Антаніны. Адходжвалі са двара духаў, што з зямлі выйшлі, звярынае і птушынае аблічча прынялі.

*11 мая* — У дзень Віталія адпойваюць хворых першымі травамі — крапівой, падарожнікам, маці-і-мачыхай.

Памінаюць Кірылу Тураўскага.

*12 мая* — Ад дзевяці напасцяў у гэты дзень трэба замовы сказаць. Каб кроў гэтыя напасці не сушылі, па жылах не хадзілі, пухліны не рабілі, касцей не ламалі, суставаў не варочалі.

*13 мая* — Якаў. Цёплы вечар і зорная ноч — да сухога і ветранага лета і ўраджаю. Ясны ўсход сонца — да ветранага лета. У гэты дзень у дарогу не адпраўляліся, не спаласнуўшыся замоўленай вадой.

*14 мая* — Ерамей-запрагальнік. «На Ерамея і лянівая саха ў поле выязджае». Трэцяя і апошняя сустрэча пралецця. Па ранішняй расе ішлі на сяўбу. Казалі: «На Ерамея неба пагожа — жніво будзе прыгожым».

*15 мая* — Вада на спад пайшла. Барыс-Глеб — сейбіты. «Барыс-Глеб сеюць хлеб».

Салаўіны дзень: запеў салавей грунтоўна — вясна пайшла на спад, а лета — на выраст. Салавей пяе, калі з бярозавага ліста расы пап'е. Збярэцца пець у гэтыя дні птушыны цар — вясна дружна закрасуе.

*16 мая* — Маўра бацвінная. Гаспадыня бацвінне ў поле нясе. Няма часу сейбіту адысціся ад зямлі, вось і еў ён веснавое бацвінне ў полі. Казалі ў народзе: «Маўра-малочніца, каровы з поля прыходзяць пад'еўшы.


Барыс і Глеб
сеюць
хлеб

Цвіценне чаромхі пахаладанне прыносіць. Маўра холад прыносіць. Калі ў чаромхі шмат кветак, лета мокрым будзе.

*17 мая* — Пелагея. Ахоўніца варон. Часам выганялася людзьмі, як крумкач, і тое, што скажа, тое будзе: «Прыйшла, накаркала!» — так услед ёй кажуць.

*18 мая* — Арына (Ірына) — расадніца. Высаджваюць расаду капусты, прыгаворваючы: «Не будзь галянастая, будзь пузастая; не будзь пустая, будзь тугая; не будзь красная, будзь смачная; не будзь старая, будзь маладая; не будзь малая, будзь вялікая».

Цвіце каліна, з'яўляюцца авадні.

*19 мая* — Росеннік. Вялікая цёплая раса, ясны дзень — да добрага ўраджаю агуркоў. З расянкі-травы, як з чарачкі зялёнай, пілі вільгаць.

Іоў-гарошнік. Сеюць боб, гарох і пяюць: «Сею-сею белгарох: уродзіцца мой гарох і буйны, і белы, старым на пацехі, маладым хлопцам на вяселле». Ці так: «Уродзіцца мой гарох і буйны, і белы, і сам трыдзесяць».

У гэты дзень росеннік наказвае босымі нагамі па зямлі хадзіць, сухастою ў нагах не накопліваць.

*20 мая* — Ніл-конюх. Праганялі коней па рачной вадзе, аблівалі іх у поўдзень вадой, што ў вёдрах з раніцы прыгравалася.

*21 мая* — Іван-пшанічнік. Сеялі пшаніцу, садзілі моркву, агуркі, цыбулю. Само надвор'е падказвала тэрмін сяўбы.



Сонца ўступае ў сузор'е Блізнят. Хто нарадзіўся ад гэтага дня на 22 чэрвеня, мае знак задыяка Блізняты. Сімвал — паветра, планета Меркурый, талісман — вуж, камень — агат, а таксама малахіт, александрыт; усе яны адметныя дзівоснымі адценнямі.

*22 мая* — Міколаў дзень (Мікола вясенні). «Да Міколы няма дабра ніколі». Казалі, што Мікола адкорміць. На Міколу вясенні дожджык лішнім не будзе. Вялікая міласць, калі дождж пойдзе. Хваліся травою, цяплом, дажджом. Быць бы непагодзе, ды дождж перашкодзіў. Дзе навальніца, там і добрае надвор'е. Вясенні дождж лішнім не бывае — дождж у маі хлеб падымае. Казалі: «Святы Мікола па межах ходзіць, жыта раўнуе... дзе вымакла — там падсушыць, дзе высахла — там падмочыць». Як у маі дождж, так і будзе рож (жыта). Ад Міколы да лета засталося дванаццаць ранішнікаў (замаразкаў). Пачатак сапраўднага працоўнага сялянскага лета. Красуе бэз, вішня, яблыня.

Вясновы Мікола лічыўся святам конюхаў.

*23 мая* — Сымон-Зілота. Выкопваюць карэнне на лякарства. Жанчыны-сялянкі выплаквалі зямлі ўсе свае турботы. Шукалі золата. Сеялі пшаніцу, каб была, як золата.

*24 мая* — Макей мокры. Калі на Макея туман, то гэта да мокрага лета. Мокра на Макея — чакай лета мокрага. Суха — і лета будзе сухім. Калі днём дождж — навальнічнае, мокрае, з пажарамі лета будзе.

Глядзелі таксама сонечны ўсход. Барвовае сонца паказвалася — значыць, трэба было чакаць лета з навальніцамі.

Дзень абнаўлення Царгорада.

*25 мая* — Епіфан. Калі раніца ў чырвоным сарафане — лета сухое, пажарнае. Загаворвалі хату ад маланкі, дамачадцаў — ад навальніцы. Народжаная ў гэты дзень — галасістай была, любіла модна адзявацца.

*26 мая* — Лукер'я-камарніца: з'яўляюцца камары, спакою не даюць. Вечарам з двара гоняць, клуб-

ком у сені ўлятаюць. Пачатак збору лекавых траў. Ужо калі сіверка (паўночны вецер), то і ўсё лета такое (халоднае).

*27 мая* — Сідар-агурэчнік. Сідары з вятрамі паўночнымі — сіверамі — расстаюцца. «Да Сідараў замаразкі б'юць». Адыдуць усе халады. Але калі ў гэты дзень дзьмуць паўночныя вятры — чакай лета халоднага.

Прылёт стрыжоў і касатак: яны цяпло прыносяць.

Дуб перад ясенем ліст выпусціў — да сухога лета. Калі ў гэты дзень дзьме сіверка, чакай лета халоднага. Можна садзіць агуркі.

*28 мая* — Пахом-бакагрэй. Прыйшоў Пахом — запахла цяплом. «Сонца мацней зямлю грэе, рост дае пасеву. Як цёпла, дык і на ўсё лета так».

Абавязкова стараліся ў гэты дзень агуркі пасадзіць.

*29 мая* — Фёдар-жытнік суровы. У яго асноўны клопат — ячменнае поле забаранаваць.

*30 мая* — Ефрасіння лічыла, што гарачыня закліціла нябесныя вароты, ім патрэбна было адкрыцца, даць зямлі дажджу. А калі непагадзь стаяла, то яна прасіла сонца сысці на зямлю.

*31 мая* — Прынялася зямля за свой род. Май лес ва ўбранне прыбіре, лета ў госці чакае. Прыйдзе Фядот — апошні ліст дубовы разгорне.

Фядот-аўсянік. «Калі на дубе верхавіна з «опушкою» — будзеш мераць авёс кадушкаю».

Сем дзевак сеюць лён. У блакітнае дзяўчаты і жанчыны апранаюцца, каб зямлі ў чыстым паказацца.

## ЧЭРВЕНЬ

*1 чэрвеня* — Памяць Дзмітрыя Данскога.

З гэтага дня летам канчаткова ўсталёўвалася цяпло: першыя два дні лье дождж — увесь месяц па ўзыходзячаму сонцу хадзілі да хлебнай нівы.

Кацілі кругом поля кола, сплеценае з лазы. Пелі аберагальную песню: «Ты каціся, жыта густое, да нівы! Ты кацісся, каласістае, да нівы!»

*2 чэрвеня* — Фалалей-агурэчнік. Можна высаджваць агуркі.

Да ўраджаю агуркоў — многа шышак на елках.

Прыйшоў Фалалей — дасявай агуркі хутчэй. Яшчэ ў сакавіку прымячалі: «Вялікія ледзяшы звісаюць са стрэх — чакай агурэчнага года». Цяпло з-пад зямлі ў гэты дзень ідзе — дасяваць агуркі сялянам падказвае. Ёсць і такая чыста народная парада: «Калі на агурках шмат пустацвету, гаспадыня імкнецца знайсці дзе-небудзь стары лапаць і, знайшоўшы яго, прыцягвае нагой у свой агарод і кідае яго ў агуркі (толькі не моцна), прымаўляючы: «Як густа гэты лапаць плёўся, каб так і агуркі мае пляліся.»

Троіцкая бацькоўская субота.

*3 чэрвеня* — Алена-льносейка. «Пасееш лён на Алену — будзе добры лён». «Сей лён на Алену, будзе кашуля да калена». Дзяўчаты ў гэты дзень валасы не запляталі. Было павер'е, што валасы доўгімі стануць, светлымі, як лён.

Калі ў гэты дзень непагода, то і восень непагожай будзе. Калі ў гэты дзень дождж з градам, то 3 снежня будзе снег з крупкамі.

*4 чэрвеня* — Дзень-сініцель, васільковы павяліцель. У гэты дзень не сеюць і не аруць — пераждываюць гэтую дату, каб поле не засмецілася, каб васількі не ўрадзіліся. Па народнаму павер'ю, у гэты дзень на свет з'яўляецца змяіны цар Васіліск. У вёсцы секлі чорнага, сямігадовага пеўня, каб не засыхала ўсё побач, а маладое — не згніло. Яшчэ 15 студзеня, як верылі старыя, певень гэты адкладвае ў гной яйцо, з якога потым народзіцца змяіны цар. «Ад Васіліска і салавей блізка».

Дзень Святога Духа.

*5 чэрвеня* — Андрыян-канаплянік. Раней грубыя ткані ткалі з канопляў. Яны добра захоўвалі гародніну, зерне ад замярзанняў і другіх бедаў. Канапля-

ным маслам запраўлялі кашу, у яго мачалі хлеб, запівалі квасам.

Калі ў гэты дзень шмат аваднёў, будзе добры ўраджай агуркоў.

Памяць Ефрасінні Полацкай.

*6 чэрвеня* — Дзень Калініка. Красаванне ружовай шыпшыны. На яе пялёстках варылі мёд, які ўмацоўвае сілы чалавека, чысціць кроў. Стоўчаныя лісткі шыпшыны, калі прыкласці да раны ці нарыву, выцягнуць боль.

«Калі выйдзе рой перад Янам, будзе пчаляр панам».

*7 чэрвеня* — Іванаў дзень. Пачынаецца нарыхтоўка лекавых траў. З Іванава дня звычайна пачынаюцца росы. Жывёлу выганялі, калі раса сойдзе.

Вядзецца пасадка капуснай расады.

*8 чэрвеня* — Макараў дзень. Каб малако не скісала, збаны трэба было патрымаць у вадзе, пад кустамі смародзіны ці шыпшыны.

*9 чэрвеня* — Фядора безразважная, на язык калючая. Разнясе па вёсцы хутка, у якой хаце нелады. Жанчыны каля студні пагаварыць не заставаліся: Фядора за вуглом імкнецца пачуць дрэнныя звесткі. Сварак не пачыналі. «На Фядоры не мятуць з хаты сора». «Пад венікам заўсёды жыве дамавік». Не роўны час, спалохаць можна. Потым шчасця не будзе.

*10 чэрвеня* — У дзень Мікіты-гусятніка паўдзённіцы водзяць карагоды. Белыя ды сівыя хмаркі плаваюць над зямлёй. Валасы доўгія ў паўдзённіц, губы гарачыя, а туга вочы выядае.

Загавенне на Пятроў пост.

*11 чэрвеня* — Фядосся-калосніца. Каласяніцы. Пачынае каласіцца жыта. Жыта цвіце, зерне сокам наліваецца, азімыя калосяцца. Кажуць: «Добрае надвор'е калосіць хлеб».

Зялёная зорка над полем у небе стыне. Клічуць зялёныя цені паўночніцу — паляцець над полем і рэчкай, пабачыць зямлю ў красе.

*12 чэрвеня* — Дзень Ісака. Змеявік. На Ісака


Ерамей-
распра-
гальнік

адбываюцца змяіныя вяселлі. Не хадзі ў травы і лес. Не пытай лёсу. Не трывож змей.

*13 чэрвеня* — Ерамей-распрагальнік. Асноўная сяўба закончылася. «Прыйшоў Ерамей — больш не сей». Вось і збруя знасілася, і конь натрудзіўся. Пара даць каню час сілы нагуляць.

*14 чэрвеня* — Юстын — не гарадзі тын. Калі захочаш ад сябе каго-небудзь адгарадзіць, тады і стаў агароджу. Між сабой і тым чалавекам, між яго следам і сваім патрэбна ўваткнуць вярбовы пруток.

А гуляла сонейка
Ды па ясненькім небе.
А гуляла, гуляла,
У хмарачку хавалася,
Месяца баялася.
«Хавайся, не хавайся,
Я цябе хоць дзе знайду,
Я цябе к сабе вазьму».
А гуляла Ніначка
Ды па новенькім ганку.
А гуляла, гуляла,
Між дзевачак хавалася,
Юстынкі баялася.
«Хавайся, не хавайся,
Я цябе хоць дзе знайду,
Я цябе к сабе вазьму».

*З народнай творчасці*

*15 чэрвеня* — Дзень Нічыпара, у які вадзілі карагоды. Плялі вянкі з бярозкі і палявых кветак.

*16 чэрвеня* — Лука-ветранік. Гадалі па вятрах, які ўраджай будзе. На Луку вецер паўдзённы — ураджай надзейны. Калі на Луку дзьме паўночна-заходні вецер — лета сырым будзе, а калі ўсходні — наносныя хваробы могуць быць.

*17 чэрвеня* — Мітрафанаў дзень. Тым вядом, што выцягвае лён.

Калі ў гэты дзень вецер дзьме з мокрага месца (балота, возера) — чакай непагоды. Вецер — ён усё

скажа, не пытайся, не падганяй. Ён пакуль даляцеў, сем рэк выпіў, сем чорных груганоў абагнаў, быццам сем лісточкаў, дрэвам згубленых.

*18 чэрвеня* — Пачынаюцца самыя кароткія, «вераб'іныя», ночы (да 26 чэрвеня).

Дарафея просяць сон даць, паспець у сне да сонца аб загаданым сказаць. Дарафей гадаў па ветру і па траве, вадзіў да крыніцы лесавіка.

*19 чэрвеня* — Ларыён — поле паліць і лён.

*20 чэрвеня* — Фядот цяпло дае, а Валерыя стараннасці патрабуе. Трэба поле палоць — рукі калоць, а не палоць, дык і хлеба не малоць.

*21 чэрвеня* — Яфрэм-студнік. Свята майстроў, якія капаюць студні. Каб даведацца, дзе ёсць вадзяная жыла, яны ў гэты дзень перакульваюць патэльні. Калі ў гэты дзень студню капаць — будзе вада ў ёй чыстая, светлая і ад усякага нагавору вылечыць. Кажуць, грымучая трава, разрыў-трава кветкі налівае ў гэты дзень.

*22 чэрвеня* — Дзень Кірылы. Самы светлы дзень святлейшага месяца года.

У пачатку касавіцы не трэба вастрыць касу — авечкі ўвесь год бляяць будуць. Зямля аддае сонцу ўсю сваю сілу.



Дзень летняга сонцастаяння. Пачатак астранамічнага лета. Сонца ўступае ў сузор'е Рака. Хто нарадзіўся ад гэтага дня да 23 ліпеня мае такі знак задыяка і сімвал — ваду, планету — Марс, талісман — канюшыну, а камень — вогненны рубін і жаўтаватачырвоны сердалік.

*23 чэрвеня* — Цімафей на зямлі здані распускае. Можаш ў здані распытаць аб сваім жыцці-быцці, аб

тым, што лета абяцае. Але калі загавор забудзеш, з якім ад здані адысці можна, то здань з табою жыццём памяняецца.

Сабор Разанскіх святых.

*24 чэрвеня* — Дзень Варфаламея. Выходзіць сіла нячыстая, дзеліць між сабой удзелы: каму травы ядавітыя жарам-ядам поўніць, каму ў студнях дзіцём плакаць, а каму род чалавечы блытаць.

Сабор Беларускіх святых.

Сабор Наўгародскіх святых.

*25 чэрвеня* — Пётр-Капуснік (Афонскі). Высаджваецца расада на познюю капусту.

Пётр-паварот. З гэтага дня сонца паварот. Сонца на зіму, а лета на гарачыню. «Сонца сцішае свой ход, а месяц на прыбытак ідзе».

Выпадаюць вялікія росы. Калі ў гэты дзень дождж — увесь сенакос можа быць мокрым.

*26 чэрвеня* — Акуліна-грэчніца. Рыхтавалі грэчневую кашу, частавалі ёй. Высявалі грэчку. Дзень — «Уздзяры хвасты». Скаціна бегае (гізуе), задзёршы хвасты, шалее ад аваднёў, мошак, мух, камароў. Акрапляюць вадой жывёлу, зводзяць укусы мошак травянымі настоямі белазёра балотнага.

*27 чэрвеня* — Мяфодзій камандуе крапіву секчы, каб дождж пайшоў. А калі сам дождж у гэты дзень ідзе, то ён абяцае яшчэ сем тыдняў з дажджамі.

*28 чэрвеня* — Дзень Віта. Хто пасее пасля Віта, той бывае без жыта. Моўкнуць летнія птушыныя песні.

*29 чэрвеня* — Дзень Ціхана.

*30 чэрвеня* — Дзень Савелія. Сонца застойваецца, запавольвае ход у зеніце. У Зямлі самы ціхі ход. Да канца чэрвеня рыхтуюць косы.

## ЛІПЕНЬ

*1 ліпеня* — Калі ў дзень Ляонція заплесці ў круг бярозы сукі моцныя, што зіму перанеслі, то праз гэты круг, калі стаць ля рачной нізіны, можна ўба-

чыць каханых, якія прапалі ў невядомасці ці з вайны не вярнуліся.

*2 ліпеня* — Дзень Засімы-пасечніка. Кланяліся пасечнікі разнатраў'ю. Пачынаюць соты заліваць, мёдам запасацца. Ліпа закрасуе, ад усіх другіх кветак пчол адманіць, да сябе прыманіць.

*3 ліпеня* — Мяфодзій-перапёлачнік ходзіць па палях хлебных, а птушка-перапёлачка пяе: «Подзьпалоць!»

Дзень перапёлачнікаў і ...навальніц.

Калі на Мяфодзія дождж пойдзе, можа ісці сорак дзён з перапынкамі.

*4 ліпеня* — Ульян Ульяну кліча ў поле рана.

*5 ліпеня* — Калі Яўсееў дождж памочыць, будзеш з хлебам.

*6 ліпеня* — Агрыпіна-купальніца. З раніцы ўсе хадзілі ў лазню, каб умацаваць сваё здароўе і сілы. Елі мірскія кашы. Упрыгожвалі хаты вянкамі з траў і кветак. Пелі: «Прыехала купалінка на сямідзесяці вазах. Прывезла нам купалінка ўсякага дабра». І бачылася, быццам едзе дзяўчынка-краса Агрыпіна з Іванам Купалам сустрэцца.

Згубіў салавейка голас праз ячны колас — салавей пець перастае, калі ячмень калосіцца.

Лекавыя травы, сабраныя ў гэты дзень, маюць цудадзейную сілу, ад розных хвароб вылечваюць, прываражваюць каханых.

Сабор Уладзімірскіх святых.

*7 ліпеня* — Свята Івана Купалы. Спявалі наступную песню:

Купала на Йвана.
— Дзе Купала начавала,
Купала на Йвана,
Купала на Йвана?
— Начавала ў Івана,
Купала на Йвана,
Купала на Йвана.
— Што Купала ўжывала,
Купала на Йвана,
Купала на Йвана?



Іван
Купала

— Ужывала варэнішча ў алеішчы.
Купала на Йвана,
Купала на Йвана,
Рыбку з перцам, часнок з алейцам
Купала на Йвана.

*З народнай творчасці*

У ноч на Івана Купалу вадзілі каля кастроў карагоды, скакалі праз іх. Дзень ачышчэння агнём і вадой. Здаўна ў народзе ён лічыўся сапраўдным пачаткам лета. Траўнік. «У ноч на Купалу ведзьмы збіраюцца». «Іванаў дзень — дзень чараўнікоў». Шукалі папараць-кветку. Ёсць горная папараць, расце ў лясах, на лугах, ростам у аршын і вышэй сцябло, а на сцябле маленькія лісточкі, а знізу вялікія лісты... а красуе яна напярэдадні Іванавага дня ў поўнач... Той цвет вельмі патрэбен, калі хто хоча багатым і мудрым быць. А браць тую кветку не проста, з патрэбы: у Іванаву ноч ісці да таго месца, дзе расце трава-папараць, і, пахрысціўшыся, казаць: «Талан, Божы суд твой, ды ўваскрэсне Бог».

Выходзілі на касавіцу — вялікі пакос. На Купалу пачынай касьбу, прайдзі хоць першы пракос.

Росная раніца на Купалле — будзе грыбная восень. Вялікая раса — на ўраджай агуркоў. Калі на Купалле неба зоркамі ўсыпана — многа грыбоў у лесе будзе.

Нараджэнне Іаана Прадцечы, Іаана Хрысціцеля.

*8 ліпеня* — Ефрасіння глядзела, як русалкі карагоды зачынаюць, а знахары выціскаюць сок з цірліч-кветкі. Наводзіць ён чары, твары жаночыя маладзіць. Час вялікай сенажаці.

*9 ліпеня* — Давід (Салунскі). Сунічнік. Суніцы дзяўчат і дзяцей у лес вядуць. Ішлі па ягады, пакуль раса не апала.

*10 ліпеня* — Самсон-сенагной. Пачатак дажджлівых дзён. Калі на Самсона дождж, то да «бабінага» лета дождж будзе. «На Самсона дождж — сем тыдняў дождж».

*11 ліпеня* — Сяргей і Герман. Крапіўнае загавен-

не. Варылі зялёную крапіву, сплятаді з яе вяночкі, ручнікі, якія здымаюць боль у паясніцы.

У ліпені ўпала па лістку, прыйдзе жнівень — упадзе па два. Калі зязюля перастала кукаваць — зіма хутка прыйдзе.

*12 ліпеня* — Пятра і Паўла дзень. Свята Сонца. Чырвонае лета. Сонца паступова паварочвае да зімы, а лета — да гарачыні.

«Прыйшоў Пятрок — апаў лісток». «Пётр-Павел час убавіў». «Ілья-прарок два павалок». «Андрэй — авёс да палавіны дарос». «Пётр з каласком, Ілья — з піражком».

Дажджлівы Пятроў дзень — ураджай нядрэнны, два дажджы — добры, а калі тры — багаты ўраджай.

Заціхаў салавей, змаўкала і зязюля. «Салавей і зязюля пяюць да Пятра». Казалі: «Хто ў ноч на 12 ліпеня Пятроў крыж, які цвіце, з коранем вырве, таго гэты корань прывядзе к заклятаму скарбу».

*13 ліпеня* — Сафрон зваў сялян развітвацца з нівай зялёнай. Раса косы точыць. «Да сонца пройдзеш тры пракосы, не находзішся босы».

Сабор 12-ці апосталаў.

*14 ліпеня* — Адзначалі летнія Кузьмінкі. «Кузьма і Дзям'ян ні свет ні зара ўстаюць, жанчын на пакос вядуць». «Кузьма і Дзям'ян прыйшлі — на пакос павялі».

*15 ліпеня* — Фока на восень паглядвае: як на дрэвах праглянулі жоўтыя лісточкі — да ранніх восені і зімы. Дзень Пятровай маці. У гэты дзень не вяліся работы.

Сабор Цвярскіх святых.

*16 ліпеня* — Мокій дажджом зямлю мочыць, а Марк кідаць стог наказвае.

*17 ліпеня* — Андрэй (Рублёў-іканапісец). Дзень наліву. Азімыя ў наліве, а грэчка на ўсходзе. Бацюхна-авёс у зіпуне. «На Андрэя азімыя наліліся, а авёс-бацюхна да палавіны вырас». «Зерне ў каласку не валяецца ў халадку».

*18 ліпеня* — Кірылава (месяцава) свята, яго асаб-

ліва шанавалі старыя людзі. Лічылі: «Месяц гуляе — да добрага ўраджаю». Настаўлялі маладых хлопцаў: «Глядзі, як месяц гуляе — сілу накоплівае».

*19 ліпеня* — Юлія. У гэты дзень раскідвалі траву-макрэц за ваколіцай, абыходзілі вёску па крузе, «замыкалі» тым самым зямлю, якая трымае ўсю садавіну і гародніну.

Сабор Раданежскіх святых.

*20 ліпеня* — Ефрасіння.

*21 ліпеня* — Жнец, жніўнік, зажынкі. Вязалі зажыначны сноп. Паспявалі чарніцы, жыта даспела. Паяўляюцца чорныя грузды. «Калі жніво пароў, то жуюць зімою».

Дай нам, божа, пагодачку
Ды на нашу работачку,
Каб сонейка качалася,
Каб работка канчалася.
Мы работку рабіць будзем,
Мы пагодку хваліць будзем.

*З народнай творчасці*

Дзень Казанскай іконы Боскай Маці.

*22 ліпеня* — Першы раз пелі: «Жніўка, жніўка, аддай маю сілку». Пачынай жаць жыта, як толькі зернетка пераломіцца ў пальцах.

Дзень Панкрата.

*23 ліпеня* — Антоній. На градах прыгінаюць пер'е, каб наліваліся цыбуліны.



Сонца ўступае ў сузор'е Льва. Такі знак задыяка мае той, хто нарадзіўся ад гэтага дня да 23 жніўня. Сімвал Льва — агонь, планета Сонца, талісман —

божая кароўка, камень — чырвона-белы сардонікс, залаціста-жоўты хрызаліт.

*24 ліпеня* — Памяць вялікай княгіні Кіеўскай Русі Вольгі.

*25 ліпеня* — На Прокла — поле ад расы прамокла. Ранішняя раса — божая сляза; ёю лес умываецца, з ночкай развітваецца. Калі няма расы ноччу і няма яе ў нізінных месцах — да непагоды. Выходзяць на паляванне маладыя лісяняты, ваўкі.

*26 ліпеня* — Сцяпан і Савелій снапы вяжуць. У гэты дзень людзі засцерагаліся граду, каб не пабіў канаплі.

*27 ліпеня* — Анісім.

*28 ліпеня* — Уліцін дзень. Па народнаму календару гэты дзень лічыцца сярэдзінай лета.

Памяць вялікага князя кіеўскага Уладзіміра.

*29 ліпеня* — Афінаген. Лета перарастае спёку. Змаўкаюць птушкі. Калі дзень з цяплом ды святлом — паспееш у жніво ўсё сабраць. Сярпу цяпер месца на чырвоным куце.

*30 ліпеня* — Леанід. У гэту ноч зоры з пазорамі — блакітнымі сполахамі зарніц. (Пазоры — гэта водбліскі далёкіх навальніц.) З навальніцамі адыходзіць ліпень.

*31 ліпеня* — Емяльян, Ігнат.

## ЖНІВЕНЬ

*1 жніўня* — Макрына. Макрыдка. «Як не будзе на Макрыну дажджу, то не будзе бульба гнісці». Дзень мокры — і восень мокрая, сухі — восень сухая, калі дождж — уродзіцца жыта. Да полудня лета, пасля полудня — восень. У сухое лета, калі трэскалася зямля, жанчыны выклікалі дождж.

Народжаная ў гэты дзень прыбіралася ў сінюю сукенку. Абувала атласныя туфлікі і садзілася каля акна, красавалася. Дарылі каласкі з поля, яна іх звязвала чырвоным шнурочкам. А зімой настоем з гэтых каласкоў абмывалі хворага чалавека. Верылі,

што такім чынам можна зняць высокую тэмпературу.

*2 жніўня* — Ільін дзень. Свята дажджоў і навальніц. «Прыйшоў Ілья, прынёс гнілля». Наступалі грамавыя дні. Калі на Ілью дажджу няма — быць пажарам. Абрад тварылі — маланку абысці хату малілі — абысці за сем вёрст, за сем балотаў. Ілья дажджлівы — маланка арэхі паб'е. З гэтага дня вада халадзее — жанчынам не спрыяе. Заканчвалі летні сенакос. Да Ільі і пад кустом сушаць, а пасля — і на кусце не сохне. Да Ільіна дня ў сене мёду пуд, а пасля — гною куча. На Ілью лета да полудня, восень пасля полудня.

Пачынаюцца зажынкі. Паводле народных уяўленняў, іх пачыналі ў шчаслівыя дні — панядзелак, аўторак, чацвер і суботу.

*3 жніўня* — Ануфрый і Анісім жалі першы сноп. У засекі прыносяць першае зерне, маці-Радзіму просяць: «Прыйдзі на дапамогу».

*4 жніўня* — Мар'я-Магдалена. На Мар'ю халодныя росы сапсуюць ільняныя палотны. Калі на Мар'ю росна — лён будзе шэры, неўмалотны. «Магдалена — вады па калена».

*5 жніўня* — Пуд і Трафім — бяссоннікі: пара найбольш актыўных летніх работ. Жніво. Наступаў час асенняга зарыва. Калліннікі. «Каліны ягаду раскусіш — зведзен каханнем будзеш. А маліну паспрабуеш — ап'янёны каханнем будзеш». 12 жніўня праўлялі калліннікі-маліннікі. Пяклі пірагі з ягаднай начынкай.

Сабор Смаленскіх святых.

*6 жніўня* — Дзень князёў Барыса і Глеба. «Барыс і Глеб — паспеў хлеб». Ушаноўвалі Перуна як творцу ўраджаю. Паводле народнага павер'я, у гэты дзень хлебаробы не працавалі, каб маланка не спаліла састаўлены ў копы хлеб.

*7 жніўня* — Ганнін дзень. Летняя зімаўказчыца. Якое надвор'е да полудня, такая зіма да снежня, якое надвор'е пасля полудня, такая зіма будзе пасля снежня. Калі ў гэты дзень туман халодны — зіма будзе ранняя і марозная. Калі да гэтага дня мураўі

павялічылі мурашнікі — чакай халоднай зімы. Халоднымі ранішнікамі ў дзень Ганны зіма напамінае пра сябе.

«Меншыя святочкі носяць снапочкі, свежыя Ганны бабкі стаўляюць, святы Барыс бабкі лічыць».

*8 жніўня* — Дзень Ермалая. Асенняе марыва па травах ідзе, гаючую моц травам дае. Раніцай халоднымі росамі абмываюць, пыл з траў зводзяць, а ў поўдзень і ў поўнач — лекаркі абрады твораць. І нараджаецца, і застаецца ў травах магутная тайна.

*9 жніўня* — Панцялей і Мікола качанны. Капуста пачынае ў качаны завівацца. Апошні збор лекавых траў. Хто на Палуяна працуе, таму ў далейшым не пашанцуе.

Разам з Анфісай рвуць травы ў запаведных месцах, думаючы з любоўю аб блізкіх, аб іх здароўі.

*10 жніўня* — Яўстафій і Акакій косы адбіваюць, сярпы востраць, абходзяць палі, глядзяць, ці дайшоў авёс, ці наліўся ячменны колас.

Памятаюць Смаленскую ікону Божай Маці, найменную «Адзігітрыя» (Пуцяводная).

Сабор Тамбоўскіх святых.

*11 жніўня* — Кузьма Старарускі. Калліннік напальвае, цяжкія туманы парыць. Грузнее калоссе. Скача серп па полі. Цяжкая ніва.

Калі ў гэты дзень туман — рыхтуй свіран пад авёс і ячмень. Дзень Серафімы.

*12 жніўня* — Дзень Сілы. Выверaны тэрмін сяўбы азімых. Сяляне выконвалі абрад «засевак». «Хто на сілу жыта пасее, у таго на хлеб надзея».

Першы раз качаліся па іржэўніку, потым узорвалі яго.

*13 жніўня* — Еўдакім. Загаворвалі барану. Загавенне на Успенскі пост (пярэдадзень Спасаўскага посту).

*14 жніўня* — Макавей і Спас-мядовік. Першы Спас. «Спаса сустракай — у мёд нос макай». «На першага Спаса заломвалі соты». «На першага Спаса і жабрак мядку спрабуе». Да гэтага дня пчолы перастаюць насіць узятку. «На першага Спаса ўзорвай


СЦЯПАН-
СЕНАВАЛ

глебу пад азімыя, сей жыта». «У Спаса ўсяго ў запасе — і дажджу, і ветру, і сонца». Калі за тыдзень да Спаса мядовага буслы пачалі да адлёту рыхтавацца — зіма наступіць раней, з маразамі, а вось вясна з цяплом прыйдзе.

Адлёт першых ластавак і стрыжоў. Шпакі і гракі збіраюцца ў чароды. Ластаўка вясну пачынае і восень наклікае. Провады лета, першыя паклоны восені. Ішлі на сіроцкія ўдовіны загоны. Збіралі мак.

Пачатак Успенскага посту.

*15 жніўня* — Сцяпан-сенавал. Сена ўжо ў стагах. Сплячалі апошні вянок з палявых траў і кветак, уносілі ў хату, абвівалі ручніком, і вісеў той вянок усю зіму, называўся ён — сонца з марывам. Засцерагаў вянок усіх, хто плёў яго. Прыкмячалі: «Які Сцяпан — сенавал,— такі верасень».

*16 жніўня* — Антаніна-віхравейка. Пра мужчыну, які нарадзіўся ў гэты дзень, гаварылі так: «Узбаламучаны будзе, неразумны, адчайны». Пра жанчыну казалі: «Не дзеўка — агонь». Але калі ціхім выдаваўся дзень віхравейкі, то і чалавек з віду ціхім здаваўся. Але ўсё роўна віхры ў ім кружыліся.

Бураннае надвор'е ў гэты дзень папярэджвала аб зіме крутой і снежнай.

*17 жніўня* — Аўдоцця-малінуха. Сушаць маліну, вараць варэнне. Выкопваюць часнок.

Калі надвор'е ў гэты дзень добрае — лістапад таксама добрым будзе.

Аўдоцця-агурочніца. Да гэтага дня паспявалі агуркі.

*18 жніўня* — Еўсцігней-жытнік. Заклінаюць жніўку на чатыры бакі. Нона. Маці Рыгора Багаслова. Жанчыны качаюцца па жніўнаму полю, просяць жніўку аддаць сілку «на мяшок, на калаціла, на матавіла, на крывое верацяно».

Які Еўсцігней, такі і снежань.

*19 жніўня* — Спас яблычны, другі Спас. Першыя асяніны. Са Спаса Прэабражэння надвор'е змяняецца. «У гэты дзень і старац яблык з'есць». З прысмакам першага яблычка раней жаданне загадвалі,

прымаўляючы: «Думу моцную задумваю, душу цяжкую заклінаю, па другому Спасу ды збудзецца, у гэтай восені — не мінецца».

«Прайшоў другі Спас, бяры рукавіцы пра запас». «Які другі Спас, такі і студзень».

*20 жніўня* — Марына. На захадзе сонца пелі песню, сваю, простую — так сустракалі залатую восеньскую пару.

У даліне
Тры Кацярыны
Ячмень жнуць.

Сонца нізенька,
Вечар блізенька —
Не дажнуць.

А зраўнуй, Божа,
Ай, гару й даліну
Раўненька.

Прынясі, Божа,
Маю мамачку
Раненька.

Ах, хоць раненька,
Ах, хоць позненька,
Ай, рана.

Я сваю мамачку,
Ай, па галасочку
Пазнаю.

Па галасочку
І па платочку
Пазнаю.

*З народнай творчасці*

*21 жніўня* — Міроны-ветрагоны гоняць лісце восеньскае па дарогах, цяпло замятаюць. Вецер Вятровіч, з сямі братоў Вятровічаў старэйшы брат, са

стогнам імкнецца выкаціць з зямлі гаручы камень. Але не ўдаецца яму справа гэта, і змучаны садзіцца ён на гэты камень са стогнам і задумліва глядзіць на першае золата лісцяў, на зжатыя нівы.

*22 жніўня* — Восеньскі дождж з дапамогай Мацвея перабівае дождж летні.



Сонца ўступае ў сузор'е Дзевы. Такі знак задыяка мае той, хто нарадзіўся ад гэтага дня да 23 верасня.

Сімвал «Дзевы» — зямля, планета — Меркурый, талісман — конік, камень — цёмна-сіні сапфір, сіні лазурыт.

*23 жніўня* — Лаўрэнаў дзень. Калі ў гэты дзень у вадаёмах вада «не хвалюецца» — восень абяцае быць пагодлівай, прыветлівай, а зіма мяккай, адліжнай і мяцельнай.

Дзень Зарэчніка.

*24 жніўня* — На Сюзану з авечак шэрсць стрыглі — на валёнкі, а Баўтрамей клікаў жыта на зіму сеяць.

*25 жніўня* — Разам з Фоціем даводзілі да ладу павеці, клеці, свірны, гарышча.

*26 жніўня* — Ціхан. Свята Прэабражэння Гасподня.

*27 жніўня* — Міхей. Калі ў гэты дзень журавы ў вырай пацягнуліся, то ў сярэдзіне кастрычніка мароз будзе, а калі не — да добрага надвор'я, а буранам праносяцца — быць верасню дажджлівым. Паспяваюць брусніцы.

*28 жніўня* — Успенне. Прачыстая. Асвячалі хлеб, зеляніну. Азначаецца рознымі сельскагаспадарчымі

работамі: «Прачыста снапкі падае». «Свята прачыста — у полі ўрачыста». «Успенне з дажынкамі супадае». Калі ў гэты дзень неба чыстае — збожжавыя, што засталіся, хлебароб паспее сабраць поўнасцю.

Успенскі пост дажынкамі вяршыцца. Дажынкі — свята канца жніва. Непасрэдна на полі для жней рыхтавалася пачостка, пелі дажынкавыя песні.

...А наш вяночак адварам віты,
Не аддам яго за талер біты...
Дажалі жыта аж да дарогі,
У нашага пана добрыя ногі...

Дажалі жыта, выгналі ліса,
У нашага пана чырвонцаў міса...

*З народнай творчасці*

*29 жніўня* — Дзямід. Трэцяя сустрэча восені. Трэці Спас на палотнах. Заломвалі на ніве «бараду» — на спецыяльна пакінутых сцяблінах жыта перавязвалі стужкамі, прыгіналі да зямлі.

Каласкі на полі дзеці збіралі.

На трэцяга Спаса — апошні адлёт у вырай ластавак. Казалі: «Хто калі хоча, а жураведь да трэцяга Спаса адлятае».

*30 жніўня* — Мірон жніво завяршае. Абдорвае зернем птушак, якія прылятаюць да такоў.

*31 жніўня* — Дзень заступнікаў коней. Папасі яму, Гасподзь Бог, коней. Флор і Лаўр не дазваляюць коней у поле адпраўляць. Трэба было ў гэты дзень выводзіць іх на луг, чысціць, заплятаць стужкамі грывы, карміць хлебам з далоні, даць ім добры адпачынак. Была малітва ад падзяжу коней. У гэты дзень пяклі пячэнне ў форме конскага капыта і аддавалі яго пану.

Асядаюць цяжкія туманы, хвошчуць дажджы, дзьмуць вятры халодныя, круцяцца крылы млыноў.

Пачынаюцца ранішнія прымаразкі.

# ВЕРАСЕНЬ

*1 верасня* — Дзень Андрэя-страцілата. «Бацюхна-цяпляк у аўсах набрыняў».

Дзьме цёплы вецер. Вецер-цяпляк садзейнічае даспяванню аўса. У павуціну адзеты — услед лету.

*2 верасня* — Дзень Сцяпана. Буракоўніца — дзяўчатам нявольніца. Прыйшла пара рваць буракі і моркву.

Збіраюцца ў чароды гракі. У пачатку верасня з'яўляюцца зімовыя апенькі.

*3 верасня* — Васа (Васіліса) аб ільнах дбае. У час лён сабраць — валокны не загубіць, а семя і ў снапах даспее.

*4 верасня* — Агафон-гуменнік. Вятры-ветравеі раскідваюць снапы па гумнах. Лясун ноччу ў полі валіць снапы, імкнецца на гумне ўсё перавярнуць, шуміць, злуецца. Рабілі так: абводзілі вакол сябе таямнічы круг, надзявалі на сябе кажух навыварат, садзіліся на вуглах хлявоў, чакалі з'яўлення лесуна, каб напалохаць яго.

Снапы білі цапамі, прыгаворвалі: «Віншуем цябе, бацюхна ток, са святам, жадаем табе добрага стаяння, а нам бы хлеб сушыць і малаціць на здароў'е...»

*5 верасня* — Рыжы Лупа ранішнім марозам аўсы ды ільны лупіць. Луп-брусні́чнік — нагніся, брусніцы паспелі. Авёс і лён у полі дайшлі. Першыя замаразкі (ранішнікі). А не будзе ранішніка, дык на працягу ўсяго месяца не будзе замаразкаў. У дзень памяці святога Лупы нельга сеяць жыта, таму што па ўсяму полю будуць «лупы» — жыта ўзыдзе і вырасце з лысінамі.

Святкуюць Успенне Прасвятой Багародзіцы. Дзень святамучаніка Ірынея Ліонскага, свяціцеля Калініка Канстанцінопальскага.

*6 верасня* — Дзень Арсена. Ці то кветка якая, ці то агонь калышацца па лясных палянах — клічаназаве ў лес. Які Яўціхіеў дзень, такая і восень будзе. Дождж у гэты дзень абяцае сухую восень і добры ўраджай на будучы год.


АГАФОН-
ГУМЕННІК

*7 верасня* — Дзень святога Варфаламея. Казалі: «Прыйдзе Варфаламей — жыта на зіму сей».

Адлятаюць у вырай буслы. Іх зварот праз дзевяць месяцаў пацвярджаў думку, што дзяцей прыносяць менавіта гэтыя птушкі. «Святы Варфаламей паслаў буслоў па дзяцей».

Якое надвор'е на Варфаламея, такой і ўся восень будзе. Лістападнік.

«Цягне Ціт у кошык апошні грыб». Апошнія летнія грыбы. «Грыбы свежыя, як вецер».

«Хто ў гэты дзень народзіцца, таму шчасце ў сталасці выпадзе».

*8 верасня* — Наталля-аўсяніца. Нясе Наталля ў асецi аўсяны блін, а Андрыян — талакно. Апошні аўсяны сноп з песнямі неслі з поля.

Рабіна-імянінніца. Рабіннікі. Збор рабіны і каліны. Як рабіны шмат, дык сырая восень будзе, а як мала яе, сухая восень будзе.

Вялікі ўраджай рабіны — да маразоў.

*9 верасня* — Анфіса кліча птушак ласавацца ягадамі рабіны. Калі ягад на гэты дзень застанецца шмат, зіма будзе літасцівай.

*10 верасня* — Сціртнікі. Ганна і Сава збіралі снапы ў сцірты. Спяшаліся сабраць да наступлення халадоў усё, што было вырашчана ў полі. «Пскавіч Сава сціrты скручвае, на розум настаўляе». Славілі ўраджай, пачыналі вясёлыя кірмашы.

Майсей — абаронца ад п'янства. Жанчыны шукалі ў яго заступніцтва ад мужоў-п'яніц.

*11 верасня* — Дзень усячэння галавы Іаана Прадцечы. «Іван Прадцеча гоніць птушку далеча». Праваслаўнай царквой ён адзначаўся строгім пастом. Былі ў сувязі з гэтым і народныя домыслы. У гэты дзень нельга было есці круглыя плады, каб не дацца Ірадзіадзе, якая забаўлялася галавой Іаана Хрысціцеля, як яблыкам, каб не садзіліся ў бліжэйшы год на целе скулы. Не рэкамендавалася ў гэты дзень варыць чырвоныя буракі, каб у доме на працягу года не пралілася чыя-небудзь кроў. Хлеб ламалі рукамі. Забаранялася выкарыстоўваць нажы, тапары. У гэты

дзень не звальвалі сена ў восець. Наогул не рабілі ніякіх спраў на агародзе.

«Іван посны — восені бацька хросны». «На Івана поснага збірай карэнні рослыя». Іван-палетак. Дзень-палятоўшчык, гоніць птушак у цёплыя краіны. «Птушка халоднай вады паспрабавала, таму і за мора пацягнулася». У гэты дзень заканчваецца лета чырвонае, сустракалі «бабіна» лета. «З Івана поснага мужык восень сустракае, а баба сваё «бабіна» лета пачынае». Казалі: «Іван посны прыйшоў, лета чырвонае павёў».

Пачыналі капаць бульбу.

Гром у гэты дзень — на доўгую і цёплую восень.

Строгі пост.

*12 верасня* — Дзень Яўгенія. Звітнік. Быў звычай звіць ячменныя сцяблінкі з ільнянымі і аўсянымі, замаўляць у гэты дзень ніву на будучы ўраджай.

Перанясенне мошчаў князя Аляксандра Неўскага.

*13 верасня* — Генадзь. Пара жураўліных ключоў. Жураўлінае веча — спаборнічаюць птушкі, чые крылы мацней, каму весці за сабой чараду ў далёкі край. Жураўы на балоце ўгавор трымаюць, якім шляхам-дарогай на цёплыя воды ляцець.

Да гэтага дня журавіны не збіралі, таму што нельга было турбаваць птушак, якія пакланяліся ягадзе-журавінцы.

*14 верасня* — Сямён-летаправодзец. Першыя асяніны, першая сустрэча восені. Сустракалі «бабіна» лета. Сноп-імяніннік. Гэты дзень быў апошнім тэрмінам сяўбы жыта для самага гультаяватага земляроба. «Калі жыта сабрана на Ілью, заканчвай сяўбу азіміны да Фрола, а калі пазней дажынкі святкавалі, трэба было настройвацца на завяршэнне высеву азіміны да Сямёна».

У гэты дзень па даўняму звычаю абворвалі поле ад нячыстай сілы. «На Сямёна ары, а пасля Сямёна на аратага бізуном махай». Быў і такі звычай: у гэты дзень садзілі на каня падлетка, перавозілі з дзяцінства (на чацвёртым годзе).

З гэтага дня пачыналіся бабскія запрадкі, сядзелкі ды гутаркі.

Калі ясна — восень прыўкрасна. «Бабіна» лета цёплае. Калі днём гразка, то восень дажджлівая будзе. «Сямён да варот — на двары сем пагод: сее, вее, дзьме, круціць, муціць, зверху лье, знізу мяце».

*15 верасня* — Дзень Фядота і Руфіны. Не выганялі з двара раненька жывёлу. Па дзядоўскаму павер'ю, не выпускалі ў гэты дзень да полудня ні кароў, ні авечак. Выганіш — бяду наклічаш.

Аўчарнік. Прыбіралі аўчарні, а жывёлу выводзілі на пашу ў поле.

Восеньскія дажджы напаўнялі сляды-капытцы жыватворнай сілай, Хлявы стынуць, заганяй жывёлу, паша з раніцы пустая.

*16 верасня* — Домна прыбірала ў хаце. Стары абутак, парваныя мяхі спальвалі разам з бульбяным бацвіннем, забяспечвалі сабе гэтым дабрабыт і лад ва ўсім на цэлую восень.

*17 верасня* — Юльян зваў шанаваць косы, вілы, граблі. Хадзілі пакланіцца цудадзейнай іконе «Неабпалімая Куліна».

*18 верасня* — Раіса (Іраіда). Дзень Афанасія Брэсцкага. Гналі з вёскі нячыстую сілу (кумоху). Яна спіны жанчынам гне, на рукі хваробу насылае, усе нягоды ад яе.

*19 верасня* — Міхаіл замаразкам зямлю прыхапіў. Граніца першых ранішнікаў (замаразкаў). У гэты дзень збіралі з градак часнок, карняплоды.

Ліст на дрэве ўжо не трымаецца. Калі лісты асіны ўпалі на зямлю знешнім бокам уверх — да сцюдзёнай зімы, а калі адваротным — да цёплай. А калі падаюць і так, і гэтак — зіма ўмеранай будзе.

*20 верасня* — У дзень Лукі журавы адносяць на сваіх крылах цяпло. Цыбулю ў косы заплятаюць. Дзень цыбульнай слязінкі — да яго трэба ўладкаваць цыбулю.

*21 верасня* — Аносаў дзень. Другія асяніны. Другая сустрэча восені. Жанчыны сустракалі восень ля вады: «Багародзіца Прачыстая, збаў мяне ад

мучэння, нядобрыя думы ад душы адвядзі, маё жыццё-быццё іскрай шчасця асвяці». У даўнія гады ў гэты дзень родныя прыходзілі да маладых паглядзець на іх жыццё, справы, павучыць іх жыць.

Калі надвор'е ў гэты дзень добрае, то і восень будзе добрай.

*22 верасня* — Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі — заступніцы ўраджаю.

Святкавалі земляробчае свята — першае пасля жніва. Сімвалам свята была сявенька з жытам ці пшаніцай і ўстаноўленай васковай свечкай (багач). З багачом абыходзілі двары, потым пакідалі ў хаце аднаго з гаспадароў да наступнага жніва. «Прыйшоў багач, кідай рагач, бяры сявеньку, сей памаленьку».

У дзень Харытона шанавалі сонца, малілі даць сілы і адагнаць наступаючую цемру.

Калі пліскі ў сухі дзень збіраюцца ў чароды — наступіць дрэннае, дажджлівае надвор'е.

*23 верасня* — Пётр. Павел. На Белай Русі два Пятры і Паўлы — вялікі ды малы, летні ды восеньскі.

Рабіна становіцца салодкай. Дазвалялася з Пятра-Паўла восеньскага рваць рабіну, якая пасаладзела ад ранішнікаў-замаразкаў.

Рабіннікі завуць назапасіць ягады рабіны, бо яна адганяе ад чалавека ўсіх нячысцікаў. Рабіна падмерзла, прывяла, цукру набрала. «Рабіна з буйнымі гронкамі — зіма з маразамі звонкімі». Збіралі і падвешвалі пад страхой рабіну-ягаду, каб яшчэ больш цукру набірала.



Асенняе раўнадзенства. Пачатак астранамічнай восені. У гэты час Сонца ўступае ў сузор'е Шаляў. Такі знак задыяка мае той, хто нарадзіўся ад гэтага дня да 24 кастрычніка. Сімвал — паветра, планета — Венера, талісман — сэрца, камень — апал, турмалін розных адценняў.

*24 верасня* — Фёдары-замачы хвасты. Восеньская гразь пачынаецца. Бабы прыпол падтыкаюць. На Фёдара лета канчаецца, восень пачынаецца.

*25 верасня* — Аўтаном апошні раз гáдаў на волю выпускае, а потым закрывае іх у норах. У гэты дзень па лясах гуляць — цара гадаў Васіліска гневаць. Дзень з ноччу раўняецца, усякае цяпло канчаецца.

*26 верасня* — Ляонцій дзень прыгінае да зямлі. Наступае непагода.

*27 верасня* — Узвіжанне, Звіжанне (свята Чэснага і Жыватворнага Крыжа Гасподня, на якім быў распяты Хрыстос). Свята «закрывання» зямлі на зіму. Надыходзяць першыя замаразкі. У народзе падмечана: «Звіжанне цяпло зрушвае, а холад насоўвае». «Звіжанне — апошні воз з поля рушыўся, птушкі ў адлёт пайшлі». «На Звіжанне халат з плечаў, а кажух на плечы». «Звіжанне» лета замыкае, ключык шэрая птушачка за мора панесла». «На звіжанне ранішнікі (замаразкі) — селяніну не бяда».

Са Звіжання восень да зімы ўсё хутчэй ідзе. З гэтага дня мядзведзі ў бярлогу залягаюць.

Апроч птушынага было яшчэ адно «зрушэнне» — выпаўзалі ўсе змеі і збіраліся разам, каб адправіцца на зімні сон да вясны. «На Звіжанне гады і вужакі ў норы хаваюцца».

Існуе легенда, што калі на свята гады збіраюцца ў адно месца, то наперадзе іх ідзе заўсёды змяіны цар, у якога на галаве залатая карона ці рожкі, каб задобрыць цара, варта разаслаць перад ім белы абрус з хлебам-соллю і пакланіцца, тады ён у знак падзякі скіне карону. Хто падбярэ яе — стане надзвычай мудрым і праніклівым, будзе ўгадваць чужыя думкі, не баяцца змяінага яду.

Трэція Асяніны. Рэпу рвем ды бульбу выбіраем — усё з поля збіраем. Парушыўся белы свет, але папярэджвае цемру божы крыж. У засекі клалі крыжы драўляныя ці проста дзве галінкі крыж-накрыж.

Туман раніцай уверх пайшоў і воблакамі па небе паплыў — да добрага надвор'я, а калі ён па зямлі сцелецца — чакай дажджу. Пачыналі секчы капусту на засол.

Строгі пост.

*28 верасня* — Мікіта-рэпарэз ці гусепралёт. Прыйшлі Мікітавы гусары, гусей глядзі. Мікіта лічыўся ў народзе рэпарэзам. З яго гаспадыні пачыналі збор рэпы. На Мікіту стрыглі авечак. Сяляне лічылі, што да наступлення вялікіх маразоў яны абрастуць новым «кажухом».

Гусі на хвасце зіму нясуць. Высока ляцяць гусі — да дружнай і бурлівай вясновай паводкі, нізка — да малой вясенняй вады.

Пакланяліся вадзяніку, каб не гневаўся на людзей.

*29 верасня* — Віктар. Узыходзіць поўны месяц. Працягвалі стрыжку воўны на валёнкі. Дзень Міхала. «Калі на Міхала дзьме паўночны вецер, то не чакай паляпшэння надвор'я».

*30 верасня* — Вера, Надзея і Любоў прыносілі канец першавосеньскім дням.

Ласі-рагачы спраўлялі трызну па лету. Усеагульнае жаночае свята, жаночае галашэнне. Трэба было паплакаць з раніцы на сябе, на родных і блізкіх, выгаласіцца, каб аблегчыць душу.

Вера, Надзея, Любоў і маці іх Соф'я шанаваліся ў гэты дзень. Таксама дзявоцкае свята, на вячоркі збіраецца моладзь — сябе паказаць і на другіх паглядзець.

## КАСТРЫЧНІК

*1 кастрычніка* — Арына-плакуння жураўліная. Арына — жураўліны лёт. Дзень жураўлінага лета і лёту. Праводзілі жураўлёў. «Колам дарога»,— кры-

чалі ўслед, каб па вясне дамоў вярнуліся. Калі гусі і жураўлі не спяшаюцца пакінуць родныя мясціны, сцюжа не хутка наступіць, і зіма будзе кароткай.

Калі жураўлі ў гэты дзень паляцяць, то праз два тыдні чакай марозу, а калі іх не бачна, то зіма праз месяц наступіць і не стукне мароз раней пачатку лістапада.

Першае зазім'е. Першы снег не абяцае хуткай зімы — часцей за ўсё ён за сорак дзён да сапраўднай зімы выпадае.

*2 кастрычніка* — Засім. Пачыналася пчаліная дзевяціна. Трэба было з гэтага дня кожную раніцу нашча з'ядаць па лыжцы мёду, каб зберагчы страўнік ад хваробы. Пачыналі вуллі зносіць у імшанік. Глядзелі: калі ляток у вуллі закрыты воскам — рыхтуйся да суровай і халоднай зімы, а калі ён амаль адкрыты — зіма будзе цёплай і лёгкай.

*3 кастрычніка* — Яўстафій. Вятрак, дзьмуць усяк, веюць вятры-лістабоі.

Свята млынароў. З ранішнім ветрам пачыналі круціцца ветракі, працаваць жорны, сыпалася ў мяшкі свежанькая мука.

Налятталі Яўстаф'евы вятры — кожны сваё надвор'е прадказваў: паўночны вецер — сцюжу, сцюжа недалёка: паўднёвы вецер — цеплыню, заходні — макрыню, а ўсходні — добрае надвор'е. Калі дзень туманны і цёплы, плыве белая доўгая павуціна — будзе добрая восень і хутка выпадзе снег.

*4 кастрычніка* — Кандрат і Францішак. «На Францішка шукае зярнят у полі мышка». Выграбалі з печы попел, загаворвалі на ім ад «дрэннага вока» і немачы ды на вясенніх плугі. Мацнеюць халады, З добрым надвор'ем развітваюцца.

Надвор'е гэтага дня пратрымаецца без змены чатыры тыдні.

*5 кастрычніка* — Фака. Іёна. Лістападная. Загаворвалі ліхаманку, зубны боль.

Калі з бярозы лісце не апала, снег ляжа позна. А калі своечасова выпадзе снег, то ў канцы студзеня, пачатку лютага будзе доўгая адліга.

Святкуюць Сабор Тульскіх святых.

*6 кастрычніка* — З дапамогай Іраіды ўцяплялі хату. «Уцяпліць хату да Пакрова — будзе хата зімой талкова».

*7 кастрычніка* — Фёкла-зорніца сэрца сэрцу адкрывае. Дзяўчаты гадалі, дапытвалі дамавіка пра свайго суджанага.

Зоркі ўжо халодныя. З гэтага часу пачынаецца малацьба. З такоў даносіўся перастук цапоў. Абмалот ішоў да позняга вечара. Намалочанае зерне веялі (аддзялялі пустазелле) на ветры. Мялі падлогу перад такавішчам, і самы стары з малацільшчыкаў, узяўшы ў рукі выразаную са свежай асіны шырокую лапату, набіраў ёю зерне і, перахрысціўшыся на ўсход, падкідваў яго на вецер. Пры гэтым прыгаворваў: «Першую лапату — у імя Святога духа». Потым ішлі лапаты «дзеду», «бабе», «унукам», «усім добрым людзям».

Паважалі нашы продкі хлеб.

На Зорніцу гаспадару — хлеба вяршок, а малацільшчыкам — грэцкай кашы гаршчок. З Фёклы-зорніцы дні ўбываюць, ночы цямнеюць і зоркі становяцца барвовымі.

*8 кастрычніка* — Сергій Раданежскі. Сергій-капуснік. Калі секлі капусту, прымаўлялі: «Відэльцы ў вядро, сячы серабро, сячы-мяльчы, у кадушку тапчы». Пяклі пірагі з капусты і праснакі на капусным лісце. Каб у доме дастатак быў, першы прасначок маці-зямліцы аддавалі.

Калі ў гэты дзень добрае надвор'е, то быць яму такім тры тыдні. Калі выпадзе першы снег, то зіма ўстановіцца 21 лістапада, а санны шлях стане на чацвёрты тыдзень. Калі першы снег упаў на мокрую зямлю — застанецца, а калі на сухую — хутка сыдзе.

*9 кастрычніка* — Яфрэм завяршае сяўбу азіміны. З саломы, якую мачылі ў сямі водах, плялі ланцужок — тонкую вяровачку. У народжанага ў гэты дзень, хоць і ёсць свой шлях, ды жыццё рве яго, і трэба пачынаць усё спачатку.

*10 кастрычніка* — Засім і Сава. Пчэльнік, апошні дзень, калі звозяць вуллі ў імшанік. Палі апусцелі.

*11 кастрычніка* — Дзень Харытона — дзень гадання ў. Маладыя тайна прыносілі знахарцы пірог, гладыш мёду, каб яна незнарок вяселле не разладзіла.

*12 кастрычніка* — У Дзень Кір'яна-пустэльніка глядзелі на зоркі, чакалі ад іх добрага святла.

*13 кастрычніка* — Рыгор. Набівалі сеннікі новай саломай. Па старой саломе, па тым месцы, дзе яна сырэла і злежвалася, меркавалі аб захворванні чалавека.

Калі снег не выпадзе, зіма не хутка наступіць. Калі вавёрка чыста выліняла, то зіма добрая будзе.

*14 кастрычніка* — Пакровы. Трэцяя Прачыстая — народнае свята, якое знамянуецца ў календары як глыбокая восень, пасля яго пачынаецца зіма. Зазім'е. «На Пакровы зямля снегам пакрываецца, марозам адзяваецца». Сходзілі з ганка і казалі: «Бацюхна Пакроў, пакрый нашу хату цяплом, а гаспадара дабром!»

Якія Пакровы, такая і зіма. Вось табе і Пакровы: белыя мухі на нос садзяцца. Пакровы зямлю пакрываюць ні лістком, дык сняжком.

«У Пакроў не пражывеш без дроў». «Прыхапі цяпла к Пакровам»,— казалі.

На Пакровы — дзень да полудня — восень, а пасля полудня — зіма-зімачка. Калі на Пакровы дзьме вецер з усходу — зіма халодная будзе.

Дзяцей аблівалі перад Пакровамі вадой праз рэшата на парозе хаты. Верылі, засцеражэ ад зімовай прастуды. На вечарынках хлопцы і дзяўчаты выбіралі адзін аднаго. «Пакровы весела правесці, значыць, сябра знайсці». «Пакровы пакрываюць траву лісцем, зямлю снегам, ваду лёдам, а дзяўчат шлюбным чапцом».

На Пакровы закармлівалі жывёлу дажыначным снапом, пасля чаго яе трымалі ў хляве на дамашнім корме.

Ах, восень, восень, макрота,
Дзецюкам жаніцца ахвота,
Дзевачкам замуж — няволя,
Дзевачкам замуж — няволя;
Заняволіла субота
І дзявочая работа.

З народнай творчасці

*15 кастрычніка* — Ад злых чар і замоў прасілі аберагчы, дзяўчаты — Усцінню, хлопцы — Куп-рыяна.

*16 кастрычніка* — Дзяніс. Дзяніс — ліхога вока сцеражыся. Замаўлялі двор і хату ад восеньскіх ліхаманак, каб не ўляталі Ламіха, Агніха, Трасучыха і іншая нячыстая сіла, што ў балотах ды ў пушчах тоіцца.

*17 кастрычніка* — Ерафей. У гэты дзень лесуны як быццам вар'яцеюць. Ломяць у лесе дрэвы. Забабонныя людзі на Ерафея ў лес не хадзілі — баяліся лесуна. Зіма кажух адзявае. Як казалі, з Ерафея халады мацнеюць.

Сабор Казанскіх святых.

*18 кастрычніка* — у дзень Харыціны сядзелі за кроснамі, лён ткалі. У дзень Хрысціны — першыя халсціны (палатно). Дзяніс-паземскі. Вятры паземныя, бураны. Адстаў ад ночы дзень — зачапіўся валёнкамі за пень.

*19 кастрычніка* — На Фаму заўсёды чакалі зіму.

*20 кастрычніка* — Сяргей зіму пачынае. Калі зямля снегам пакрыецца — праз месяц быць зіме. Зіма стане на ногі 22 лістапада.

*21 кастрычніка* — Трыфан і Пелагея кажух ды рукавіцы дастаюць. Трыфан кажух рамантуе, а Пелагея рукавіцы вяжа.

*22 кастрычніка* — Якаў белыя крупы на зямлю пасылае, дзень скарачае. Якаў-дрэвапіл: нарыхтоўваюць дровы для «рускай печы».

*23 кастрычніка* — Яўлампій і Яўлампія. Яўлампій лучыну шчапае, агонь раздзімае, цемру разганяе. Калі рожкі месяца на поўнач скіраваны — хутка


Якаў-Дрэвапіл

зіма ўсталюецца, а калі на поўдзень — хуткай зімы не чакай, будзе золак ды гразь яшчэ дзён дзесяць.

*24 кастрычніка* — Піліп зерне на млын возіць. А на Змітра баба хітра.



Сонца ўступае ў сузор'е Скарпіёна. Хто нарадзіўся ад гэтага дня да 22 лістапада, мае такі знак задыяка. Сімвал Скарпіёна — вада, планета — Марс, талісман — хрушч, камень — тапаз, тыгравае вока.

*25 кастрычніка* — Андрон. Гадаюць аб надвор'і па зорках. Народжаны ў гэты дзень глядзіць на сваю зорку, ці не скацілася яна, ці не змёў яе Андрон-вартаўнік, які купал нябесны вымятае, ключом высі адкрывае.

Яркія зоркі ў гэты дзень — да марозу, цьмяныя — да адлігі. Моцнае зіхаценне зорак — пераважна з сінімі адценнямі — да снегу. Шмат яркіх зорак — да ўраджаю гароху.

*26 кастрычніка* — Дзень Веніяміна. Лазневы звычай. Парыліся, выганялі з хворых усякія немачы, настойвалі на малацэ гаючыя травы.

Святкуюць Іверскую ікону Божай Маці.

*27 кастрычніка* — Параскева-гразніха (Сербская). Святкавалі дзень цяжарных жанчын, каб роды былі лёгкімі.

Дзяўчаты крычалі з ганка: «Матухна Параскева, пашлі жаніха хутчэй!»

Калі гразь вялікая, а конскі след заліваецца вадой, то неўзабаве выпадзе снег і ўсталюе зімовую дарогу. Хутка маразы мокрую зямлю закуюць.

Пераскева (Праскоўя)-ільняніца.

*28 кастрычніка* — Яфім холадам карані траў і

дрэў з зямлёй змыкае, насякомых пакрывае, сон навявае. Ільняніцы. Выходзілі жанчыны і дзяўчаты на вуліцу, выносілі на паказ вытрапаны лён. Гадалі-меркавалі, у каго лён мягчэйшы ды танчэйшы.

*29 кастрычніка* — На Лангіна зімняе адзенне на ранішні мароз выносілі. Сонечнае святло, хоць і не доўгае, а гаючае, добрае і дарагое.

Лангін-сотнік — лекар вочных захворванняў.

*30 кастрычніка* — Осій. Канец летняга шляху. «На прарока Осію калёсы развітваюцца з воссю». Калёсы з восямі да вясны развітваюцца. Зацягвалі калёсы пад павеці. Осій-гразнік ні колаў, ні палазоў не любіць. Па рыпенню колаў меркавалі пра ўраджай.

Паклоны. Дзень адбівання паклонаў Андрэю Крыцкаму.

*31 кастрычніка* — Дзень Лукі, які вылечвае хваробы. Выказвалі загаворныя словы ад хвароб. З даўніх пор евангеліст Лука лічыцца настаўнікам іконнага жывапісу. «Багоў не сеюць, не аруць — іх людзі рысуюць». «Хто сее да Лукі, той не будзе мець ні хлеба, ні мукі».

## ЛІСТАПАД

*1 лістапада* — Провады восені, сустрэча зімы. Убачыўшы журавоў, якія ляцяць у вырай, казалі: «Колам дарога!»

Сустракалі сароку ля канюшні, каб дамавік-канюшнік свае чары на сароку-балбатуху перанёс, каб не круціў грывы ў кабыл ды жарабцоў, на дыбы іх не ставіў.

*2 лістапада* — Арцем'еў дзень. Зіма на раздарожжы. На абарону народжанага ў гэты дзень устае маці звяроў нашых — ваўчыца. І калі вырасце такі чалавек, то ён будзе блізкім па духу лесу, звярам і птушкам.

*3 лістапада* — Дзмітрыеўская бацькоўская субота. Дрэнныя дарогі.

Асяніны. Рытуальная вячэра ў памяць памершых родзічаў. Асяніны спраўляліся праз 3 тыдні пасля пакроваў у суботу перад Змітравым днём. Калолі парсюка ці рэзалі цялушку або авечку. Гатавалі святочныя абрадавыя стравы: куццю, бліны, клёцкі, яечню, мяса. Падрыхтоўка да гэтага дня ўключала абавязковае ўпарадкаванне і ўборку падвор'я і хаты. Усе мыліся ў лазні. На вячэру заклікалі сваякоў, суседзяў. Гаспадар, запаліўшы свечку, звяртаўся да мёртвых: «Прыходзьце да нас на Асяніны ўсе тыя, што займалі гэтую сялібу». Паводле звычаю, ад кожнай стравы сімвалічна адкладвалі «дзядам».

*4 лістапада* — Казанская. Ікона Божай Маці (у памяць збаўлення Масквы і Расіі ад палякаў у 1612 годзе).

Да Казанскай — не зіма. З Казанскай — не восень. На Казанскую дождж лункі нальe — зіму прывядзе. Першы замаразак. На Казанскую мароз не «страляе», ды стаяць не дазваляе. «З Казанскай у нас — цяпло марозу не ўказ». «Што гэты дзень пакажа, тое і зіма скажа». Як неба заплача, дык і зіма следам з'явіцца. Выязджай на Казанскую на калёсах, але і палазы з сабой прыхапі. У гэты дзень не выбіраліся ў далёкі шлях.

Важная дата сялянскага быцця. «Хто на Казанскую ажэніцца, той шчаслівы будзе». «Добра на восеньскую Казанскую чэсны вянок прымаць». «Казанская — жанчын ахоўніца». У гэты дзень, поголас да нас даносіць, непрыгожыя дзяўчаты раніцай беглі ў лес, шукалі ліст, на якім затрымаўся іней, глядзелі ў яго, як у люстэрка, і верылі, што ўся хвароба з іх твару сыдзе.

*5 лістапада* — На Ігната дождж пойдзе — усе лункі залье. Снежныя крупы ці град у гэты дзень прадказваюць, што 22 лістапада зіма на нозе стане. У гэты дзень «кармілі» зямлю казанскім пірагом, каб добры хлеб у наступным годзе ўрадзіў.

Дзень Іакава, брата Гасподняга па плоці.

*6 лістапада* — На Сысоя і Феафіла лістападаўскія

ночы да снегу цёмныя. Дзяўчаты збіраліся прасці пры лучыне і загадвалі па ёй аб суджаным.

*7 лістапада* — Дажджом залівае, снегам замятае. Плача белы свет, а ты прыцiш сваю радасць, не грымі словамі.

*8 лістапада* — Дзмітрыя Салунскага свята. Памінанне родных. Дзедаўская нядзеля. Пякуць бліны, ходзяць на магілкі.

Першы блін з маслам і мёдам дзялілі паміж сем'ямі, казалі: «Памяні, Госпадзі, чэсных бацькоў». На дамашнюю вячэру рыхтуюць «кішачкі» (барановыя ці свіныя) набіваюць іх мясам, грэчкай, крупамі.

У Дзмітрыя дзяўчаты хітрыя — збіраюцца выйсці замуж, бо пасля гэтага дня ўжо рэдка бываюць вяселлі. Да Дзмітрыевай суботы зіма не пачынаецца. Калі дзень снежны — вясна позняя будзе. «Дзмітрый па снезе — вялікдзень са снегам». «Дзмітрый без снегу — вялікдзень бясснежны будзе». Нават ранняя зіма да гэтага дня ў сілу не ўваходзіць. «Дзімітраў дзень перавозу не чакае». «Зміцер зямлю выцер, на груды пабіў, каб ніхто не хадзіў». Адліга ў гэты дзень абяцае цёплую зіму і вясну. На Змітрыў рэкі замярзаюць. Да Змітра пасуць, а на Змітру пільнуюць.

*9 лістапада* — Памяць Нестара Летапісца. Калі было якое-небудзь моцнае жаданне ці ў хаце хто-небудзь хварэў, прымалі зарок, бралі на сябе абавязкі і старанна іх выконвалі. Звычайна пачыналі ткаць пакрывала, а назаўтра раніцай асвяшчалі яго ў царкве.

*10 лістапада* — Параскева пятніца. Звычайнае пакрывала, прынесенае з царквы, адводзіла недамаганні, давала здароў'е. Ім абціралі хворых. У гэты дзень жанчынам забаранялася прасці, ткаць, выносіць попел, мужчынам — араць.

Дзяўчаты прасілі святую Параскеву аб жаніхах памаліцца, прыгаворвалі: «Матухна Параскева, пашлі жаніха мне хутчэй».

*11 лістапада* — Стрыгальніцы, авечніцы, аўчары — свята аўчароў. Настассі-стрыгальніцы сноп

саломы неслі. «Авечак рабуюць, а пастухі багацеюць». Частавалі пастухоў пірагамі, малаком і мёдам.

*12 лістапада* — Зіновія і Зінаіды дзень. Свята птушкі сінічкі. Сініца — парошы вястуння. Сінічка пішчыць — зіму абазначае, халады наклікае. Прылёт у сады сініц, снегіроў, шчыглоў. У гэты дзень кармілі сініц зернем і салам, пыталіся аб будучым, і птушка гэта чароўная высвіствала слова зразумелае.

Адзначалі гэты дзень выездам на паляванне. Трэба было ўпаляваць хоць аднаго зайца, якога называлі «імянінным», інакш не будзе ўдачы паляўнічаму на ўвесь сезон.

Была такая замова: «Як гэтаму дрэву на карэнні ні стаяць, адросткаў не пускаць, так маім звярам нікога не ўракаць. Лес дрымучы, звер бягучы! Звер прабягаў, але майго следу не бачыў, а я, добры маладзец, на яго напаў, а лесу чэснаму і лясному гаспадару паклон аддаваў і падарункам яго надзяляў...»

*13 лістапада* — Маўрын дзень. З сярэбранай восені да зімы марознай рукой падаць. Пераводзілі курэй у зімовыя закуты, мецілі нямоглых.

Свята рыбакоў і паляўнічых.

Юравая. Казалі, калі на Юравую ваўкі чародамі ходзяць — будзе голад, мор або вайна.

У сады і паркі, бліжэй да чалавечага жылля прылятаюць сініцы, снегіры, шчыглы.

*14 лістапада* — Кузьмінкі — па восені памінкі. Дзяўчаты заклiналі курыных багоў Кузьму і Дзям'яна: «Кузьма і Дзям'ян, ідзіце жыці к нам!» Рэзалі курэй на продаж. Пеўню адсякалі галаву, а ногі на хату закідвалі, каб куры вяліся. Бацюшка асвяшчаў куратнікі.

Кузьма-Дзям'ян закаменіць ваду, наладзіць пераходы. «Не закаваць зіме рэкі без Кузьмы і Дзям'яна». Лістапад ідзе з ледзянымі цвікамі. Калі ў гэты дзень закуе, то праз тыдзень раскуе. «Кузьма-Дзям'ян закуе, а Міхайла раскуе». А то бывае так, што і да вясны краснай не раскаваць. Калі развязе, чакай


КУЗЬМА і ДЗЯМ'ЯН

маразоў да пачатку снежня. «Дзям'янаў шлях — не шлях, а толькі зімы ростань».

На Кузьму лісце на дрэвах трымаецца — год неўраджайным будзе.

Кузьма і Дзям'ян — абаронцы кавалёў. І самі займаліся кавальскай справай.

*15 лістапада* — Анкідзін распальвае ток, а Пігасій сонца гасіць. На Анкідзіна па вёсках на такавішчах былі чутны перастукі цапоў. Абміналі каноплі і лён, працягвалі малаціць жыта.

*16 лістапада* — Дзень Іосіфа. Мялі лён. Ільняное золата росціць дзяўчыну царэўнай, а няўмекам добры лёс не вытчацца. «У гультаяватай ткахі і для сябе няма рубахі!»

*17 лістапада* — Іоанікій. У гэты дзень, паводле падання, не даюць з хаты ні агню, ні вуголля.

*18 лістапада* — Галакціён і Іона. Дзяўчацкія засідкі. «Ледзь за вароты дзявіца — нядобрая пагалоска за спадніцу».

*19 лістапада* — Павел і Варлаам. Пачатак ледаставу. На рацэ лёд, заказаны зіме ад варот паварот. Сустрэліся два сябры: звон-мароз ды белая мяцеліца. Калі ў гэты дзень выпадзе снег, зіма можа быць снежнай, спрыяльнай для пасеву азіміны.

*20 лістапада* — Фядот. Замярзаюць вадаёмы. Калі першы снег лёг на мокрую зямлю тоўстым пластом — будзеш з ураджаем жыта. Першы снег лёг на мокрую зямлю — вясной рана чакай падснежнікаў. Ледзяная сцюжа звязвае кастры дроў, а дрэннага гаспадара па руках і нагах.

Калі дарога бугром, то і хлеб павінен быць добрым.

*21 лістапада* — Міхайлавы адлігі. Гразнік, наступаюць кароткатэрміновыя адлігі. Міхайла масты мосціць. Міхайла прыязджае на белым кані. У Міхайлаў дзень жывёлу ставяць на зімовы корм. З Міхайла зіма куе маразы. Калі на Міхайла іней, чакай вялікіх снягоў, калі туман — будзе адліга. З Міхайла зімы яшчэ няма, зямля не мерзне. Калі на Міхайлу раздарожжа, да зімовага Міколы (19 снежня) кон-

нага шляху не будзе. У што Міхайла, у тое і Мікола. Калі Міхайла ў снезе, то і Вялікдзень у снезе будзе, а не, дык і не.

Улагоджвалі дамавіка, выносілі яму чашу з півам, прасілі не пакідаць людзей.

*22 лістапада* — Матронін і Феакцістаў дзень. З Матроны зіма становіцца на ногі, маразы налятаюць. Зіма-настаўніца, сапраўдная сцюжа пачынаецца. Маразы злуюцца, чакаюць трывалага шарпаку. Воблачнае, снежнае надвор'е прадказвае непагодны май, іней — ураджай аўса, дождж — ураджай пшаніцы. На Матрону іней — да марозу, туман — да адлігі. Калі здарыцца, што ў гэты дзень гусь выйдзе



на лёд, то гэта не значыць, што лёд захаваецца. Гэты дзень пад сузор'ем Стральца. Знак тых, хто нарадзіўся ад гэтага дня да 22 снежня. Сімвал Стральца — агонь, планета — Юпітэр, талісман — падкова, камень — біруза, цыркон.

*23 лістапада* — Віктар і Вікенцій. Пачатак вялікіх маразоў. Лістапад на двары студзіць, у акенца пастуквае.

Мартынаў дзень. «Калі Мартынава гусь на вадзе, то і Каляда на вадзе».

Фёдар-студзіт на двары студзіць, у хаце цёпла, калі гаспадыня добрая. Калі ў гэты дзень здараецца адліга, чакай пасля яе маразоў. Фёдар не Фядора, трасе-марозіць без разбору. Фёдаравы вятры галоднымі ваўкамі выюць. Калі дзень Фёдара Студзіта цёплы, то і зіма будзе цёплая, а калі халодны, то ўся зіма будзе халоднай; калі ж у гэты дзень пройдзе дождж, то адлігі будуць стаяць да Увядзення (4 снежня).

*24 лістапада* — Віктар, Вікенцій, Максім. Фёдар. Хрысціянскі Феадор-студзіт у сувязі з халодным надвор'ем і сугучным прозвішчам у народзе атрымаў характэрнае прозвішча — Студзянец. З Фёдара сцюдзёнага пачынае студзіць і марозіць. «З Фёдара-студзіта — зіма сярдзіта». «Хведаравыя вятры галоднымі ваўкамі скуголяць». Ад Студзіта сцюжа што ні дзень, то мацнее. Даўно падмечана, што калі дзень Фёдара бывае цёплым, то зіма будзе цёплай, калі халодны, то і ўся зіма халодная.

*25 лістапада* — Дзень Іаана Міласцівага. Пахмурны дзень ды іней на дрэвах — да добрага ўраджаю. Перавернута восень на застылую азіміну. На Івана — снягі, зіма доўга з месца не рушыцца. Вароны ў гэты дзень каркаюць — быць адлізе.

*26 лістапада* — Іаан Златауст.

*27 лістапада* — Піліпаўка. Канец запустаў. Воўчы месяц. У глухазім'е ваўкі ў чароды сходзяцца. Ваўку зіма за звычай.

Калі ў гэты дзень іней — чакай ураджаю аўса, калі дождж — пшаніцы. Светлая Піліпаўка без інею прадказвае дрэнны ўраджай. На Піліпа вароны каркаюць — да адлігі.

Загавенне на Калядны (Раждзественскі) пост (Піліпаў пост). З пачаткам каляднага посту пачыналіся вячоркі. Былі яны, праўда, без песень і танцаў: дзяўчаты пралі пражу, а хлопцы займаліся размовамі ды паціху свавольнічалі.

Калі на працягу каляднага посту частыя пахмурныя дні і іней на дрэвах, ёсць спадзевы на добры ўраджай хлеба.

*28 лістапада* — Гур'ян — канец вяселляў. Зіма з каня злазіць, становіцца на ногі, куе сівыя маразы, сцеле на рэках-азёрах ледзяныя масты, сыпле з аднаго рукава снег, а з другога — іней. Маразы «жалезныя» стаяць, бяруць з гэтай пары такую сілу-моц, што ўся нечысць збягае з зямлі ў сваё пекла, дзе хаваецца да самых святак.

Калі снег у гэты дзень ляжыць, то ляжаць яму да веснавой паводкі. Калядны пост. Пачатак.

*29 лістапада* — Мацей. Стаяць і гразь, і снег. Моцныя вятры вядуць за сабой сцюжы-мяцеліцы. «На Мацея зіма пацее, але ў белым кажуху ходзіць». Ушчыльную падступалі сцюжы ды мяцеліцы, лютыя дзянёчкі.

*30 лістапада* — Лазар-зімаўказчык. У снегападах, пад разлівы румяных зорак, лістапад наблізіўся да зімы. Які дзень на Лазара, такая і зіма. Куляліся па беламу снегу ў моцны мароз на добрае жыццё.

## СНЕЖАНЬ

*1 снежня* — Платон і Раман нясуць зіму нам. Па першаму дню зімы пазнавалі яе ўсю. Які дзень здарыцца, такая і зіма-зіміца. І яшчэ. Калі ў гэты дзень добрае надвор'е, чакай ранняй, пагоднай вясны. З раніцы цёпла — быць адлігам у пачатку зімы, холад ды мяцеліца ў поўдзень — такой будзе і сярэдзіна зімы, а калі пад вечар завые, закруціць буран, то зіма ад нас пойдзе без асаблівай ахвоты.

*2 снежня* — Аўдзій мяцеліцы ў шчыліны зямныя, у расколіны ліхія заганяе. Якое надвор'е, такі і сенакос.

*3 снежня* — Прокла і Прокл. Не чакай у гэты дзень ад дарогі карысці. У шлях збярэшся — адна марока, матухна-зіма яшчэ снегам дарогі не прыцерушыла. Сядзі дома ды вупраж рыхтуй.

Якое надвор'е ў гэты дзень, такое і пры жніве будзе. Калі ў гэты дзень снег ішоў, то чэрвень будзе дажджлівы.

*4 снежня* — Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы. Вароты зімы. Прыйшлі браты маразы-марозавічы, мужыка ў рукавіцы адзелі і зіму розуму навучылі. «Увядзенне прыйшло — зіму прывяло». На Увядзенне тоўстае аледзяненне. Калі на Увядзенне мароз, то ўсе надыходзячыя святы будуць марознымі; калі цёпла, то ўсе святы цёплымі будуць. Калі на Увядзенне адліга, кажуць: «Увядзенне ламае лядзенне».

Дзяўчаты перад святам, калі спаць клаліся, загадвалі: «Святое Увядзенне, вядзі мяне туды, дзе жыць давядзецца». Спадзяваліся ўбачыць будучага мужа.

*5 снежня* — Пракопаў дзень. «Пракоп, загарні пiражок у сумёт». «Калі снег упаў, то і санны след стаў». Ішлі ставіць тычкі каля дарог, каб у мяцеліцу з дарогі не збіцца.

Памінаюць Яраполка, князя Уладзіміра Валынскага.

*6 снежня* — Мітрафан. Паміналі Аляксандра Неўскага, які выказаўся: «Хто з мячом да нас прыйдзе, ад мяча і загіне». Яшчэ пры жыцці імя Аляксандра Неўскага праславілася па ўсёй Святой Русі, па ўсіх краінах, да мора Егіпецкага і да гор Арарацкіх, па абодва бакі Варажскага мора і да вялікага Рыма. У 1847 годзе Аляксандр Неўскі быў прылічаны да святых. Ён з'яўляецца заступнікам рускага войска.

Калі 6 снежня ідзе дробны снег і дзьме паўночны вецер, то 6 чэрвеня будзе вецер з поўначы і дождж пройдзе.

*7 снежня* — Кацярына-санніца. Кацярына марозная. Упэўнены поступ зімы. «З Кацярыны зіма дойме не кіем, дык палкаю, не голадам, дык халадам». «Прыйшла Кацярына, прыйдзе й пярына». Пракладаюцца санныя шляхі-дарогі. Адкрыццё возніцы, саннай пары. Праходзілі гулянкі, каталіся з гор на санках. Дзяўчаты працягвалі гадаць: пяклі пірог на адной солі і з'ядалі яго перад сном, каб у сне «суджаны» паднёс халоднай вады напіцца.

*8 снежня* — Клім халодны. Мароз злосны бывае. Падбухторвае мужыка: «Я пацягну, а ты бі ў далоні, танцуй». Кажуць, ваўкі збіраюцца каля хаты таго, хто нарадзіўся ў гэты дзень.

*9 снежня* — Георгій-пераможац. «Два Ягор'я ў гады: адзін галодны, другі халодны». «Восеньскі Юр'еў дзень — дзень тэрмінаў і дагавораў: «Моцныя рады Юр'евым днём».

Халодны, марозны зімні Юр'еў дзень. Юр'ева свята ўстаноўлена вялікім князем Яраславам у XII

стагоддзі, загадана па ўсёй Русі «тварыці свята святога Георгія месяца лістапада 26 дня» (па старому стылю — А.Р.).

З гэтым святам звязана наступная гістарычная падзея: Барыс Гадуноў адмяніў права пераходу сялян, замацаваўшы іх навечна за баярскімі сядзібамі (канчаткова ліквідаваў яго Васіль Шуйскі — А.Р.). Таму і нарадзіўся крылаты выраз: «Вось табе, бабуля, і Юр'еў дзень».

З гэтага дня мядзведзь у бярлозе засынае. Яшчэ кажуць: «Юр'еў дзень — воўчы заступнік». «Што ў ваўка ў зубах, тое Юрый даў». Воўк вые каля жытла — да марозу.

«Юрый адмыкае раты ваўкам»,— з гэтага часу яны нападаюць на скаціну.

«Калі ціха ў студні на дне — быць цёплай зіме, а пачуюцца невядомыя гукі — на халады і мяцеліцы-злюкі». Да Юр'ева дня б'юць дурнога, а пасля Юр'ева і разумнага, калі кармоў не назапасіў. Колькі на Юр'я восеньскага снегу, столькі ў гэта вясновае свята будзе травы. «Юрый мосціць, а Мікола гвоздзіць».

*10 снежня* — Дзень Рамана. Зімняе Знаменне. Па хмарах, па зорках, па вятрах гадаюць аб надвор'і. Паўночны вецер, калі да яго стаць тварам, змяце ўсе нягоды, непрыемнасці.

Памінаецца Знаменне Прасвятой Багародзіцы, што была ў Ноўгарадзе Вялікім.

*11 снежня* — Сцяпан Першазваны. Дзень птушкі сойкі.

*12 снежня* — Парамон — на ранішнюю зорку глядзі. Раніца чырвоная — быць снежню ясным, раніца снежная — быць мяцеліцам. Зямля камянее, рэчка стыне. Калі заснежыць, то мяцеліцы могуць правіць яшчэ сем дзён. Ідзе снег — быць мяцеліцам да Міхайліна дня (19 снежня), а шмат яго — шмат хлеба. Снежныя камякі сталі вялікімі, значыць, чакай адлігі.

*13 снежня* — Дзень Андрэя Першазванага (апостала). Моладзь наладжвала варажбу, дзяўчаты

звычайна варажылі на суджанага. Яны «высявалі» насенне лёну ці канапель ля калодзежа, ля палонкі, у хаце і прыгаворвалі: «Святы Андрэю, канапелькі сею, дай мне знаць, з кім буду век каратаць». Калі кінутае ў агародзе насенне вясной прарастала, гэта абяцала дзяўчыне шчаслівы шлюб. Таксама вылівалі на ваду расплаўлены воск, выкрадвалі што-небудзь з адзення, каб жаданні лепш збываліся; цэлы дзень вытрымлівалі пост, пазбягалі размоў.

Калі на Андрэеў дзень снег пойдзе і заляжа, то ён яшчэ 110 дзён праляжыць. Стыне ноччу вада ў рэчках пад ільдом. Як не хвалюецца, ціхая вада — будзе роўная зіма, а шумная вада — сцюжа ды бураны. Калі ў Андрэеў дзень холадна і ясна — добрая прыкмета, а калі цёпла — дрэнная.

*14 снежня* — Навум настаўляе на розум. У прописах і букварах (азбучніках) XVII стагоддзя можна было прачытаць: «Святы прарок Божы Навум, настаў мяне на розум і накажы сваёю міласцю дабру навучыцеся». Навум розуму навучыць. Граматнікам лічыцца гэты дзень. «Прарок Навум наставіць на вум». Зіма карае за нядбайнасць тых, хто да яе не падрыхтаваўся.

*15 снежня* — Апанас. У гэты дзень зганялі начніц з вокнаў, якія перашкаджалі спаць дзецям: «Пайдзіце вы каля дром дрымучых у далёкую старонку, а маё дзіця пакіньце».

*16 снежня* — Іван-маўчальнік.

*17 снежня* — Варварын дзень. «Варвара ночы ўварвала, а дня прытачала». «Да Варварынага дня зіма дарогу завароціць, масты замосціць». «Зіма масты мосціць, на наступны дзень мароз цвікі вострыць, а яшчэ праз дзень — прыбівае». «Прыйдзе Варвара, маразы заварыць». «Як стукне Варвара, беражы нос і вуха».

Трашчыць Варварка: «Беражы нос ды вуха». Цёплае надвор'е на Варвару прадказвала добры ўраджай лёну.

Гэты дзень быў «жаночым» святам — жанчыны адкладвалі пражу ўбок. Але талакно малоць і лён трапаць дазвалялася.

*18 снежня* — Савелій. «На Саву не пралі, таўклі проса, ячмень на куццю, жыта малолі на каляднікі, пасталы плялі, валокі вілі». Сава саліць, ледзяныя насцілы сцеле. У гэты дзень глядзелі, як ідзе дым з комінаў: слупом — да марозу, сцелецца — да непагоды, прыбівае да зямлі — будзе снег. Калі на Саву быў вельмі моцны вецер, такога ж ветру можна было чакаць усю «квадру» пасля Пятра.

*19 снежня* — Мікола зімні. Мікола-цудатворац. Казалі, што гэты дзень багаты півам і пірагамі, прыгожы першымі сур'ёзнымі маразамі. Колькі дасць дзень снегу, столькі 22 мая будзе травы. Іней на Міколу — будзе год ураджайны. За колькі дзён да Міколы зімняга лёд з'явіцца, за столькі ж дзён да Міколы вясенняга можна было сеяць ячмень. За колькі дзён да Міколы зімняга іней выпадзе на дрэвах, за столькі ж дзён да Міколы вясенняга патрэбна авёс сеяць. «На Міколу няма ні зімы, ні лета». «Пахвалі зіму пасля Міколы». «Хвалі зіму пасля Міколавага дня». Затрымка зімы на Міколу была знакам, што маразы прыйдуць не хутка і ўся зіма будзе недарэчнай. Мікола — апякун падарожнікаў.

*20 снежня* — «Прыйшоў Амбросій — святы адбросіў». Дзяўчаты прымаліся за шыццё на будучыню.

Іаан — поснік Пячэрскі.

*21 снежня* — Анфіса-рукадзельніца. Чырвоная шаўкавінка па срэбнаму полю снуе — дзяўчына шые. Свята Патапа.

*22 снежня* — Ганна цёмная. Дзень сонцавароту. Зіма сілу набірае, сонца на вясну паварочвае. «На «Ганкі» садзіцеся на санкі». Па Ганнінаму дню вызначалі надвор'е, якое будзе роўна праз паўгода — па прымаўцы: «Па зіме і лета». Шукалі падобныя супадзенні: снег — да дажджу, мяцеліца — да ветру з дажджом, мароз — да яснага надвор'я, адліга — да цёплага дажджу і г. д. На «Ганну» звычайна бывае адліга.

Абетны дзень цяжарным жанчынам, яны прасілі: «Распрастай, госпадзі, лёгка».


Мікола
Зімні

Пачатак астранамічнай зімы. Сонца ўступае ў сузор'е Казерога. Гэта знак задыяка тых, хто нарадзіўся ў перыяд ад гэтага дня да 21 студзеня. Сімвал — зямля, планета — Сатурн, талісман — горны кот, камень — гранат, ружовы кварц.



*23 снежня* — Дзень Міная, Вікторыі. Забярог дзіцячага сну ад паўночніцы і хвароб вачэй.

*24 снежня* — Нікан стаіць каля ікон. Па залатой лесвіцы сыходзіла сонца на зямлю.

Памяць Даніiла Стаянніка.

*25 снежня* — Спірыдон-сонцаварот. Сонца на лета, зіма на мароз. Калі сонца праменнае — навагоддзе чакай марозным, ясным, калі хмура і на дрэвах павіснуў іней — яно будзе цёплым і пахмурным. Ночы пачалі змяншацца, сонца пайшло на лета.

Мядзведзь пераварочваецца ў бярлозе на другі бок. «На сонцаварот,— кажуць сяляне,— мядзведзь у бярлозе павернецца на другі бок, а карова на сонцы бок пагрэе». Пасля Спірыдона хоць на вераб'ёвы скачок, але прыбудзе дзянёк. Яшчэ кажуць, «на гусіную лапу».

*26 снежня* — Яўстрат, Яўген. На памяле ведзьмы лётаюць, сонца замесці хочуць. З гэтага дня назіраюць за надвор'ем на працягу 12 сутак, лічачы, што кожны дзень прадкажа надвор'е аднаго з месяцаў наступнага года. 26 снежня — адпавядае студзеню, 27 — лютаму, 28 — сакавіку і г. д. да Каляд (па новаму стылю).

*27 снежня* — Дзень Філімона. Грэй хату, сцюжу гані.

*28 снежня* — Дзень Трыфана. З сонцапавароту мяцеліцы павінны браць разварот. Холадна, каля сонца зарава. Птушка ў палёце замерзнуць можа.

*29 снежня* — Агей-прарок сее іней на парог. Як моцны мароз, дык стаяць яму да Вадохрышча.

*30 снежня* — Даніла снежань падганяе. Калі ў гэты дзень іней на дрэвах, праз тыдзень цяпло наступіць. Дарэчы, снежню можна мець да чатырох адліг.

*31 снежня* — Мадэст — апякун дамашняй жывёлы. Пара наваледцаю. Калолі парася і палілі калоду-карыта, якое выдзёўбвалі ў ствале дрэва. У агонь падкідвалі смецця, што вымяталася з хаты, і гарэў гэты агонь у Новым годзе шэсць дзён.

Святы Мадэст лічыўся апекуном жывёлы. Адзначаўся мужчынскім застоллем.

Ставіцца навагодняя ёлка. Гэты звычай у Расіі прыжыўся пасля візітаў Пятра I у Еўропу. Першапачаткова ўпрыгожанне рабілася з сэнсам: на ёлках красаваліся яблыкі (сімвал грэхападзення і выгнання з раю) і аплаткі (сімвал выратавання). Пасля з'явіліся папяровыя кветкі, ласункі. З 19 стагоддзя на галінах пачалі развешваць пазалочаных анёльчыкаў, арэхі, шкловыдзімальшчыкі (кажуць, што першымі так зрабілі ў Латарынгіі) умела падмянілі натуральныя плады шклянымі цацкамі. Які гэта мела поспех, можна меркаваць па першым часе: мы не ўяўляем навагоднюю ёлку без шкляных упрыгожванняў.

Калядачкі далёка,
Кілбасачкі далёка.
Калядачкі прыблізіліся —
Кілбасачкі панізіліся.

Я дзевачка маленька,
У мяне плаціна рабенька,
Башмачкі карковенькія,
Будзьце са святам здаровенькія.

*З народнай творчасці*

## ЗМЕСТ

### 1. У НАРОДЗЕ КАЖУЦЬ

**Пра зіму** — — — — — — — — — — — — — 4
Пра снежань — — — — — — — — — — — — — 7
Пра студзень — — — — — — — — — — — — — 8
Пра люты — — — — — — — — — — — — — — 9
**Пра вясну** — — — — — — — — — — — — — 14
Пра сакавік — — — — — — — — — — — — — 17
Пра красавік — — — — — — — — — — — — — 18
Пра май — — — — — — — — — — — — — — 21
**Пра лета** — — — — — — — — — — — — — 23
Пра чэрвень — — — — — — — — — — — — — 28
Пра ліпень — — — — — — — — — — — — — 28
Пра жнівень — — — — — — — — — — — — — 29
**Пра восень** — — — — — — — — — — — — — 30
Пра верасень — — — — — — — — — — — — 31
Пра кастрычнік — — — — — — — — — — — — 33
Пра лістапад — — — — — — — — — — — — — 35

### 2. НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ, ЦІ ДАЎНО ПАДМЕЧАНА

Перад надыходам зімы — — — — — — — — 39
Да вясны і лета — — — — — — — — — — — 46
Да добрага надвор'я — — — — — — — — — 48
Да дрэннага надвор'я — — — — — — — — — 51

### 3. ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

Літаратурна-мастацкае выданне

# ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

**Прыкметы надвор'я,
а таксама народны
каляндар-месяцаслоў**

Сабраў і апрацаваў
**РУСЕЦКІ Аркадзь Уладзіміравіч**

Рэдактар *У. І. Карызна*
Мастак *В. Ф. Александровіч*
Мастацкі рэдактар *Ю. Ц. Цярэшчанка*
Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская*

Падпісана да друку з дыяпазітываў 30.11.99 г. Фармат 60х90 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура школьная. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 10,0. Ул.-выд. арк. 7,68. Тыраж 3000 экз. Зак. 575.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага
камітэта Рэспублікі Беларусь па друку.
Ліцэнзія ЛВ № 7, 20.12. 1997 г. 220600, Мінск, Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

**Дзень за днём:** Прыкметы надвор'я, а так-
Д 43 сама нар. каляндар-месяцаслоў: Для дашк. і малод. шк. узросту / Сабр. і апрац. А. Русецкі; Маст. В. Александровіч.— Мн.: Юнацтва, 2000.— 158 с.: каляр.іл.

ISBN 985-05-0323-8.

Гэта кніга народнай мудрасці. У ёй змешчаны прымаўкі пра кожную пару года, прыкметы надвор'я, а таксама народны каляндар-месяцаслоў, ідзе гаворка пра кожны дзень года: якое народнае свята выпадае на гэты дзень і якія абрады трэба выконваць, што прадказвае надвор'е ў гэты дзень і г. д.

**ББК 84 Бел7**

ISBN 985-05-0323-8





ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ